

«Дажынкі-2013»: луста Міншчыны ў агульным каравай.

СТАР. 3-7



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Тэатр — суровы, як жыццё.

СТАР. 11

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ВЕРАСНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 182 (27547) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін учора прынялі ўдзел у завяршальным этапе вучэння «Захад-2013» на Гожскім палігоне, пасля чаго накіраваліся ў Калінінград, дзе на ваенным палігоне Хмялёўка назіралі за манёўрамі з пункта кіраваня на беразе Балтыйскага мора.**



# «ЗАХАД-2013»: ЭКЗАМЕН ЗДАДЗЕНЫ



Прыбыўшы на палігон, кіраўнік беларускай дзяржавы прайшоў на дапаможны пункт кіравання рэгіянальнай групоўкай войскаў, дзе яму было далажана аб выпрацаваным механізме і варыянтах сумесных дзеянняў узброеных сіл Беларусі і Расіі ў інтарэсах стратэгічнага стрымлівання агрэсіі супраць Саюзнай дзяржавы. На дапаможным пункце кіравання 20-й арміі Заходняй ваеннай акругі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі беларускага Прэзідэнта азнаёмілі з агульным парадкам прымянення арміі ў складзе РГВ (С) у перыяд нарастання пагрозы агрэсіі, а таксама з задачамі, якія вырашаюцца расійскай часткай РГВ (С) ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі Узброеных Сіл Беларусі, органамі пагранічнай службы, тэрытарыяльнымі войскамі ў ходзе спецыяльнай аперацыі.

Пасля прыбыцця на палігон Уладзіміра Пуціна прэзідэнты прайшлі на назіральную вышку, дзе сачылі за розыгрышам баявых дзеянняў. На палігоне практычна адпрацоўваецца ўзаемадзеянне мотастралковых і мабільных падраздзяленняў узброеных сіл Беларусі і Расіі, тэрытарыяльных войскаў, унутраных войскаў МУС і МНС Беларусі ў ходзе выканання задач па прыкрыцці дзяржаўнай граніцы, ажыццяўленні пошуку, блакіраванні і знішчэнні выяўленых дыверсійных разведвальных груп і незаконных узброеных фарміраванняў.

На палігоне разыгрывалася некалькі тактычных эпізодаў.

Вучэнне з'яўляецца своеасаблівым палігонам для выпрабавання, праверкі рэальнасці ваенна-тэарэтычных распрацовак у прымяненні розных сіл і сродкаў. У вучэнні задзейнічаны новыя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі беларускай вытворчасці, у тым ліку аўтаматызаваны дыстанцыйна кіруемы наглядальна-агнявы комплекс «АДУНОК», а таксама айчынная аўтаматызаваная сістэма кіравання тактычнага звяна «Салдат — баявая сістэма», якая павышае інфармацыйнае ўзаемадзеянне ваеннаслужачага ў складзе падраздзялення, яго мабільнасць за кошт выкарыстання сучасных матэрыялаў у элементах сістэмы абароны.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін накіраваліся ў Калінінград, дзе на ваенным палігоне Хмялёўка прайшоў завяршальны этап сумеснага стратэгічнага вучэння ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2013». Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін вылецелі на адным самалёце.

Кіраўнікам дзяржаў прадэманстраваны розыгрыш эпізоду сумеснай спецыяльнай аперацыі, праводзімай сіламі Балтыйскага флоту, 1-га камандавання ВПС і ППА Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі і 350-га асобнага мабільнага батальёна 103-й асобнай мабільнай брыгады сіл спецыяльных аперацый Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь Сумеснае стратэгічнае вучэнне «Захад-2013» праходзіла на тэрыторыі Беларусі і Расіі ў перыяд з 20 па 26 верасня. Гэта вучэнне абарончага характару, якое пацвярджае курс Беларусі на ўмацаванне рэгіянальнай бяспекі і прыхільнасць да саюзніцкіх абавязацельстваў Расіі. Вучэнне праходзіла ў два этапы. Прыярытэтнымі напрамкамі пры вызначэнні задумы гэтага вучэння з'яўляліся сучасныя падыходы да прымянення войскаў (сіл) на аснове вопыту ўзброеных канфліктаў апошніх гадоў, мерапрыемстваў аператыўнай падрыхтоўкі, а таксама форм і спосабаў прымянення войскаў, якія выпрацаваны ва ўзброеных сілах дзвюх дзяржаў. Выкарыстаны адзін з магчымых варыянтаў узнікнення крызіснай сітуацыі і нарастання канфлікту, пры гэтым бакі, якія проціборствуюць, умоўна размешчаны ў межах рэальных граніц Беларусі і трох прылеглых абласцей Расійскай Федэрацыі.

Практычныя дзеянні органаў ваеннага кіравання і войскаў ажыццяўляліся на шасці палігонах, размешчаных на тэрыторыі Беларусі, і ў Калінінградскай вобласці Расіі. У аснову розыгрышаў тактычных эпізодаў пакладзены варыянты сумесных дзеянняў беларускіх і расійскіх воінскіх часцей і падраздзяленняў, якія ўваходзяць у склад РГВ (С), пры ахове і абароне ваенных аб'ектаў, ліквідацыі дыверсійна-разведвальных груп праціўніка і незаконных узброеных фарміраванняў, а таксама наступстваў аварый тэхнагеннага характару.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

***Цэнтральная заканатворчая тэма на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў — рэспубліканскі бюджэт на 2014 год. Мяркую, сур'ёзная папярэдняя праца дазволіць нам і ўраду яшчэ да ўнясення праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце ў Палату прадстаўнікоў сфарміраваць адзіны падыход па ўсіх важнейшых пазіцыях і па-дзелавому правесці яго разгляд у Авальнай зале. У ліку нашых прыярытэтных задач таксама — удасканаленне заканадаўства аб выбарах і рэферэндумах і рэгулятарнай базы судавытворчасці, перш за ўсё ў кантэксце рэалізацыі Паслання Прэзідэнта аб перспектывах развіцця сістэмы агульных судоў краіны.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.09.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 9070,00 ▲ |
| Еўра | 12270,00 ▲ |
| Рас. руб. | 282,00 ▼ |
| Укр. грыўня | 1108,36 ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 10° |
| Віцебск | + 9° |
| Гомель | + 8° |
| Гродна | + 11° |
| Магілёў | + 9° |
| Мінск | + 9° |

■ Каментарый

## ШКОДНЫЯ ЎМОВЫ ПРАЦЫ: ВЫБАР СПОСАБУ КАМПЕНСАЦЫІ — ЗА РАБОТНІКАМ

**Пра гэта паведаміла карэспандэнту БЕЛТА міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна, каментуючы ўказ ад 25 верасня 2013 года №441 «Аб некаторых пытаннях прафесійнага пенсійнага страхавання і пенсійнага забеспячэння».**

«Указ накіраваны на прадастаўленне асобным катэгорыям работнікаў, якія маюць працяглы стаж работы ў шкодных умовах працы да 1 студзеня 2009 года, права на назначэнне льготнай пенсіі ў агульнай пенсійнай сістэме ўзамен датэрміновай прафесійнай пенсіі ў сістэме прафесійнага пенсійнага страхавання», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

З 1 студзеня 2009 года ў рэспубліцы ўведзена прафесійнае пенсійнае страхаванне (ППС) асоб, занятых у неспрыяльных для здароўя ўмовах працы. Фарміраванне прафесійных пенсійных правоў і, адпаведна, выплата датэрміновых прафесійных пенсій, ажыццяўляецца за кошт сродкаў работадаўца. Права на такія пенсіі ўзнікае ў работнікаў, якія выпрацавалі не менш як палову неабходнага прафесійнага стажу. Але пры гэтым страчваецца права на льготную пенсію ў агульнай пенсійнай сістэме. Памер датэрміновай прафесійнай пенсіі ўвязаны непасрэдна з сумай узносаў, выплачаных работадаўцам за канкрэтнага работніка за перыяд да даты выхаду на датэрміновую прафесійную пенсію.

СТАР. 2

■ Ліст у рэдакцыю

## ВЫСЕЛІЦЬ, НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ, або Купалы над зараснікам

**Нагодай для маёй паездкі ў чарнобыльскую зону стаў ліст, які накіравала ў рэдакцыю «Звязды» Людміла Іванаўна Зыза, жыхарка вёскі Саматэвічы Касцюковіцкага раёна.**

### «Мы не хочам нікуды з'язджаць!»

Саматэвічы — гэта вядомае месца на карце Магілёўскай вобласці. Калісьці вялікая і квітнеючая вёска на беларуска-расійскім памежжы, з цікавай гісторыяй і старажытным помнікам архітэктуры, малая радзіма Аркадзя Куляшова, стала... прывідам. Да чарнобыльскай катастрофы там было больш за тысячу двароў, а цяпер засталіся толькі 8 хат і 13 жыхароў.

*«Наша сяло і яшчэ два бліжнія належаць да зоны адсялення, — піша Любоў Іванаўна. — Пражылі тут людзі, хто не выселіўся, ужо 27 гадоў, і неўзабаве, без нічога ніякага, сказалі хуценька з'язджаць адсюль. У вас, маўляў, кватэры ёсць, і няма чаго тут сядзець. Людзі ў паніцы — старыя ў асноўным. Уявіце сабе, што такое перасяленне з усімі манаткамі ў 70 з лішкам гадоў. Гэта ж не 30-40, калі яшчэ мора па калена...»*

Людміла Іванаўна расказала ў лісце сваю гісторыю: яна, мясцовая ўраджэнка, з'ехала ў свой час у Данецк, але потым вярнулася да сваякоў. Ужо дзясятак гадоў яна жыве са сваім грамадзянскім мужам Рыгорам Кірылавічам Давыдзенкам у Саматэвічах.

Рыгор Кірылавіч разменяў восьмы дзясятак. Ён ужо з'язджаў з зоны, але вымушаны быў вярнуцца з-за сямейных абставін. Давыдзенка — адзіны з саматэвіцкіх пустэльнікаў (менавіта так іх тут называюць), хто не мае іншага жылля. Цяпер мясцовыя ўлады настойліва прапануюць пенсіянеру і яго спадарожніцы атрымаць кватэру з усімі выгодамі і з'ехаць з зоны.

*«Навошта нам тая кватэра?* — не пагаджаецца ў лісце Людміла Іванаўна. — *Нам тут добра. Мы маем невялікі кавалак зямлі ў некалькі сотак, кветнік, лазню і печку. Мы не хочам нікуды адсюль з'язджаць».*

Жанчына таксама напісала, што яна выказвае агульную пазіцыю ўсіх, хто застаўся жыць у выселеных Саматэвічах.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## ДАЖДЖЫ, А ЎНАЧЫ — І ЗАМАРАЗКІ

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў вільготнага паветра балтыйскага паходжання, таму ў многіх раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Істотна пахаладае. Тэмпература паветра ўдзень 6-11 цяпла. І ў выхадныя ў нашай краіне захаваецца даволі халоднае надвор'е. Прагназуецца, што ў суботу паўсюдна, а ў нядзелю пераважна па ўсходзе Беларусі будуць ісці кароткачасовыя дажджы. Раніцай месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ў ноч на выхадныя плюс 1-6 градусаў, аднак у ноч на суботу — месцамі па краіне, а ў ноч на нядзелю — ужо амаль паўсюдна на глебе і часам у паветры замаразкі да 0 мінус 3 градусаў. Удзень паветра прагрэецца толькі да 6-13 цяпла. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон прыкладна на 3-5 градусаў ніжэй за кліматычную норму трэцяй дэкады верасня. Холадна будзе і ў пачатку наступнага тыдня. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак атмасферны ціск будзе павялічвацца, таму ападкаў амаль не чакаецца, толькі месцамі на ўсходзе краіны яшчэ магчымы невялікія дажджы. Тэмпература паветра ў ноч на панядзелак 1-6 цяпла, а на глебе і месцамі ў паветры замаразкі да 0 мінус 4 градусаў, удзень — 6-13 цяпла. Увогуле ў першай палове наступнага тыдня на тэрыторыі Беларусі ўзмацніцца ўплыў скандынаўскага антыцыклону, калі будзе без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да мінус 4 градусаў і толькі месцамі — 1-4 цяпла, удзень — плюс 5-12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗЯМЛЯ СТАРЭЙ НА 700 МЛН ГАДОЎ

Вынікі апошніх даследаванняў старажытнай пароды глебы, якая захавалася ў Афрыцы, паказалі навукоўцам, што кісларод цыркуляваў у атмасферы Зямлі яшчэ 3 мільярды гадоў таму, а не 2,3 мільярда, як было прынята лічыць. Выкарыстаны геолагамі метад можа быць ужыты для пошуку кіслароду і прыкмет жыцця на іншых планетах, у тым ліку на Марсе, лічаць эксперты.

### ВА УКРАІНЕ БУДЗЕ ЗАСНАВАНЫ ДЗЕНЬ БАЦЬКІ

Урад Украіны падтрымаў ідэю, з якой выступіла Міністэрства сацыяльнай палітыкі, — заснаваць у краіне Дзень бацькі. Свята плануюць адзначаць кожную трэцюю нядзелю верасня. Адпаведны ўказ уступіць у сілу пасля таго, як яго падпіша прэзідэнт Віктар Януковіч. Дзень бацькі шырока святкуецца па ўсім свеце (як правіла, у трэцюю нядзелю чэрвеня). У ЗША ён стаў агульнанацыянальным яшчэ ў 1966 годзе.

### «ГРЫБНЫ ПАДАТАК» ПРАПАНУЮЦЬ УВЕСЦІ Ў НАВАКОЛЛІ РЫГІ



Мэр Гаркалнскага краю Карліс Бружукс прапанаваў увесці для жыхароў Рыгі «грыбны падатак». Прапанова стала адказам на планы Рыгі павялічыць плату за праезд у грамадскім транспарце для нерыжан. Як заявіў Бружукс, рыжане выкарыстоўваюць наваколлі латвійскай сталіцы для адпачынку, купання, спорту, ездзяць у лясы збіраць грыбы, і ўсё гэта ім даступна бясплатна. Таму мясцовым органам самакіравання варта падумаць аб тым, каб увесці для рыжан «грыбны падатак». Падатак дазволіць кампенсаваць жыхарам прысталічча падаражэнне праезду ў Рызе.

### ГРЭЦКІЯ АРЭХІ ПАЛЯПШАЮЦЬ СТАН САСУДАЎ І ВЫВОДЗЯЦЬ ТАКСІНЫ

Наяўнасць арэхаў у штодзённым рацыёне ўмацоўвае крывяносныя сасуды поўных людзей, не правакуючы дадатковага набору вагі. Арэхі не толькі пажыўныя і карысныя для здароўя ў цэлым за кошт вітамінаў і вываду таксінаў, але і сытныя. Калі ўводзіць іх у дыету, з часам шкодныя прадукты будуць выцеснены, упэўнены Дэвід Кац з даследчага цэнтра Грыфінскага шпіталя.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗША МОГУЦЬ АКАЗАЦЦА БАНКРУТАМ УЖО 17 КАСТРЫЧНІКА



ЗША могуць аказацца банкрутам ужо 17 кастрычніка, калі тэрмінова не прымуць закон аб павышэнні верхняй мяжы дзяржаўнага доўгу. Пра гэта напісаў міністр фінансаў ЗША Джейкаб Лью ў лісце старшыні Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША Джону Бейнеру, паведамляюць інфармагенцтвы. Джейкаб Лью ўпершыню агучыў канкрэтную дату магчымага дэфолту. Раней меркавалася, што гэта здарыцца ў перыяд з 18 кастрычніка па 5 лістапада. Міністр фінансаў заклікаў Кангрэс павысіць мяжу дзярждоўгу на $300 млрд і адзначыў, што праз тры тыдні ў дзяржаўнай казне застанецца толькі $ 30 млрд свабодных грошай, а амерыканскія фінансавыя абавязацельствы ў гэты перыяд могуць аказацца ў два разы большымі. Ліст Лью выклікаў рэакцыю на сусветных біржах. Напрыклад, золата падаражэла на фоне гэтага паведамлення на 1,4%. Прэзідэнт ЗША Барак Абама 20 верасня заявіў аб магчымасці новага фінансавага крызісу, калі Кангрэс не павысіць ліміт па дзярждоўгу.

## КОЛЬКІ МОЎ МУСІЦЬ ВЕДАЦЬ СУЧАСНЫ ЧАЛАВЕК?

**Вось ужо больш за 10 гадоў з мэтай падтрымкі моўнай разнастайнасці адзначаецца Еўрапейскі дзень моў. Усё больш людзей свабодна размаўляюць як мінімум на адной замежнай мове. А захаванне і развіццё моў, уключаючы малыя, дэкларуецца ў афіцыйнай моўнай палітыцы Еўрасаюза.**



**Алег ЦІТКОЎ, тэлевядучы («Добрай раніцы, Беларусь!»), прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі:**

— Упершыню ад вас пачуў пра існаванне такога дня, але наогул ён прыдуманы вельмі правільна. Бо немагчыма жыць у сённяшнім мультыкультурным свеце, ведаючы толькі адну мову. Напрыклад,падарожнічаючы па Еўропе, я звярнуў увагу, што амаль паўсюдна з'яўляюцца шыльды і ўказальнікі на 4 мовах: мове краіны, англійскай, рускай і кітайскай. Такім чынам, сучаснаму чалавеку чатырох моў больш чым дастаткова для нармальнага існавання. Неабходны мінімум — упэўнена валодаць, акрамя сваёй, англійскай мовай. А кітайская і руская — гэта ўжо на выбар і жаданне кожнага.



**Таццяна ПРУДЗІННІК, пісьменніца, блогерка, вандроўніца (цяпер жыве ў Іспаніі):**

— Нават калі гэты сучасны чалавек ніколі не збіраецца пакідаць радзіму, то яму варта ўсё ж вывучыць англійскую мову, хаця б для таго, каб свабодна арыентавацца ў інтэрнэце. А ўжо калі ён збіраецца падарожнічаць, без універсальнай англійскай не абысціся. Маладыя еўрапейцы ведаюць па тры-чатыры мовы і вельмі лёгка іх вучаць. Я думаю, гэта звязана з педагагічным падыходам: ім ніхто не забівае ў галаву з самага дзяцінства, што замежная мова — гэта вельмі складана і страшна. Ды і метады навучання моцна адрозніваюцца ад нашых, у іх больш весялосці і мадэлявання практычных сітуацый і менш механічнага завучвання. У якасці прыкладу магу прывесці майго французскага сябра Валянціна, які за паўгода жыцця ў Барселоне выдатна вывучыў іспанскую мову. У нас жа лічыцца, што менш чым за два гады замежную мову не вывучыць. Ну і, вядома, сучасны чалавек перадусім павінен ведаць і паважаць родную мову, тым больш калі гэтая мова такая прыгожая і мілагучная, як наша, беларуская. Хаця б песні родныя трэба вывучыць, каб пры выпадку праспяваць іх на вячорках сваім замежным сябрам і пачуць у адказ захопленыя кампліменты пра тое, як гэта неверагодна выдатна!



**Марат КЛІМАЎ, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, археолаг:**

— Ёсць такая аксіёма: чым больш моў ведае чалавек, тым больш развіты яго мозг. Таму я суб'ектыўна лічу, што беларусы больш развітыя, чым рускія, бо мы з дзяцінства вывучаем адразу дзве мовы, якімі карыстаемся ў штодзённым жыцці. Плюс замежная. Трох моў для мінімальна камфортнага існавання ў сучасным свеце, у прынцыпе, хопіць. Можна, натуральна, прысвяціць усё жыццё вывучэнню іншых моў, але пры гэтым трэба захоўваць разумную мяжу, не ператвараючы іх колькасць у самамэту... Асабіста мне для працы хапае рускай, беларускай і размоўнай, неспецыялізаванай англійскай, бо спецыялізаваную літаратуру нармальна чытаю са слоўнікам, з далёкімі замежнікамі шчыльна перасякаюся хіба раз на год на навуковай канферэнцыі, а замежнікі блізкія — палякі, украінцы — цудоўна разумеюць беларускую. Дарэчы, за межамі краіны я прынцыпова карыстаюся менавіта беларускай, бо лічу мову галоўным самаідэнтыфікатарам чалавека.

**Падрыхтавала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ШКОДНЫЯ УМОВЫ ПРАЦЫ: ВЫБАР СПОСАБУ КАМПЕНСАЦЫІ — ЗА РАБОТНІКАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Першымі права на датэрміновую прафесійную пенсію набылі жанчыны, занятыя на работах па спісе №1, — адзначыла міністр. — На бягучую дату іх прафесійны стаж перавышае неабходную палову. Сфарміраваныя за кароткі тэрмін пенсійныя зберажэнні з невысокіх страхавых узносаў не даюць магчымасці назначаць высокія прафесійныя пенсіі ў пераходным перыядзе. Таму, дасканала прапрацаваўшы пытанне, урад звярнуўся з прапановай да Прэзідэнта аб прадастаўленні дадатковых пенсійных гарантый асобным катэгорыям работнікаў, якія адпрацавалі працяглы перыяд у асаблівых умовах працы. Прэзідэнт падтрымаў унесеныя прапановы і даручыў ураду распрацаваць адпаведны дакумент».

Указам прадугледжваецца, што работнікі, занятыя ў шкодных умовах працы па спісах №1 і № 2, якія да ўвядзення прафесійнага пенсійнага страхавання адпрацавалі не менш за палову спецыяльнага стажу, неабходнага для назначэння льготнай пенсіі па законе «Аб пенсійным забеспячэнні», маюць права на гэту пенсію са сродкаў агульнай пенсійнай сістэмы. Пры гэтым працягласць прафесійнага стажу не мае значэння.

Што датычыцца іншых работнікаў, занятых у шкодных умовах працы і асобнымі відамі прафесійнай дзейнасці, якія да 1 студзеня 2009 года адпрацавалі менш як палову спецыяльнага стажу (гэта і тыя, хто зусім не мае спецыяльнага стажу да названай даты), то ўказам ім прадастаўляецца права выбраць спосаб кампенсацыі занятасці ў такіх умовах. Так, работнік можа аддаць перавагу таму, каб у яго фарміравалася права на датэрміновую прафесійную пенсію (дадатковую прафесійную пенсію). Для гэтага работадавец будзе выплачваць за гэтага работніка абавязковыя ўзносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Або работнік можа выбраць штомесячную даплату да заработнай платы ў перыяд «шкоднай» работы. Яе памер вызначаецца работадаўцам, але не можа быць меншым за суму яго ўзносу на прафесійнае пенсійнае страхаванне за гэтага работніка. Гэта значыць узносы, якія належалі б да выплаты ў фонд, будуць выплачвацца непасрэдна работніку. Адпаведна, права на датэрміновую пенсію ў работніка фарміравацца не будзе. Свой выбар работнік рэалізуе праз падачу свайму работадаўцу адпаведнай заявы.

Яшчэ адна мера, прадугледжаная ўказам, — павышэнне тарыфаў узносаў работадаўца на прафесійнае пенсійнае страхаванне работнікаў, занятых на работах па спісе №1, з 4,8 працэнта да 9 працэнтаў, па спісе №2 — з 2,6 працэнта да 6 працэнтаў. Новыя тарыфы на ППС пачнуць дзейнічаць для работадаўцаў з 2014 года. Такая мера прынята з улікам шматлікіх просьбаў у мэтах павышэння памераў будучых прафесійных пенсій.

■ Соцыум

# ПАВЫШЭННЕ ПЕНСІЙ — ЗЫХОДЗЯЧЫ З МАГЧЫМАСЦЯЎ

**Далейшае павышэнне пенсій будзе вызначацца магчымасцямі пенсійнай сістэмы ў аб'ёмах, якія не парушаюць яе стабільнасць, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Пенсіі атрымлівае больш як 27 працэнтаў насельніцтва краіны (больш як 2,6 млн чалавек). Расходы на выплату пенсій складаюць каля 10 працэнтаў ВУП (больш за Br5 трлн штомесяц).

Асноўнымі задачамі ў галіне пенсійнага забеспячэння з'яўляюцца падтрыманне ўзроўню матэрыяльнага забеспячэння непрацаздольных грамадзян і забеспячэнне стабільнай работы пенсійнай сістэмы, адзначылі ў міністэрстве.

Нагадаем, з 1 студзеня 2012 года ўстаноўлена дадатковая мера падтрымкі непрацуючых атрымальнікаў пенсій у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ва ўзросце старэйшым за 75 гадоў у выглядзе штомесячнай мэтавай даплаты. У ліпені бягучага года пераразлічаны працоўныя пенсіі. У лютым, маі і жніўні павышаны мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, надбаўкі, павышэнні і даплаты да пенсій у сувязі са змяненнем бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

У сярэднім памер пенсіі па ўзросце з пачатку бягучага года павялічаны на 11 працэнтаў, у верасні ён складае каля Br2,2 млн. За студзень—жнівень 2013 года да адпаведнага перыяду 2012 года сярэдні памер пенсіі па ўзросце павялічыўся на 48,5 працэнта, а ў рэальным выражэнні — на 24 працэнты. Суадносіны гэтай пенсіі з сярэднім заработкам работнікаў рэспублікі падтрымліваюцца на ўзроўні 40 працэнтаў.

Заканадаўствам грамадзянам Беларусі прадастаўлена магчымасць фарміравання больш высокай пенсіі ў будучым у выпадку адмовы ад яе атрымання ў перыяд работы. Так, у выпадку адмовы ад атрымання пенсіі за першы поўны год работы яе памер павялічыцца на 6 працэнтаў заработку, які прымаецца для яе вылічэння, за другі — на 8 працэнтаў, за трэці — на 10 працэнтаў, за чацвёрты — на 12 працэнтаў, за пяты і кожны наступны год — на 14 працэнтаў. Калі чалавек працаваў без атрымання пенсіі менш за год, то павелічэнне за кожныя поўныя два месяцы такой работы складае 1 працэнт заработку, прымаемага для яе вылічэння. У выніку за 5 гадоў работы без атрымання пенсіі яе памер павялічыцца ў 1,7-2 разы.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў** Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **2 кастрычніка 2013 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

**Рэгістрацыя** дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе адбывацца **2 кастрычніка 2013 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

НАВІНЫ

## «ЗІМОВЫ ЧАС» У РАСКЛАДЗЕ РУХУ

**З 27 кастрычніка ў сувязі з пераходам на «зімовы час» партнёраў сумежных дзяржаў у раскладзе руху аўтобусаў па міжнародных маршрутах адбудуцца пэўныя змены.**

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», закрануць яны рэйсы ў Варшаву, Вільнюс, Друскінінкай, Калінінград, Каўнас, Кіеў, Мюнхен, Рыгу, Панявежыс, Талін. На ўсіх іх час адпраўлення аўтобусаў зменшыцца на адну гадзіну. Напрыклад, рэйс па маршруце Мінск — Варшава будзе адпраўляцца з нашай сталіцы ад АВ «Цэнтральны» ў 19.00 (замест 18.00) па серадах, чацвяргах, пятніцах, суботах і нядзелях, з Варшавы — у 13.00 па чацвяргах, пятніцах, суботах, нядзелях і панядзелках. Тое ж можна сказаць адносна часу адпраўлення і пра рэйс, скажам, Мінск—Мюнхен: аўтобусы будуць выпраўляцца ў дарогу з Мінска ад АВ «Цэнтральны» ў 13.00 (замест 12.00) па серадах, пятніцах і нядзелях, з Мюнхена — у 13.00 па пятніцах, нядзелях, аўторках.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УЛАДЗІСЛАЎ БАУМГЕРТНЕР ЗМЕШЧАНЫ ПАД ДАМАШНІ АРЫШТ

**Змяненне меры спынення Уладзіславу Баумгертнеру на дамашні арышт звязана з завяршэннем асноўных следчых мерапрыемстваў. Пра гэта ўчора паведаміў старшыня Следчага камітэта Беларусі Валянцін Шаеў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Першапачатковыя асноўныя неадкладныя следчыя дзеянні завершаны — тыя, што звязаны з замацаваннем слядоў злачынства і канфіскацыяй дакументацыі. У сувязі з гэтым было прынята такое рашэнне, улічваючы таксама хадайніцтва родных», — адзначыў Валянцін Шаеў.

ПАДЗЕІ

## 10 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ ЗА «ВЫРАШЭННЕ ПЫТАННЯ»

**Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі падчас перадачы грошай загадчыцу і адваката юрыдычнай кансультацыі Савецкага раёна г. Мінска, а таксама пасрэдніка — дырэктара прыватнага камерцыйнага прадпрыемства сталіцы.**

10 000 долараў прызначаліся для далейшай перадачы ў якасці хабару службовым асобам праваахоўных органаў за спрыяльнае вырашэнне пытання аб завядзенні крымінальнай справы па факце ўчыненых у дачыненні да вышэйзгаданага грамадзяніна проціпраўных дзеянняў. Заведзеная ў дачыненні да затрыманых крымінальная справа перададзена ў Следчы камітэт.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## АФЕРА З ДАРАГІМІ АЎТАМАБІЛЯМІ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС сталіцы затрымалі афeрыста, які, абяцаючы людзям дапамогу ў пакупцы дарагіх аўтамабіляў, ашукаў іх агулам на суму каля 200 тысяч у.а.**

Летам гэтага года грамадзянін узяў у арэнду ў адным з мінскіх гандлёвых цэнтраў памяшканне і прапанаваў ахвотнікам паслугі па куплі за мяжой аўтамашын. Абяцаў усё зрабіць у сціслыя тэрміны і па прымальнай цане. Сабраўшы з заказчыкаў значную суму, аферыст знік. Пасля таго, як пацярпелыя звярнуліся ў міліцыю, высветлілася, што фірма і яе дырэктар — «ліпавыя», а нумары кантактных тэлефонаў зарэгістраваны на старонніх людзей. Дзякуючы намаганням аператыўнікаў Савецкага РУУС ілжэ-прадпрымальніка затрымалі. На здымнай кватэры зламысніка былі знойдзены дакументы, што сведчаць асобу, на імя грамадзян Расіі і Украіны. У праваахоўных органаў ёсць падставы думаць, што падазраваны мае дачыненне да здзяйснення аналагічных злачынстваў як на тэрыторыі Беларусі, так і ў шэрагу краін СНД.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ФАКТЫ

## БЫЛОМУ ГЕНДЫРЭКТАРУ МІНСКАГА МЯСАКАМБІНАТА ВЫНЕСЛІ ПРЫСУД

**За атрыманне хабару ў буйным памеры Уладзімір Лазоўскі атрымаў 4,5 года турмы з канфіскацыяй маёмасці. Таксама суд пазбавіў яго права займаць пэўныя пасады і займацца пэўнай дзейнасцю тэрмінам на 5 гадоў. Аб гэтым «Звяздзе» паведаміла афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Беларусі Юлія ГАНЧАРОВА.**

Нагадаем, што вясной гэтага года гендырэктара Мінскага мясакамбіната ўзялі пад варту за атрыманне хабару ў памеры 4 тысячы долараў. Гэтыя грошы былы кіраўнік «заслужыў» за тое, што прадставіў першачарговае права на атрыманне аплаты за выкананыя работы аднаму з будаўнічых прадпрыемстваў. Падчас следства на яго маёмасць на агульную суму звыш 5,7 мільярда быў накладзены арышт.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

# ВЫСЕЛІЦЬ, НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ...

## Лічым грошы і дбаем пра парадак

Апошні раз я бачыла Саматэвічы ўвесну 2011 года: калі рыхтавала артыкул да 25-годдзя чарнобыльскай аварыі. Тут, дзе раней віравала жыццё, а цяпер цісне на вушы цішыня, было дарэчы ўзгадаць мінулае і падумаць пра будучае пострадыяцыйнай зоны.

Зразумела, гэтая выселеная вёска мяняла год ад году сваё аблічча і ўсё менш паходзіла на добрае месца для жыцця людзей, аднак у той час вестак пра тэрміновае адсяленне жменькі людзей, якія засталіся ў Саматэвічах насуперак усяму, не было. Выбар пустэльнікаў, безумоўна, не віталі, аднак і не перашкаджалі жыць.

Што ж перамянілася за гэты час? У Касцюковіцкім райвыканкаме сказалі коратка: трэба выконваць закон аб адсяленні людзей з тэрыторыі адчужэння.

— Людзі жывуць у радыяцыйнай зоне незаконна, але ўлада для іх павінна чысціць дарогі, падаваць электраэнергію, прывозіць прадукты, забяспечваць медыцынскай дапамогай і транспартам, — каментуе **старшыня Касцюковіцкага райвыканкама Уладзімір Кісялёў.** — Усё гэта каштуе грошай. Між тым, жыхары зоны, за рэдкім выключэннем, маюць жыллё, якое яны атрымалі ад дзяржавы як кампенсацыю за пакінутыя дамы. Чаму ж яны працягваюць там жыць?

Пытанне рытарычнае. Большасць насельнікаў зоны — старыя людзі, якія пакінулі новае жыллё ўнукам і дзецям альбо страцілі яго па іншых прычынах і вярнуліся ў старыя хаты дажываць век.

— Аднак некаторыя незаконна здаюць свае кватэры ў арэнду, за што, прынамсі, на жыхара Саматэвічаў падатковая інспекцыя наклала спагнанне, — удакладняе кіраўнік раёна. — Акрамя гэтага, цяпер ідзе следства наконт вырошчвання і сушкі канопляў у зоне, дзе ёсць месцы, якія не навідавоку ў людзей, і там сапраўды трэба навесці парадак.

Да размовы далучаюцца **намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Стасьеў і галоўны спецыяліст зон адчужэння і адсялення Касцюковіцкага раёна Пётр Барыкін.** Яны пералічваюць і іншыя прычыны занепакоенасці мясцовай улады сітуацыяй у адселеных вёсках. Гэта пажары, якія ўзнікаюць ад дзейнасці там людзей. Прычым нярэдка гэта робяць здабытчыкі металу, каб аблегчыць яго пошук. Сталі частымі выпадкі браканьерства ў зоне. Тут развялося шмат дзікіх жывёл, што небяспечна. Раслінасць наступае з усіх бакоў.

**Старшыня Беладубраўскага сельсавета Міхаіл Грыбачоў** падкрэслівае: «Пустэльнікі жывуць у хатах, якія належаць сельвыканкаму. Прадпрыемства «Радон», якое здзяйсняе пахаванне адселеных вёсак, не можа завяршыць свае работы з-за хат, дзе насуперак усяму жывуць людзі.

## Зараснік замяніць на выгоды

Мы разам едзем у Саматэвічы, каб сустрэцца з аўтаркай ліста ў рэдакцыю. Пагутарыць з ёй вырашыў і старшыня райвыканкама, каб на месцы расставіць усе кропкі над «і». Па дарозе мы аб'язджаем аўталаўку, якая накіроўваецца ў выселеную вёску (гэта адбываецца двойчы на тыдзень).

**Яны наладзілі сваё жыццё ў выселенай вёсцы, нібыта на хутары, і ім тут падабаецца. Ёсць жывёла і агарод, ёсць бытавая тэхніка. Сям'я мае кватэру ў раённым цэнтры, але гаспадыня пагардліва называе яе «хэйдарам», дзе няма нават балкона.**

...Усяго 25 кіламетраў ад раённага цэнтра Касцюковічы — і ты ў іншым свеце. Спачатку кранае прыгажосць восеньскай прыроды: вялізныя дрэвы з лісцем багатых адценняў жоўтага і чырвонага, з дадаткам пабляклага зялёнага.

Аднак ужо з другога погляду прырода пачынае пужаць. У месцах, дзе людзі не жывуць, яна пераходзіць у наступ. Пры блізкім разглядзе лес аказваецца непралазным. Рэшткі асфальтавай дарогі падпіраюць дрэвы і падпілаваныя шукальнікамі металаў бетонныя слупы. Ні людзей, ні гукаў. Наша «група таварышаў» выглядае на гэтым фоне досыць экзатычна. Мужчыны ў касцюмах і белых кашулях з гальштукамі здаюцца прышэльцамі.

Хата, дзе жывуць Людміла Іванаўна Зыза і Рыгор Кірылавіч Давыдзенка, знаходзіцца каля аўтадарогі. Гэта старая будыніна цёмна-шэрага колеру. Шыльда з нумарам дома ржавая, ды і нумарацыя тут даўно не патрэбна. Восеньскія кветкі вольна разрастаюцца навокал.

Гаспадар разважае: перасяляцца ці не?



На двары — сабраныя ў кошыкі яблыкі і гарбузы. На задку стаяць веласіпеды — першы сродак перасоўвання. У хаце вельмі чыста і ўтульна, але найбольшае ўражанне, прынамсі, на мяне робіць агарод, які ўвесь зарос нейкімі раслінамі ў рост чалавека.

Гаспадары прымаюць дэлегацыю ветліва. Людміла Іванаўна гаворыць, што яна не хоча з'язджаць з Саматэвічаў.

— Я наладзіла быт і хачу тут жыць, — тлумачыць жанчына. — Навошта нас гоняць? Які пераезд? На новыя рэчы ў нас няма грошай, а наша старызна па дарозе разваліцца.

— Рухацца з месца ўжо не хочацца, — падтрымлівае Рыгор Кірылавіч.

Прадстаўнікі ўлады ў адказ тлумачаць сваю пазіцыю: і пра выдаткі, і пра парадак, і пра новае жыллё. Даюць абяцанні, што дапамогуць з пераездам і рамонтам. Угаворваюць змяніць зараснік і пустэчу на жыццё сярод людзей у кватэры з усімі выгодамі. Нагадваюць, нарэшце, пра ўзрост і хваробы: што будзе, калі спатрэбіцца пастаянная медыцынская дапамога і спецыяльны догляд?

— Трэба глядзець у будучае і пражыць гады, якія засталіся, у нармальных умовах! — заклікаюць пенсіянераў. — А што тут будзе праз дзясятак гадоў? Вы нам яшчэ падзякуеце пасля пераезду...

Урэшце Людміла Іванаўна і Рыгор Кірылавіч спачатку пагаджаюцца падумаць, а потым — і паглядзець новае жыллё. Аўтары ліста і прадстаўнікі ўлады прыходзяць да высновы, што здольныя знайсці рашэнне праблемы, якое задаволіць абодва бакі.

Свята-Троіцкую царкву ў Саматэвічах, якая магла б быць прыгожым помнікам архітэктуры, абступае лес.



## Кампраміс дзеля дзяцей

Між тым, у Саматэвічах жывуць не толькі пенсіянеры. Тут ёсць сям'я з двума дзецьмі — школьнікамі 2001 і 2003 гадоў нараджэння. Іх бацькі пакуль не знаходзяць паразумення з уладамі наконт перасялення.

— Мы не хочам з'язджаць! — адрэзала Таццяна Сцепаненка.

Яе муж Андрэй працуе на прадпрыемстве «Радон», а сама гаспадыня займаецца вялікай хатняй гаспадаркай. У сям'і ёсць аўтатранспарт, які дазваляе ім адчуваць сябе вольна. Дзеці вучацца ў школе ў цэнтры сельсавета, іх возіць школьны аўтобус.

— Мы нічога ні ў каго не просім, адно толькі — даць нам спакойна жыць, — настойваюць Сцепаненкі.

Яны наладзілі сваё жыццё ў выселенай вёсцы, нібыта на хутары, і ім тут падабаецца. Ёсць жывёла і агарод, ёсць бытавая тэхніка. Сям'я мае кватэру ў раённым цэнтры, але гаспадыня пагардліва называе яе «хэйдарам», дзе няма нават балкона. За яе прыватызацыю цяпер просяць вялікія грошы, і гэта таксама не задавальняе Сцепаненак.

— Мы тут да пенсіі не збіраемся жыць, — энергічна запэўнівае Андрэй. — Трэба толькі пачакаць, пакуль дзеці скончаць школу. Я іх у горад не пушчу, бо там усе кураць і п'юць. А радыяцыю я правяраў: няма яе ні ў зямлі нашай, ні ў прадуктах. Мы яе не баімся, і дзеці нашы здаровыя. Так што тут можна жыць!

Канструктыўнага дыялогу не атрымліваецца. Гаспадары засмучаныя і злуюцца. Андрэй скардзіцца, што іх няспынна пужаюць высяленнем, хаця даўно казалі, быццам не будуць чапаць тых, хто хоча застацца ў пацярпелых ад радыяцыі вёсках. І абяцае нам выжыць у Саматэвічах нават без святла.

Прадстаўнікі ўлады нагадваюць, што даўно казалі сям'і аб неабходнасці пераязджаць у чыстае месца і там гадаваць сваіх дзяцей. Маўляў, калі не падабаецца гарадская кватэра — можна пасяліцца ў вёсцы, каб не мяняць звыклы лад жыцця. Усё ж Саматэвічы належаць да зоны адсялення, дзе радыяцыйны фон складае ад 15 да 40 кюры.

Застаецца толькі спадзявацца, што і ў гэтым выпадку кампраміснае рашэнне ўрэшце будзе знойдзена.

## Мірны шлях

Паводле апошняй інфармацыі, сёння у 4-х адселеных вёсках Касцюковіцкага раёна жывуць 29 чалавек. Гэты паказчык з цягам часу памяншаецца: людзі ўсё ж такі пераязджаюць у чыстыя мясціны альбо, прабачце, паміраюць.

У Касцюковіцкім райвыканкаме падкрэслілі, што размова сёння не ідзе пра тэрміновае і тым больш гвалтоўнае перасяленне з зоны. Пакуль людзей угаворваюць, спрабуюць з імі знайсці агульную мову і паразуменне. Між тым, калі мірныя перамовы зойдуць у тупік, то ўлада пакідае за сабой права звярнуцца па канчатковае вырашэнне спрэчкі з пустэльнікамі ў суд — як у апошнюю інстанцыю.

— Закон ёсць, і яго трэба выконваць, — яшчэ раз падкрэсліў Уладзімір Кісялёў. — Але я па-чалавечы не разумею: навошта людзям там заставацца жыць? Чаму яны не хочуць жыць цывілізавана?

Так, цывілізацыя, шчыра кажучы, ужо не мае ніякага дачынення да Саматэвічаў. Калі вёску яшчэ толькі высялялі, мы, журналісты, меркавалі, колькі гадоў спатрэбіцца, каб прырода паглынула такое вялікае паселішча, з капітальнымі пабудовамі і добрай інфраструктурай. Аказалася, усяго два дзясяткі гадоў. Цяпер ужо і не разгледзець, дзе была кніжная крама, а дзе стаяла школа. Нават капаніры — пагоркі ад пахаваных дамоў, — губляюцца сярод маладых дрэў і хмызняку...

Адзінае, што застаецца ў Саматэвічах прыгожай будыніне, — Свята-Троіцкая царква, адбудаваная з трывалай чырвонай цэглы ў XIX стагоддзі. Цяпер, праўда, патрабуецца пэўная мужнасць і экіпіроўка заўзятага турыста, каб пайсці туды. Яе не проста абступілі дрэвы — яны выраслі і на самім будынку. Купалы над зараснікамі — вось і ўсё, што нам засталося.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**

*Касцюковіцкі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ПРОДАЕТСЯ
производственно-складской комплекс с АБК 12 676 м²
г. Витебск, пр. Московский, 57А. Тел. 8(029) 195-56-81
УНП 100080849

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по обязательному страхованию ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих в страны системы «Зеленая карта» BY/07 № 8796499; квитанция о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 3899139; по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА №№ 0380793, 0380808, 0380809, 0380810, 0415008; страховые полисы по гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР №№ 2834406, 2862856, 2862857, 2862868, серии ВС №№ 9134065, 9134066; страховой полис, Договор страхования, заключаемый с физическим лицом по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН серии ПУ № 0032896; страховой полис Договор страхования, заключаемый с физическим лицом (форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни серии, ПЕ № 0076980, считать недействительными.
*УНП 100357923.*

■ Гандбол

# ЛЕПЕЙ НЕ ПРЫДУМАЦЬ

**Мінскае «Дынама» перамагло ў першым хатнім матчы сёлетняй Лігі чэмпіёнаў македонскі «Вардар» (26:24).**



Барацьба за мяч паміж дынамаўцам Дзеянам Бомбачам (злева) і Цімурам Дзібіравым

Буйныя перамогі ў падобных супрацьстаяннях бываюць рэдка. Барацьба звычайна кіпіць да апошніх хвілін, а частыя тайм-аўты напрыканцы гульні толькі напальваюць атмасферу ў запоўненай балельшчыкамі зале... Пасля паражэння ў Парыжы хлопцам Барыса Дэніча важна было добра згуляць дома: перамагчы, паверыць у свае здольнасці і, безумоўна,парадаваць родных заўзятараў, якіх на трыбунах сабралася больш за 3 тысячы. Магчыма, нехта назаве гэтыя словы банальнымі, аднак той, хто хоць калі-некалі займаўся спортам, узгадае сам, як важна адчуць нерв першай перамогі, сваю ўпэўненасць.

Нельга сказаць, што гэты матч выцягнуты літаральна на зубах. Мінчане дамінавалі на пляцоўцы Палаца спорту ўвесь паядынак, але лік увесь час сведчыў пра тое, што адна хвіліна расслабленасці можа кардынальна змяніць ход гульні. Тым больш «Вардар», якім валодае расійскі бізнесмен Сяргей Самсоненка, — сапернік моцны, небяспечны. Шапкамі яго не закідаеш. На выхадных клуб са Скоп'е так патрапаў нервы зорнай «Барселоне», што каталонцы згадзіліся з македонцамі і на нічыю. На шчасце, у адрозненне ад «Барсы», беларусы здолелі завяршыць сваю працу прыгожым пераможным вынікам.

— «Дынама» атрымала заслужаную перамогу, — прызнаўся карэспандэнту «Звязды» **Цімур Дзібіраў, расійскі легіянер «Вардара».** — Калі мы саступілі, то відавочна, рабілі нешта не так. Нам выпала цяжкая канцоўка, у якой добра сябе праявіла дынамаўская абарона. Магу толькі павіншаваць саперніка з перамогай. Мінчане былі мацнейшымі за нас.

— Пераломны моманты матча наступіў за 10 хвілін да канца гульні, — кажа **Сяргей Шэльменка, гандбаліст мінскага «Дынама».** — Мы пачалі добра гуляць у атацы, а пасля — у абароне. Закінулі некалькі мячоў, на якія сапернік не здолеў нічым адказаць. У выніку і маем перавагу ў два галы.

— Свой першы матч у Лізе чэмпіёнаў мы таксама згулялі добра, але прайгралі. «Вардар» быў падрыхтаваны да нашых атак, аднак мы згулялі крыху лепш за апанента, — рэзюмаваў хатнюю вікторыю над балканцамі **Барыс Дэніч, галоўны трэнер мінскага «Дынама».**

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара**

СВЕДЕНЬЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«С «Марко» всегда на «десяточку»

Организатор рекламной игры «С «Марко» всегда на «десяточку»: Частное предприятие «Сан Марко», УНП 800018165, зарегистрированное решением Администрации Октябрьского района города Витебска 13 мая 2010 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800018165.

Юридический адрес: 210026, г. Витебск, проспект Людникова, д. 10.

Тел. (0212) 54-90-31.

Срок проведения рекламной игры: с 19 августа по 30 сентября 2013 года в фирменных магазинах «Марко» на всей территории Республики Беларусь:

| № п/п | Магазин |
|---|---|
| 1. | г. Барановичи, ул. Советская, 105А |
| 2. | г. Бобруйск, ул. Минская, 15 |
| 3. | г. Бобруйск, ул. Советская, 82 |
| 4. | г. Брест, ул. Машерова, 39 |
| 5. | г. Брест, ул. Московская, 332 |
| 6. | г. Витебск, ул. 39-й Армии, 25 |
| 7. | г. Витебск, ул. Людникова, 16 |
| 8. | Торговый центр «Марко-Сити» г. Витебск, ул. Ленина, 26а |
| 9. | г. Витебск, проспект Московский, 8 |
| 10. | г. Витебск, ул. Толстого, 5 |
| 11. | г. Витебск, проспект Черняховского, 10 |
| 12. | г. Гомель, ул. Победы, 16 |
| 13. | г. Гомель, ул. Советская, 97/2 |
| 14. | г. Гродно, ул. Горького, 73А |
| 15. | г. Гродно, ул. Ожешко, 36 |
| 16. | г. Гродно, ул. Космонавтов, 4 |
| 17. | г. Жлобин, ул. Микрорайон-1, 1 |
| 18. | г. Лида, ул. Кирова, 8 |
| 19. | г. Минск, ул. Козлова, 2 |
| 20. | г. Минск, ул. Кошевого, 35 |
| 21. | г. Минск, ул. Чкалова, 35 |
| 22. | г. Минск, проспект Независимости, 43 |
| 23. | г. Могилев, ул. Первомайская, 40 |
| 24. | г. Могилев, ул. Тимирязевская, 36 |
| 25. | г. Мозырь, ул. Интернациональная, 96а |
| 26. | г. Молодечно, ул. Б. Хмельницкого, 22а |
| 27. | г. Новополоцк, ул. Молодежная, 71 |
| 28. | г. Орша, ул. Ленина, 23 |
| 29. | г. Пинск, ул. Первомайская, 11 |
| 30. | г. Полоцк, ул. Коммунистическая, 28 |
| 31. | г. Светлогорск, м-н Первомайский, 3а |
| 32. | г. Солигорск, ул.Козлова, 46а |

за исключением магазинов:
г. Гродно, ул. К. Маркса, 21
г. Витебск, Смоленский рынок

**В рекламной игре разыгрывались призы шести видов:**
- 125 призов – рюкзак Urban, art. 70600145 с логотипом.
- 166 призов – рюкзак красный с нанесением логотипа.
- 330 призов – кружка керамическая арт. 8788806 с логотипом.
- 235 призов – кепка с козырьком с логотипом «Марко».
- 150 призов – блокнот А6 на пружину.
- 150 призов – ручка шариковая с логотипом 12427-30.

**Призовой фонд был разыгран частично. Было разыграно:**
- 80 призов – рюкзак Urban, art. 70600145 с логотипом.
- 108 призов – рюкзак красный с нанесением логотипа.
- 199 призов – кружка керамическая арт. 8788806 с логотипом.
- 59 призов – кепка с козырьком с логотипом «Марко».
- 54 приза – блокнот А6 на пружину.
- 54 приза – ручка шариковая с логотипом 12427-30.

**Общее количество участников рекламной игры составило 16 684 человека.**

Правила проведения Рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 153 от 17.08.2013 года. По вопросам рекламной игры обращаться по телефону (0212) 54-90-31 с 8.30 до 17.00 в рабочие дни по 30 сентября 2013. Рекламная игра «С «Марко» всегда на «десяточку» зарегистрирована в Министерстве торговли Республики Беларусь, свидетельство о государственной регистрации № 2219 16.08.2013 г.

**Список победителей Рекламной игры «С «Марко» всегда на «десяточку» размещен на сайте: http://zviazda.by/2013/09/16369.html**



# ДЗЕ ХЛЕБ — ТАМ І ПЕСНЯ



**Дэлегацыя Мінскай вобласці на чале з губернатарам Барысам Батурам возьме ўдзел у рэспубліканскім фестывалі — кірмашы працаўнікоў сяла «Дажынкі-2013» у Жлобіне. Гэта лепшыя механізатары, камбайнеры, апаратары сушыльнай гаспадаркі, кіраўнікі сельгасарганізацый, спецыялісты, інжынеры, аграномы. З якімі вынікамі цэнтральны рэгіён краіны сустракае свята, гутарка з першым намеснікам старшыні Мінаблвыканкама Васілём АКУЛІЧАМ.**

***— Васіль Іванавіч, дык які ўнёсак Міншчыны ў агульны каравай?***

— Міншчына ў лідарах сярод іншых абласцей па валавым зборы збожжавых і зернебабовых — 1 млн 684 тыс. тон пры сярэдняй ураджайнасці 36 цэнтнераў з гектара (па краіне — 7 млн 245 тыс. тон). У параўнанні з мінулым годам недаатрымалі каля 600 тыс. тон. Але недабор будзем імкнуцца перакрыць зернем кукурузы. Сёлета, дарэчы, яна парадавала добрым ураджаем. Уборку кукурузы на зерне ўжо вядуць паўднёвыя раёны вобласці. Ураджайнасць складае звыш 77 цэнтнераў з гектара пры леташняй 56 цэнтнераў з гектара. Зыходзячы з гэтага, плануем намалаціць амаль удвая больш зерня — на ўзроўні 500 тыс. тон. У той жа час летась валавы збор «царыцы» палёў склаў 320 тон.

***— Як кажуць, чалавек — цар прыроды. Але саўладаць з яе капрызамі пакуль не ў сілах. Сёлета надвор'е асабліва паказала свой нораў. Як гэта адбілася на якасці пасеваў, ураджайнасці?***

— Вельмі многае ў сельскай гаспадарцы залежыць ад надвор'я. Праца ў вёсцы, пад адкрытым небам — гэта не тое, што стаяць пад дахам за станком, дзе вялікае значэнне мае толькі асабістая адказнасць, чалавечы фактар. Сёлета была вельмі суровая і працяглая зіма, якая канчаткова скарылася, саступіла толькі ў канцы красавіка. На плошчы 50 тыс. гектараў азімыя культуры загінулі — давялося перасяваць. Калі ў мінулыя гады паўднёвыя раёны вобласці пачыналі сеяць яравыя ў канцы сакавіка, то сёлета прыступілі да сяўбы толькі ў маі ці напрыканцы мая. Усё гэта адбілася і на ўрадлівасці палеткаў.

Разам з тым, скажу, што да пасяўной хлебаробы вобласці падрыхтаваліся на адпаведным узроўні. Да 10 ліпеня была падрыхтавана ўся збожжаўборачная тэхніка, якой у вобласці дастаткова. Уся яна практычна новая, пачынаючы ад трактароў айчыннай вытворчасці і камбайнаў і заканчваючы пасяўнымі агрэгатамі. Такога не было і ў савецкі час. Напрыклад, толькі трактароў налічваецца звыш тысячы. Нагрузка на адзін склала каля 1 гектара. Дзякуючы новай сучаснай тэхніцы практычна не ўзнікае пытанняў па якасці сяўбы. Згадайце былыя часы, калі на аднаго механізатара прыпадала некалькі кантралёраў, якія літаральна хадзілі за трактарам МТЗ-32 з прычапным абсталяваннем. Цяпер у нас выкарыстоўваюцца камбінаваныя глебаапрацоўчыя агрэгаты. Няма праблем і з забеспячэннем камбайнамі, уся тэхніка гомельскай вытворчасці працуе добра. Асаблівая ўвага была нададзена і кадраваму забеспячэнню на перыяд уборкі. Недахоп механізатараў і камбайнераў быў запоўнены за кошт прыцягнення на жніво работнікаў прамысловых прадпрыемстваў, выпускнікоў і практыкантаў навучальных устаноў адпаведнага профілю.

***— Але сярэднюю ўраджайнасць па вобласці можна, вобразна кажучы, параўнаць з сярэдняй тэмпературай па бальніцы, Васіль Іванавіч. Хтосьці спрацаваў на «выдатна», а нехта — слабей.***

— Па выніках уборкі ўраджаю Нясвіжскі раён выйшаў пераможцам спаборніцтва сярод раёнаў вобласці. Праўда, вынік ніжэйшы, чым у мінулым годзе, але, разам з тым, тут сабралі 134 тысячы 260 тон збожжавых і зернебабовых. Гэта трэці вынік за ўсю гісторыю Нясвіжскага раёна. Сярэдняя ўраджайнасць па раёне склала 60,1 цэнтнера з гектара. Статысячную мяжу пераадолелі Слуцкі раён (147 тыс. тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 41,3 ц/га), Мінскі раён (135 тыс. тон, ураджайнасць 47,1 ц/га). Гэта больш магутныя раёны, дзе развіта культура земляробства і дзе больш высокі бал зямлі і ўрадлівыя глебы.

Пяць гаспадарак вобласці перавысілі ўраджайнасць у 60 цэнтнераў з гектара: СВК «Новае жыццё», «Агракамбінат Сноў», СВК «17 верасня» Нясвіжскага раёна, ААТ «Гастэлаўскае» Мінскага і філіял «Праўда-Агра» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» Дзяржынскага раёна. Па 50 цэнтнераў з гектара і больш атрымалі звыш 30 гаспадарак, 40 і больш — 49 сельгаспрадпрыемстваў.

***— Сёлетняе жніво вылучыла сваіх тысячнікаў. Хто яны?***

— Пералічыць прозвішчы ўсіх немагчыма, паколькі 475 экіпажаў камбайнаў намалацілі звыш 1 тыс. тон збожжа. На рахунку 29 экіпажаў — больш за 2 тыс. тон. Тры атрымалі больш за 3 тыс. тон. А вось 4-тысячнага рубяжа дасягнуў толькі камбайнер унітарнага прадпрыемства «Агракамбінат Ждановічы» Мінскага раёна Міхаіл Саладуха. Варта дадаць, што летась ён быў адзіны, хто сабраў звыш 7 тыс. тон збожжа. Але і ўраджайнасць тады была значна вышэйшай. Думаю, у наступным годзе ён здолее перакрыць былы рэкорд.





## ПАВАЖАНЫЯ ХЛЕБАРОБЫ!

Спакон веку беларусы, завяршыўшы асноўныя работы на роднай зямельцы, святкавалі дажынкі як вянец нялёгкай, але такой патрэбнай працы. Гэта традыцыйнае і ўнікальнае свята ўшанавання людзей самай пачэснай і мірнай прафесіі на зямлі — хлебаробаў — жыве на Беларусі і зараз, бо ваша праца была і застаецца паважанай і запатрабаванай як стагоддзе таму, так і сёння.

Ад усёй душы віншую і шчыра дзякую ўсім, хто прыклаў сваё сэрца і рукі да стварэння багатага хлебнага каравая нашай Міншчыны і Беларусі! Вы маеце поўнае права ганарыцца здзейсненым, бо, нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е і іншыя цяжкасці, наш цэнтральны рэгіён зноў пацвердзіў сваё права называцца асноўнай жытніцай краіны. Дзякуючы вашай руплівасці, майстэрству і самаадданай працы Мінская вобласць унесла дастойны ўклад у забеспячэнне харчовай бяспекі нашай роднай Беларусі, у далейшы яе росквіт і дабрабыт.

Ад шчырага сэрца жадаю вам моцнага здароўя, далейшых працоўных перамог і здзяйсненняў, шчасця вам і вашым сем'ям!

**Старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс БАТУРА.**

# ДЗЯРЖЫНСКІ РАЁН У ДЗЯСЯТЦЫ ЛЕПШЫХ ПА ЎМОВАХ ПРАЖЫВАННЯ

**У Дзяржынскім раёне на высокім узроўні ўсе сферы жыццядзейнасці: і сельская гаспадарка, і будаўніцтва, і сацыяльная сфера, і прамысловасць. Усё, так бы мовіць, развіваецца гарманічна, у комплексе. Але што тычыцца прамысловасці, то тут апошнім часам назіраецца шмат змен. З чым гэта звязана ў першую чаргу, размова са старшынёй раённага выканаўчага камітэта Мікалаем АРЦЮШКЕВІЧАМ.**



— Нам пашчасціла, што гарады Дзяржынск і Фаніпаль сталі прамысловымі спадарожнікамі Мінска. Пры асабістай падтрымцы старшыні Мінскага аблвыканкама Барыса Батуры ў раёне Фаніпаля значныя плошчы перададзены свабоднай эканамічнай зоне «Мінск». Тут выдзяляюцца зямельныя ўчасткі пад інвестыцыйныя праекты і будаўніцтва новых вытворчых магутнасцяў разнастайных прамысловых прадпрыемстваў пры ўмове імпартазамяшчэння і рэалізацыі прадукцыі на экспарт. Гэта, так бы мовіць, наша будучыня. Сёння ў тым жа Фаніпалі ўзводзіцца завод рэспубліканскага ўзроўню па вытворчасці электрацягнікоў і ўсіх відаў пасажырскага электратранспарту. Першая электрычка павінна сысці з канвеера да канца гэтага года — усё ідзе паводле графіка, без збояў. Асноўныя заказчыкі на будучую прадукцыю — Беларусь і Расія. Да чэмпіянату свету па футболе, які будзе праходзіць у 2018 годзе адразу ў некалькіх гарадах, наша бліжэйшая суседка плануе набыць пэўную колькасць электрычак — дагаворы заключаюцца. Электрацягнікі, закупленыя ў Швейцарыі, ужо курсіруюць па беларускай чыгунцы. Цяпер іх будзе выпускаць сумеснае швейцарска-беларускае прадпрыемства на тэрыторыі нашага раёна. І паступова новы транспарт прыйдзе на змену старому.

Спадзяёмся, у хуткім часе з'явіцца ў нас і завод па вытворчасці воданагравальных і ацяпляльных прыбораў. Італьянскае прадпрыемства «Фералі-Бел» ужо прыступіла да будаўніцтва вытворчых плошчаў. У бліжэйшы час плануецца адкрыццё заводаў па вытворчасці сучасных упаковачных матэрыялаў, стрэйч-плёнкі разнастайных відаў, у тым ліку і для патрэб сельскай гаспадаркі. Акрамя таго, рыхтуюцца дзве пляцоўкі для будаўніцтва новых магутнасцяў па выпуску будаўнічых блокаў і металічных канструкцый. Сярод ужо рэалізаваных праектаў — будаўніцтва новага прадпрыемства ТАА «Таспо-Ф» па вытворчасці радыятараў для машынабудаўнікоў краіны, ТАА «Андрусера Агра» — цяплічнага комплексу па вырошчванні кветак, стварэнне ЗАТ «ПМІ-Груп» аднаго з самых сучасных ва Усходняй Еўропе прадпрыемстваў па вытворчасці гідраўлічнага абсталявання для аўтатрактарнай тэхнікі айчыннай вытворчасці.

Словам, прамысловасць раёна развіваецца актыўнымі тэмпамі, штогод яе аб'ёмы павялічваюцца. І ў перспектыве, думаю, будуць расці, таму што з'яўляюцца новыя прадпрыемствы.

***— Мікалай Іванавіч, новыя прадпрыемствы — гэта новыя рабочыя месцы і, як правіла, павышэнне заробкаў. Ці не так?***

— Па-першае скажу, што Дзяржынск уваходзіць у топ-рэйтынг 10 гарадоў краіны па заработнай плаце і ўмовах пражывання. Дакладней, займае ў табліцы пятае месца, а Фаніпаль на радок вышэй. Сярэдняя зарплата ў раёне вышэй за 5 млн рублёў, а ў прамысловасці — каля 6 млн рублёў. Зрэшты, не адстае і сельская гаспадарка. Мы імкнёмся трымаць тут высокую планку, паколькі кадры могуць пайсці ў іншыя арганізацыі, дзе большыя заробкі. Але, калі шчыра, то нават не заўсёды ўтрымлівае людзей на сяле і высокі ўзровень аплаты працы. Моладзь, напрыклад, не задавальняе амаль поўная адсутнасць выхадных. Таму ў многіх сельгасарганізацыях пачалі прадастаўляць вольныя дні, нават нягледзячы на сезоннасць работ.

***— Наколькі ведаю, у раёне паспяхова вырашаецца жыллёвая праблема. Ці, магчыма, перабольшваю?***

— У 2006 годзе, калі я ўзначаліў раён, тут будавалася 35 тыс. кв. метраў жылля за год. Літаральна за два гады нам удалося дасягнуць паказчыка ў 70-75 тысяч «квадратаў». І цяпер утрымліваем гэтую планку. У раёне 61 тыс. жыхароў, так што задачу, пастаўленую кіраўніком дзяржавы (будаваць па 1 кв. метры плошчы на чалавека), мы перавыконваем. Акрамя таго, раней, каб уступіць у жыллёва-будаўнічы кааператыў, людзі чакалі 15 гадоў. Цяпер жа, напрыклад, па Дзяржынску ўключаем у ЖБК ахвотных пабудаваць трохпакаёўкі, што стаяць на чарзе з мінулага і гэтага года, 1-2-пакаёвыя кватэры — з 2010-га. Мы праводзілі апытанне наконт паляпшэння жыллёвых умоў, высветлілася, што ўсе, хто хацеў, ужо ўступілі ў кааператывы ці атрымалі ўчасткі для індывідуальнага будаўніцтва.

Гэта таксама станоўча ўплывае на дэмаграфічную сітуацыю. Тры гады таму нараджальнасць перавысіла смяротнасць. Такіх рэгіёнаў на Міншчыне тры: Мінскі, Дзяржынскі раёны і горад Жодзіна. Сур'ёзна працуем над аховай здароўя, пастаянна ставім задачы і пацвярджаем іх фінансава — мець усе неабходныя сродкі дыягностыкі, каб хутка, якасна ўстанаўліваць дыягназ і праводзіць лячэнне. Гэта таксама не апошні фактар у захоўванні здароўя і працягласці жыцця насельніцтва.

***— Мікалай Іванавіч, у вас пад бокам моцны канкурэнт — Мінск, які пераманьвае кадры. Як змагацца з гэтай з'явай?***

— Сёння сапраўды ў нас больш рабочых месцаў, чым зарэгістравана беспрацоўных. Недахоп рабочай сілы адчуваецца, і ў наступныя гады будзе толькі павялічвацца. Але з Мінска пераходзяць работнікі на новыя вытворчасці, асабліва на тыя, што выносяцца з горада. Сёння міграцыя кадраў ёсць як з Дзяржынска ў сталіцу, так і наадварот. У вялікім мегаполісе зняць ці пабудаваць жыллё складаней. Таму мінчане ўсё ахвотней прыязджаюць да нас на работу. Гэта натуральны працэс. У кожнага ёсць права выбару. Акрамя гэтага, актыўнае развіццё ўласнай прамысловай базы, рост узроўню заробкаў робяць Дзяржыншчыну ўсё болей прывабнай і для жыхароў суседніх раёнаў — Уздзенскага, Валожынскага, Стаўбцоўскага.

***— Сістэма адукацыі Дзяржынскага раёна таксама адна з лепшых у вобласці. Гэта агульнапрызнаны факт ....***

— Так, аддзел адукацыі пастаянна займае высокія месцы ў абласных спаборніцтвах, у мінулым навучальным годзе — гэта другое месца ў конкурсе «За дасягненне высокіх паказчыкаў». Ва ўстановах адукацыі ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы, каб выхаванцы раслі інтэлектуальна і фізічна развітымі. Школы, гімназіі аснашчаны камп'ютарамі, найноўшымі сродкамі навучання, у тым ліку інтэрактыўнымі: выкарыстанне крэйды — гэта ўжо ўчарашні дзень.

Пра ўзровень падрыхтоўкі сведчыць той факт, што ў вышэйшыя навучальныя ўстановы пастпае штогод звыш 80% выпускнікоў гімназій. Напрыклад, летась гімназія № 1 г. Дзяржынска пабіла ўсе рэкорды: толькі тры навучэнцы паступілі ў каледж, астатнія — у ВНУ. У нас вялікая колькасць пераможцаў прадметных алімпіяд розных узроўняў — 39 за леташні навучальны год, навукова-практычных канферэнцый — 61 дыплом, у тым ліку 43 на ўзроўні рэспублікі, творчых конкурсаў (230 узнагарод). Для таго каб стымуляваць выхаванцаў і педагогаў на далейшую плённую працу, сёлета спецыяльнымі прэміямі выканкама ўзнагароджаны 103 вучні і 52 настаўнікі на суму 135 мільёнаў рублёў.

Трымаюць высокую марку і ўстановы культуры, пазашкольнага выхавання. Так, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Дзяржынскага раёна прызнаны пераможцам абласнога спаборніцтва.

***— Які аб'ект, на ваш погляд, найбольш сацыяльна значны для раёна?***

— У дачыненні сельскай гаспадаркі гэта — стварэнне агракамбіната Дзяржынскі. Сюды далучылі транспартнае прадпрыемства, чатыры гаспадаркі, якія пераўтварылі ў філіялы, рыбгас, Негарэльскі камбінат хлебапрадуктаў. Тут замкнуты цыкл вытворчасці мяса птушкі і атрымання ўласных кармоў, іх перапрацоўка. А гэта паўплывала на рэнтабельнасць і патанненне прадукцыі, якая выпускаецца. Што ў канчатковым выніку выгадна і вытворцам, і пакупнікам.

# НЕ КОЖНАМУ ВЫПАДАЕ ШАНЦ...



**Трактарыста-машыніста філіяла «Пяцігор'е» Віталя ЛАСІЦКАГА добра ведаюць не толькі ў раёне, але і ў вобласці. У 2011-м Віталь Алегавіч заняў першае месца, а летась стаў другім сярод маладых экіпажаў камбайнераў на абласных «Дажынках». Сёлета ён будзе прадстаўляць Міншчыну ў моладзевай катэгорыі на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы працаўнікоў сяла «Дажынкі-2013» у Жлобіне.**

Працуе Віталь Ласіцкі старшым камбайнерам без памочніка. Сёлета намалаціў 1895 тон збожжа на камбайне «Джон Дзір-9640» з шасціметровай жняяркай.

— Віталь Алегавіч прыйшоў да нас яшчэ зусім маладым, спачатку вучыўся працаваць на трактары, затым даверылі яму камбайн. Цяпер за ім замацаваны і камбайн, і трактар «Амкадор-320». Дужа любіць тэхніку. Я сказаў бы, у яго вельмі беражлівае і трапяткое стаўленне да машын, агрэгатаў, нібы да жывых істот. Шмат увагі Віталь надае тэхнічнаму абслугоўванню, рамонту тэхнікі, карпатліва рыхтуе яе да сяўбы, жніва. Таму і служыць яна спраўна, без паломак і прастояў, што ўплывае і на выніку працы, — лічыць дырэктар філіяла Пётр Ярыжэнец.

Віталь нарадзіўся ў суседняй з Забалаццем вёсцы, жонка таксама тутэйшая, з філіяла «Праўда-Агра». Кіраўніцтва «Пяцігор'я» выдзеліла маладой сям'і дом з усімі выгодамі. Жыві ды радуйся: ёсць дах над галавой, любімая работа, добрыя заробкі. Але самае вялікае шчасце — двое дзетак: сынок нарадзіўся літаральна два месяцы назад.

— У нас усе камбайнеры стараліся на жніве, усе яны прафесіяналы высокага класа. Чаму пашанцавала менавіта мне? Нават не ведаю, проста пашанцавала, — сціпла адказвае на маё пытанне хлопец.

Што тычыцца рэспубліканскіх «Дажынак», то трапіць туды, як лічыць мой суразмоўца, — вялікі гонар. Ды і павучыцца там будзе ў каго: на свята прыедуць славутыя хлебаробы, сапраўдныя віртуозы сваёй справы. А наконт падарункаў? Вядома, прыемна іх атрымліваць, але, зрэшты, не гэта галоўнае. Галоўнае для майго героя — удзел у фестывалі такога маштабу. Не кожны раз і не кожнаму выпадае такі шанц.

# ЖЫЦЦЁ КІПІЦЬ, ЖЫЦЦЁ ВІРУЕ...

## або Які ён, ідэальны аграгарадок?

**Вёска Чаркасы, што ў Дзяржынскім раёне, — цэнтр аднайменнага аграгарадка. На днях населенаму пункту споўнілася 325 гадоў. Менавіта пра гэта сведчаць першыя летапісныя звесткі. З нагоды юбілею ў Чаркасах адбылося свята вёскі, якое сабрала як мясцовых жыхароў, так і суседзяў. І кожны прыехаў не з пустымі рукамі: хтосьці прывёз цікавыя выставы, а нехта — вясёлыя песні. Свае работы прадставіў майстар па пляценні з лазы Міхаіл Сямілетаў, вырабы з гліны — Андрэй Шабар, драўляныя макеты цэркваў — рэзчык па дрэве Фёдар Асокін, а карціны — першы дырэктар Дома культуры (тады сельскага клуба) Антон Крэсік. Літаральна зачаравалі прысутных тканыя паясы ў выкананні жанчын з Волмы, Чарнікоўшчыны, Чаркасаў, Станькава, Вялікага Сяла.**

— Займацца гэтай справай мы пачалі нядаўна — тры-чатыры месяцы таму. Ткацтву паясоў навучыла майстрых Таццяна Іванаўна Уласава. А мастак Наталля Ермаловіч распрацавала каляровую гаму, характэрную для нашага рэгіёна, што калісьці выкарыстоўвалася мясцовымі ўмельцамі. Яна незвычайная: выканана ў чорных, чырвоных, зялёных тонах, — распавяла намеснік па рамеснай дзейнасці Станькаўскага Дома майстроў Анжаліка Прахарэвіч. — Пры вырабе выкарыстоўваюцца толькі натуральныя фарбы. Каб саткаць пояс, патрэбны тыдзень, а кошт яго — трыста тысяч рублёў.

Павіншаваць юбіляраў прыехаў і ўнікальны гурт «Пава» са сталіцы. Гурт выконвае сучасную музыку на аснове сярэдневяковага, еўрапейскага, але перш за ўсё беларускага фальклору. Менавіта гэты музычны калектыў знайшоў і ўзнавіў шырокі пласт айчыннага фальклору, вынес яго на шырокую публіку. Прадзюсар Валерый Шаўчэнка нарадзіўся на Сахаліне, жыў на Чукотцы, затым пераехаў у Беларусь.

— Беларускі фальклор — сапраўдная крыніца мудрасці, ён адлюстроўвае душу народа. Калі ўпершыню яго пачуў, быў літаральна зачараваны. Цяпер нас ахвотна прымаюць у Польшчы, Украіне і, безумоўна, у Беларусі. Радуе, што людзі вяртаюцца да сваіх каранёў, вытокаў. Нам цікавыя такія мерапрыемствы, што сёння праходзяць у Чаркасах. Яны не навязаны зверху, ініцыятыва ідзе непасрэдна з месца.

— Гэта не проста гулянне. Найперш мы ставілі за мэту нагадаць пра цікавую і багатую гісторыю вёскі, людзей, што жылі і жывуць на гэтай зямлі, — распавёў дырэктар Чаркаскага Дома культуры Кірыл Шык. — Шмат нашых землякоў палягло на франтах Вялікай Айчыннай вайны. На тэрыторыі Дома культуры ўстаноўлены помнік загінулым партызанам. Адна з вуліц названа ў гонар Андрэя Шкурдзюка, які падарваўся на міне пры выкананні задання. Менавіта тут ён жыў. Цяпер гэта адна з самых вялікіх вуліц у вёсцы, з новымі двухпавярховымі дамамі. Нядаўна там праводзілі свята, прысвечанае партызану. Падчас мерапрыемства распавялі пра гэтага чалавека, яго гераічны ўчынак.

Нядаўна ў Чаркасах адбылося свята беларускай мовы, у якім прынялі ўдзел не толькі мясцовыя жыхары, але і госці з ўсяго раёна. Ва ўрачыстых абставінах узнагародзілі людзей, якія размаўляюць на роднай мове не толькі ў паўсядзённым жыцці, але і на працы, у школе.

Як адзначыў Кірыл Іванавіч, мясцовыя культработнікі працуюць для ўсіх катэгорый насельніцтва, не дзеляць на асобныя групы ветэранаў, моладзь, дзяцей, інвалідаў. Для калясачнікаў зрабілі нават пад'езды, каб яны без праблем змаглі трапіць у Дом культуры.

Дом культуры ахвотна наведваюць людзі сталага і сярэдняга ўзросту, моладзь, дзеці. Менавіта тут яны выказваюць работнікам свае прапановы наконт работы тых ці іншых службаў, арганізацый, увядзення новых паслуг, удасканалення арганізацыі адпачынку. Работнікі культуры занатоўваюць усе меркаванні і перадаюць іх у сельскі Савет, дэпутатам, кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый. Так бы мовіць, служаць пасрэднікамі паміж уладай і мясцовымі насельнікамі.

— Мы імкнёмся, каб людзі адчулі сябе сапраўднымі жыхарамі вёскі, маглі сказаць з гонарам: «У нас праходзяць цудоўныя святы, прыязджаюць цудоўныя артысты, нам ёсць куды схадзіць, нам падабаецца тут жыць, працаваць і адчуваць сябе патрыётам і грамадзянінам Рэспублікі Беларусь менавіта праз сваю малую радзіму», — канстатуе Кірыл Шык. — Такая задача стаіць перад Домам культуры, і мы яе выконваем. Дапамагаюць нам і райвыканкам, і сельскі Савет, і агракамбінат «Дзяржынскі», і філіял «Фалько-Агра». Працуем цесна і з бібліятэкай, і нават з поштай. У вёсцы немагчыма працаваць паасобку, тут кожны адзін за аднаго гарой.

— Сённяшняе свята — адна з формаў сумеснай выхаваўча-патрыятычнай работы, скіраванай у тым ліку і на моладзь, — гаворыць старшыня Фаніпальскага сельскага Савета Уладзімір Лобач. — У Чаркасах пражываюць 642 чалавекі, у тым ліку 129 маладых людзей, таму тут шмат дзяцей. У будынку пачатковай школы адкрылі дзіцячы садок, а малых возяць аўтобусам у Дзяржынскую школу.

— Сапраўды, дзяцей у аграгарадку шмат, — падтрымлівае размову мастацкі кіраўнік Марына Раманенка. — Для іх працуюць разнастайныя гурткі, клуб «Крынічка», дзе яны могуць рэалізаваць свае мары, жаданні, раскрыць здольнасці. І калі параўнаць першыя дзіцячыя творчыя спробы і цяперашнія — то гэта як неба і зямля.

Варта дадаць, што ў аграгарадку любяць чытаць, пра што сведчыць колькасць наведвальнікаў мясцовай бібліятэкі. Сёння тут 468 чытачоў розных узростаў.

— Бацькі прыходзяць з малымі дзеткамі, для якіх падбіраем літаратуру з улікам іх узросту. А самай старэйшай чытачцы, бабулі Антаніне, 92 гады. Яна аддае перавагу раманам. Кнігі для яе бярэ ўнучка, — расказвае загадчыца бібліятэкі Лілія Навіцкая. — У бібліятэцы падключаны інтэрнэт, аказваем платныя паслугі, якімі ахвотна карыстаюцца нашы наведнікі.

Ва ўстанове вялікія кніжныя фонды, якія пастаянна папаўняюцца. Акрамя таго, Лілія Іванаўна па індывідуальных заказах прывозіць літаратуру з Дзяржынскай раённай бібліятэкі ў часовае карыстанне.

Словам, у аграгарадку жыццё віруе. Тут умеюць не толькі працаваць, але і адпачываць з карысцю.

■ Будзем з хлебам

# КАРАВАЙ НА СТАЛЕ, СПАКОЙ У ДУШЫ

**Сёлета хлебаробы Дзяржынскага раёна сабралі 40 цэнтнераў з гектара збожжавых, а валавы збор склаў амаль 72 тыс. тон з плошчы каля 19 тыс. гектараў.**



— Многа гэта ці мала? — цікаўлюся ў першага намесніка старшыні райвыканкама — начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоля Ліневіча.

— Гэты год быў не самы лепшы для азімых культур, пасля зімоўкі давялося перасеяць іх на плошчы каля 3 тыс. гектараў. Менавіта позняя вясна паўплывала на стан азімых. Адразу пасля сходу з палёў снегу ў канцы красавіка наступіла гарачае надвор'е і расліны пайшлі рэзка ў рост. Таму адпаведнага кушчэння, як яно павінна быць, не адбылося. Ураджай яравых атрымалі большы, чым азімых, што і вызначыла канчатковую ўраджайнасць па раёне. Летась ураджайнасць была вышэйшая — 49 цэнтнераў на круг. Але з улікам умоў надвор'я і сёлетнія вынікі нядрэнныя, — лічыць Анатоль Канстанцінавіч. — Па ўраджайнасці мы ўвайшлі ў пяцёрку раёнаў Мінскай вобласці. На сённяшні дзень выканалі дзяржаўны заказ.

Варта дадаць, што Дзяржынскі раён займае асаблівае геаграфічнае становішча. Тут знаходзіцца самы высокі ў Беларусі пункт — гара Дзяржынская. Раён адрозніваецца і па ўрадлівасці зямлі: у паўднёвай частцы бал складае каля 28, а ў паўночнай — дзесьці 34. Шмат глiністых участкаў, якія па сваім хімічным саставе параўнальныя з віцебскімі. Пасля моцных дажджоў і веснавога разводдзя даводзіцца чакаць, пакуль падсохне. Такім чынам зацягваюцца тэрміны правядзення тых ці іншых сельгасработ. Але, нягледзячы на складанасці, жніво прайшло ў сціслыя тэрміны — за 15-20 дзён. Бясспрэчна, дапамагла добрая падрыхтоўка і арганізацыя працы. Ва ўборцы ўдзельнічала звыш 100 камбайнаў, больш за 270 механізатараў. Дапамагалі і студэнты сельскагаспадарчых навучальных устаноў, работнікі прамысловых прадпрыемстваў. Асаблівая ўвага была нададзена спраўнасці сушыльнай гаспадаркі, якая дзейнічала без прастояў.

— Акрамя таго, мы падтрымліваем сувязі з навукай: кіраўнікі гаспадарак, спецыялісты раённага звяна прымаюць удзел ва ўсіх семінарах, мерапрыемствах Інстытутаў раслінаводства і жывёлагадоўлі. Затым ужо на месцах яны праводзяць кансультацыйныя зборы з агранамічнай, заатэхнічнай службамі, такім чынам павышаючы іх прафесійны ўзровень, — распавёў Канстанцін Ліневіч. — А кадры, бясспрэчна, — наш галоўны патэнцыял. Па выніках уборкі ў нас вызначыліся 3 камбайнавыя экіпажы-двухтысячнікі, каля 30 аднатысячнікаў.

Спаборніцтва паміж удзельнікамі ўборкі — добры стымул паспяховай працы. Сёлета яно, як і папярэднія гады, праводзілася сярод экіпажаў камбайнаў, вадзіцеляў на адвозцы збожжа і машыністаў зернесушыльных комплексаў. Напрыклад, на рахунку маладога вадзіцеля з філіяла «Праўда-Агра» адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Дзяржынскі» Дзмітрыя Бірылы — звыш 3 тыс. 200 тон адвезенага збожжа. Антон Кудрыцкі і Віталь Куніцкі з гэтай жа гаспадаркі намалацілі адпаведна 2 тыс. 948 і 2 тыс. 817 тон збожжа. Трэці вынік — у камбайнера Віталя Ласіцкага з філіяла «Пяцігор'е» агракамбіната «Дзяржынскі».

Да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці будуць падведзены вынікі спаборніцтва сярод сельгасарганізацый па атрыманні збожжа з аднаго бала-гектара.

На свяце, вядома, будуць ушаноўваць і ўсіх хлебаробаў, якія найбольш вызначыліся падчас уборачнай кампаніі, а таксама спецыялістаў, інжынераў, аграномаў, кіраўнікоў вытворчых падраздзяленняў. ■

■ Міншчына спартыўная

# «ЯЗЫЛЬСКАЯ ДЗЯСЯТКА» ЗАПАЛЬВАЕ «ЗОРКІ»

**У Старых Дарогах 28 верасня стартуе XXVI Нацыянальны фестываль бегу «Языльская дзясятка», прысвечаны Дню работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці.**

Пераможцы і прызёры (на ўсіх дыстанцыях і ва ўсіх узроставых групах) будуць узнагароджаны прызамі, медалямі і дыпломамі. А пераможцы (10 жанчын і 10 мужчын) у абсалютным першынстве атрымаюць грашовыя прызы. За першае месца — па 6 млн рублёў, у намінацыі «Карпаратыўны забег» — за першае і другое месцы па 2 млн рублёў.

Дадам, гісторыя фестывалю пачынаецца з 1988 года, калі ў вёсцы Языль на Старадарожчыне прайшоў звычайны лёгкаатлетычны прабег. За гэты час «Языльская дзясятка» ператварылася ў сапраўднае свята, якое кожны год запальвае новыя «зоркі» на небасхіле айчыннага спартыўнага алімпу. Кола ўдзельнікаў фестывалю штогод пашыраецца, прыцягваючы ўсё больш замежных гасцей. ■

Віншуем работнікаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў рэспублікі, Дзяржынскага раёна і асабліва агракамбіната «Дзяржынскі»
са святам завяршэння жніва — «Дажынкамі»!
Нягледзячы на досыць складаныя сёлетнія ўмовы надвор'я, вы справіліся з пастаўленымі задачамі і з адмысловымі вынікамі падышлі да святкавання «Дажынак». Дзякуй вам, шаноўныя, за добры ўраджай, за тое, што на нашых сталах будзе, як той казаў, і хлеб, і да хлеба! Зычым і налета атрымаць высокія вынікі, а таксама новыя ўзнагароды за сваю высакародную працу! Шчасця, здароўя, поспехаў ва ўсіх справах вам, хлебаробы! Ладу, дабрабыту, росту вашым сем'ям!
*Калектыў ТАА «ФаніпальІнвестІнжынірынг»*
УНП 690557978

# ААТ «Крутагор'е-Петкавічы»: БРАЦЬ МАЛАКО БУДЗЕМ ПА-НОВАМУ



Механізатары Уладзімір КОПАЦЬ, вадзіцелі Мікалай КУЛІК, Фёдар ГЛЕБАЎ і Сяргей ХАБЛОЎ нарыхтоўваюць кукурузу на сілас. Механізатар Аляксей ПЯТРЭЙКІЎ загружаецца з поля, каб падвезці кармы на ферму. Плошча ўборкі кукурузы ў вёсцы Клыпаўшчына — 250 га. Адзін з іх працуе ў таварыстве тры гады, а нехта — ужо больш за 30. Жывуць — у суседніх вёсках, тых жа Вялікіх Навасёлках. Усе на працы на пачатку восьмай, а дома — бліжэй да 21.00.

**ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» некалі было звычайным калгасам, які тройчы перажыў рэфармацыю і цяпер стаў магутным сельскагаспадарчым прадпрыемствам Мінскай вобласці. У раслінаводстве, павышэнні ўраджайнасці таго ж збожжа налета давядзецца крутагор'еўцам актыўна папрацаваць. А ў жывёлагадоўлі вось-вось будуць завершаны ўсе будаўніча-мантажныя работы па малочнатаварнай ферме і малочнатаварным комплексе. Безумоўна, гэта яшчэ больш умацуе добрыя вынікі рэнтабельнасці таварыства.**

## Ад поля да прылаўка

ААТ «Крутагор'е-Петкавічы», што ў Дзяржынскім раёне, пераўтварылася яшчэ ў 2011 годзе. Раней гэта быў калгас імя Дзяржынскага, пасля сельскагаспадарчае калектыўнае прадпрыемства, затым сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў, і, нарэшце, ААТ, якое ўвабрала ў сябе частку калгаса «Чырвоная зорка» і частку гаспадаркі «Райаграсэрвіса». Цяпер ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» размяшчаецца на тэрыторыі амаль 7,4 га вакол горада Дзяржынска. Такое размяшчэнне лічыцца геаграфічна і эканамічна выгадным: тут праходзяць чыгунка і шаша ў напрамку Масква—Брэст.

— Гаспадарка ў раёне з'яўляецца адной з валаўтваральных, уваходзіць у колькасць базавых гаспадарак Мінскай вобласці, — расказвае **дырэктар ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ**. — Рэнтабельнасць у цэлым па гаспадарцы складае 36,7 працэнта. Фактычна мы маем зараз замкнёны цыкл вытворчасці. Што называецца, ад поля да прылаўка. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі складаюць каля 6,7 тыс. га, ралля — 4,8 тыс. га, сад — 25 га, лугі — 1,9 тыс. га. Землі сельгасугоддзяў ацэньваюцца ў 37,5 бала, ралля — у 36,4.

Мы сеем каля 1230 га кукурузы, 2300 га — зерневых, 400 га — рапсу, 250 га — бульбы. Зерневыя дакупаем, паколькі для нашага пагалоўя патрабуецца 18 тыс. т зерня ў год, што ўдвая больш, чым мы можам вырасціць. А таму дзяржзаказ па зерню сёлета выканалі ўсяго на 300 т. У гаспадарцы ёсць свая лінія перапрацоўкі насення рапсу. Поўнасцю забяспечваем сябе рапсавай макухай і яшчэ прадаём частку іншым гаспадаркам раёна. Аднак набываем камбікорм, шрот. Перад такімі буйнымі гаспадаркамі, як наша, ставіцца задача максімальна забяспечваць сябе ўсім неабходным. Вядома, мы будзем імкнуцца да гэтага, хоць зямлі для рэалізацыі амбіцыйных планаў малавата. Будзем рабіць стаўку выключна на павышэнне вытворчасці, бо тут рэзерв якраз ёсць.

Павысіць ураджайнасць на 5-10 ц — цалкам магчыма, калі прыкласці крыху намаганняў. Ураджайнасць рапсу сёлета склала 33 ц/га, зерневых — 38 ц/га, што, па вялікім рахунку, няблага для гэтага не надта ўраджайнага з-за ўмоў надвор'я года. Аднак, аб'ектыўна кажучы, для нашай гаспадаркі гэта слабы вынік. На наступны год ставіцца задача атрымаць мінімум 50 ц/га тых жа зерневых. Прычым без асаблівых інвестыцый, выключна за кошт павышэння тэхналагічнай і вытворчай дысцыпліны, ідэальнага вытрымлівання тэхналогіі. Толькі за кошт гэтага мы павялічым ураджайнасць на 5-7 цэнтнераў, плюс — добрыя ўгнаенні, сродкі абароны.

Да таго ж зямлю ў нас кожны работнік любіць. Хоць адной любові тут будзе недастаткова. Ёсць і аб'ектыўныя ўмовы, якія мы не можам недаацэньваць. Гаспадарцы патрэбна не менш як 900 тыс. т дызельнага паліва ў год. Бензіну мы расходуем амаль у 9 разоў менш. Між тым кошт дызельнага паліва расце, а закупачныя цэны на мяса і малако — не.



Дырэктар ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ.



Механізатар Аляксей ВЯЛІЧКА на гэтым трактары і сее, і косіць, і ўбірае... За 15 гадоў працы ў гэтай гаспадарцы Аляксей неаднойчы бываў на «Дажынках» за выдатныя вынікі жніва і перавозку кармоў. Летась, напрыклад, як удзельнік рэспубліканскіх «Дажынак» атрымаў за жніво тэлевізар. Сёлета Вялічка зноў у перадавіках сярод камбайнераў на ўборцы зерневых.



Загадчыца фермы Ганна ШЫЛЬКО.

Пагалоўе свіней складае зараз 22,5 тысячы, буйной рагатай жывёлы — 5980, дойны статак — 1890. Вырабляем 36,5 тыс. т малака ў дзень. Наогул у таварыстве працуе 5 комплексных брыгад, у склад якіх уваходзяць 7 жывёлагадоўчых ферм і 1 свінаводчы комплекс. Ёсць забойны і каўбасны цэхі. 60 працэнтаў мясной прадукцыі перапрацоўваецца ў гаспадарцы і рэалізуецца праз магазіны. Два магазіны знаходзяцца ў Фаніпалі, па адным — у Дзяржынску і Петкавічах.

Ёсць у нас і цэх па вытворчасці камбікармоў, сталярны цэх, тры зернесушыльныя пункты, бульбасартавальны пункт, склады для мінеральных угнаенняў, захоўвання сена, камбікорму, зерня і бульбы. Сёлета мы купілі за ўласныя сродкі тэхніку айчыннай і замежнай вытворчасці — энерганасычаны беларускі трактар 3522, высокавытворчую жняярку для ўборкі кукурузы на зерне да імпартнага камбайна «Лексіён», два кормараздатчыкі, здрабняльнік саломы, размеркавальнік мінеральных угнаенняў, малакавоз, два самазвалы МАЗ. Толькі за мінулы месяц у тэхніку інвеставалі каля 1 млрд рублёў уласных сродкаў.

## Робат і падоіць, і абследуе

За ўласны кошт ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» ажыццяўляе і рэканструкцыю рабатызаванай малочнатаварнай фермы ў вёсцы Дзягільна. Толькі самі робаты для абслугоўвання кароў каштавалі 6,5 млрд рублёў. Плюс — іншае спадарожнае абсталяванне, будаўніцтва новага памяшкання фермы. Увесь праект па рэканструкцыі абыдзецца таварыству недзе ў 12,5 млрд рублёў. Плануецца, што абедзве чаргі запрацуюць ужо ў кастрычніку.

На момант візіту журналістаў «Звязды» будаўнічыя работы былі цалкам завершаны, ішоў мантаж абсталявання. Першая чарга па абслугоўванні 162 галоў буйной рагатай жывёлы ўжо працавала. Робат выконвае, па сутнасці, усе неабходныя функцыі — пачынаючы ад кармлення, масажу вымені і да непасрэдна дойкі і кантролю якасці малака. Кантралююць працэс два чалавекі — жывёлавод і яго памочнік.

— Наша старая ферма пакуль яшчэ будзе працаваць, — удакладняе **галоўны інжынер Аляксандр КІСІЦКІ**. — Аднак паступова, з запускам другой чаргі, будзем прывучаць да рабатызаванай дойкі другую партыю маладых кароў. Наогул прынцып работы робата (нямецкай вытворчасці, айчыннай зборкі) заснаваны на нармальным рэфлексе. Карова ў такіх умовах адчувае сябе цалкам спакойна, паколькі, груба кажучы, не яна падладжваецца пад тэхніку, а тэхніка пад яе. Карова, што называецца, прыходзіць есці — па камбікорм. І ў гэты момант адбываецца дойка. Рагуля высокай удойнасці прыходзіць на даенне 4 разы, менш удойная — 3 разы. Робат не пачне дойку, калі не наспеў час. Тэхніка захоўвае ўсю інфармацыю па кожнай карове: колькі малака яна дала ў мінулы раз, якой якасці малако. Штораз малако «даследуецца», і калі яго якасць і бяспека аказваюцца нездавальняючымі (скажам, з перавышэннем дапушчальнага ўзроўню антыбіётыкаў), робат збірае яго ў асобную ёмістасць, а на камп'ютары пазначае, што ў каровы праблема са здароўем...

Цягам наступных месяца-двух будзе запаўняцца і новы малочнатаварны комплекс замкнёнага цыкла на 720 галоў у вёсцы Вялікія Навасёлкі. Зараз тут таксама працуе толькі першая чарга на 360 галоў (300 галоў — дойны статак). Для ўзвядзення і запуску гэтага комплексу гаспадарка прыцягвала не толькі ўласныя фінансавыя рэсурсы, але і крэдытныя сродкі.

**Набыты сёлета трактар «Беларус 3522» пакуль адзін у гаспадарцы. Да новай тэхнікі ў механізатара Яўгена КАЛОДНІКА пакуль прэтэнзій няма. «Мой папярэднік на гэтым трактары зусім няшмат папрацаваў, — не знасіў яшчэ, — жартуе Яўген. — З лета тэхніка перайшла да мяне. Зараз я сею азімую пшаніцу. Далей трэба будзе палі рыхтаваць да зімоўкі».**



## Аздараўленне ёсць, жыллё будзе

Ураджайнасць зерневых сёлета была сціплай, аднак асноўныя паказчыкі па жывёлагадоўлі нават прыраслі ў параўнанні з мінулым годам. Наогул самым рэнтабельным ва ўсіх падобных гаспадарках былі і застаюцца вытворчасць свініны і малака. Так, рэнтабельнасць свініны ў ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» склала 17 працэнтаў, а малака — 53 працэнты.

— Толькі для пагалоўя свіней нам патрэбна каля 18 тыс. т камбікорму, а таму мы зацікаўлены трапіць у дзяржаўную праграму па закупцы зерня, якога нам не хапае, — адзначае бухгалтар Алена ЯНУШКА. — Плануем атрымаць з бюджэту на гэтыя патрэбы каля 10 млрд рублёў. Без такой падтрымкі ажыццявіць закупку будзе вельмі складана.

**— Якія дадатковыя расходы панесла ваша гаспадарка ў сувязі з неабходнасцю прафілактыкі распаўсюджвання афрыканскай чумы?**

— Дадатковыя расходы былі нязначнымі, паколькі мы свае комплексы наогул трымаем у самых добрых умовах з пункту гледжання санітарна-эпідэміялагічных нормаў. Ёсць на нашых комплексах і належныя сродкі дэзынфекцыі, і патрэбныя ветпрэпараты, і штат ветурачоў укамплектаваны. Наша таварыства вылучаецца адмысловым падыходам да мер бяспекі па ўтрыманні жывёл. Фактычна ў ліку дадатковых мер толькі паставілі дадатковы шлагбаум на адным з комплексаў і другую лінію агароджвання. А таксама звярнулі большую ўвагу на саміх работнікаў: раней яны маглі на абедзенны час пакідаць месца працы, а зараз застаюцца на ферме. Штодня выкарыстоўваецца чыстае адзенне. Зразумела, самім работнікам забаронена трымаць свойскую жывёлу, і наогул у межах 5 км ад гаспадаркі няма пагалоўя ў мясцовых жыхароў.

**— Гаспадарка ўдзельнічае ў будаўніцтве жылля для сваіх работнікаў?**

— З мінулага года будаўніцтва жылля ажыццяўляем толькі за ўласныя сродкі таварыства. На стадыі завяршэння будаўніцтва зараз знаходзіцца 12-кватэрны дом у аграгарадку Петкавічы — гэты дом узводзіцца з прыцягненнем крэдытных сродкаў. Крэдыт прадастаўлены пад 3 працэнты на 40 гадоў. Паралельна будуюцца два аднапавярховыя дамы прысядзібнага тыпу (гэта ўжо цалкам за ўласныя сродкі гаспадаркі) у вёсцы Дзягільна для работнікаў малочнатаварнай фермы. Дарэчы, чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў у нас невялікая. Фактычна ўсе, каму неабходна службовае жыллё, яго атрымалі ці вось-вось атрымаюць.

**— Што ўключае ў сябе сёння сацпакет?**

— За адпрацаваны месяц супрацоўнік мае права на атрыманне 30 л малака і 8 кг мяса па сабекошце. Раз на год падчас выхаду ў водпуск кожнаму работніку — а іх у нас 460 — вылучаюцца сродкі ў памеры 10 працэнтаў ад гадавога фонду заработнай платы. Сёння гэта ад 5 да 7 мільёнаў рублёў. На ўсе пуцёўкі, якія раён прапануе для санаторна-курортнага лячэння, мы выдаткоўваем свае даплаты, і раз на год работнікі могуць прайсці аздараўленне абсалютна бясплатна. Набываем і курсоўкі для праходжання лячэння і рэабілітацыі ў Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння, што ў Мінску.

Наогул у склад таварыства ўваходзяць 23 вялікія і малыя населеныя пункты. На тэрыторыі пражывае амаль 950 сем'яў, ёсць дзіцячы садок і школа. У якасці шэфаў прапануем падарункі дзецям да свят, а самой школе — агародніну. Малако і мяса школа і садок набываюць у нас за кошт раённага бюджэту. Матулям, якія павялі сёлета ў школу першакласнікаў, дапамаглі з набыццём школьных прылад — вылучылі на гэтыя мэты па 600 тысяч на дзіця.



Галоўны бухгалтар Ірына КРЫВАРОТ і бухгалтар Алена ЯНУШКА праводзяць зверку разлікаў па пастаўшчыках.

## Каўбаска з гарантыяй

*У 1992 годзе пачаў працаваць каўбасны цэх. За чатыры апошнія гады адгрузка гатовай прадукцыі вырасла ўдвая. Штодня цэх перапрацоўвае і адгружае каля 3 т мяса і мясных вырабаў. Вытворчыя магутнасці задзейнічаны поўнасцю.*

*— Мы пакуль не маем тэхнічных магчымасцяў для імклівага нарошчвання вытворчасці, — удакладняе начальнік мяса-каўбаснага цэха Марына ХАМЁНКА. — Калектыў — усяго 20 чалавек. Якасць і бяспека нашай прадукцыі гарантаваны. Праверкі ажыццяўляе дзяржынская санітарна-эпідэміялагічная служба, а раз у паўгода — Інстытут мяса-малочнай прамысловасці ў Мінску. Мы не выкарыстоўваем ніякіх штучных дабавак, не дадаём сою. Прадукцыю бяруць на рэалізацыю прыватнікі, дзяржгандаль Дзяржынска, Слуцка і Узды. Як паказвае работа фірменнага гандлю, нашы мяса і каўбасныя вырабы — усяго каля 60 найменняў — карыстаюцца вялікім попытам.*



Прадавец у фірменным магазіне Дар'я БУРАЯ.



Укладальнік фаршу Святлана АХРЫМЕНКА і рабочы Вячаслаў БАРКОЎСКІ.

УНП 600112675

# Што было, што ёсць, што будзе

## філіял «Фалько-Агра» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі»

### ЗБЕРАГЧЫ МІНУЛАЕ, КАБ НАБЫЦЬ НОВАЕ

***Гісторыя філіяла «Фалько-Агра» адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат Дзяржынскі» пачалася ў 1927 годзе, калі мясцовыя сяляне аб'ядналіся ў калектыўную гаспадарку. За гэты час яна неадночы рэарганізоўвалася. У 1933-м на базе саўгаса «ВязаньФаніпаль» стварылася Фаніпальская машынна-трактарная станцыя. Гаспадарка была аднаўлена пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 2003-м калгас імя Фалько быў перайменаваны ў вытворчы сельскагаспадарчы кааператыў «Фалько-2003», а ў 2007- м — у філіял адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Дзяржынскі». Да філіяла далучылі і гаспадарчае структурнае падраздзяленне «Іскра».***

Якраз у гэты час дырэктарам філіяла прызначылі Вадзіма Кунца. На гэтую пасаду былі і іншыя прэтэндэнты. Але, відаць, не ўсе вытрымалі экзамен. У былога кіраўніка агракамбіната Сямёна Шапіры былі вельмі высокія патрабаванні да ўзроўню і прафесіяналізму кадраў. Вадзім Кунц выпрабаванне прайшоў. І гэта не дзіўна. На той час за плячыма ў Вадзіма Уладзіміравіча быў вопыт кіравання сельгаспрадпрыемствамі ў Віцебскай вобласці, а таксама добрая практыка, якую ён атрымаў у Германіі.

Сёння «Фалько-Агра» займаецца вытворчасцю збожжа, зерня кукурузы, рапсу і, акрамя таго, вытворчасцю малака і мяса буйной рагатай жывёлы.

— Які набытак застаўся ад мінулых гаспадароў? Калі параўнаць тагачаснае і цяперашняе, ці ёсць змены? — пацікавілася ў Вадзіма Уладзіміравіча.

— Калі я ўзначаліў гаспадарку, тут надойвалі за год ад каровы 4-4,5 тыс. кілаграмаў малака. Зрэшты, гэта нядрэнны паказчык. Але перад намі была пастаўлена задача выйсці на 8 тыс. кілаграмаў малака і дасягнуць ураджайнасці збожжавых 80 цэнтнераў з гектара. Мы да гэтага ідзём упэўнена, кожны год павялічваем абароты. Мінулы год надоі склалі 7300 кілаграмаў, а вытворчасць збожжа — 70 цэнтнераў з гектара.

Без перабольшвання можна сказаць, што ў філіяле дасягнулі еўрапейскага ўзроўню гаспадарання. У чым ён праяўляецца? Бясспрэчна, у паказчыках. Па-першае, тут пераходзяць на новыя тэхналогіі ўтрымання буйной рагатай жывёлы: узбуйняюцца дробныя фермы ў сучасныя комплексы з даільнымі заламі, новым абсталяваннем для таго, каб знізіць залежнасць ад цяжкай фізічнай працы. Тут стабільна выдаецца зарплата, гаспадарка ні ад каго не залежыць, сама купляе паліва, запчасткі, насенне. Тут цалкам укамплектаваны штаты, а маладых спецыялістаў, якія прыходзяць, выводзяць на новы прафесійны ўзровень. Як заўважыла, Вадзім Кунц любіць паўтараць: ведаць, умець, рабіць — самае галоўнае. Гэта датычыцца кожнага — як спецыяліста, так і механізатара.


Дырэктар філіяла «Фалько-Агра» Вадзім КУНЦ.

#### Залаты фонд — спецыялісты

У гаспадарцы вельмі сур'ёзна ставяцца да вытворчага навучання. Тут праходзяць практыку навучэнцы шматлікіх сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. За імі замацаваны вопытныя настаўнікі.

— У нас засталіся многія спецыялісты. У тым ліку і тыя, што праходзілі ў свой час практыку. Начальнік цэха механізацыі Арцём Кочатаў пасля службы ў арміі вярнуўся да нас, вельмі талковы хлопец. Начальнік цэха раслінаводства Павел Навіцкі працуе сёмы год — прафесіянал сваёй справы; галоўны эканаміст Таццяна Каўрэвіч усё жыццё ў сельскай гаспадарцы, прафесіянал высокага ўзроўню. Вельмі адукаваная і адказная галоўны бухгалтар Таццяна Кеда. Дадам, што бухгалтэрыя ў нас вельмі прафесіянальная, усе супрацоўнікі маюць вялікі вопыт і большасць з іх — вышэйшую адукацыю. Але для мяне галоўнае ўсё ж — вопыт. Калі я бачу, што чалавек выдатна спраўляецца са сваімі абавязкамі, то адукацыя не мае для мяне вялікага значэння. Начальнік цэха жывёлагадоўлі Канстанцін Дуброўскі таксама не спыняецца на дасягнутым. Дзякуючы галоўным і спецыялістам увогуле, сёння гаспадарка на добрым рахунку, у нас няма запазычанасці, добрыя заробкі. Сярэднямесячная зарплата па філіяле — 5 млн рублёў.


Галоўны заатэхнік Канстанцін ДУБРОЎСКІ і загадчыца малочнатаварнай фермы Наталля СІПАЧ.
У новых жывёлагадоўчых памяшканнях цёпла, прасторна, светла.

#### Права выбару

Бясспрэчна, не апошнюю ролю ў сельскай гаспадарцы адыгрывае і наяўнасць вольнага часу, які можна патраціць на сваё ўдасканаленне, адпачынак. Па меры магчымасці ў «Фалько-Агра» імкнуцца даць людзям выходныя дні. Праўда, у разгар сельскагаспадарчых работ зрабіць гэта цяжка, але ўсё ж адзін выходны прадастаўляецца.

— Мы не затрымліваем тых людзей, хто хоча сыходзіць. Чалавек павінен сам выбіраць сваю будучыню. Разам з тым ствараем для іх умовы, каб яны маглі добра зарабіць. У нас ёсць механізатары, якія атрымліваюць і па 20 мільёнаў, — запэўнівае мой суразмоўца.

Варта дадаць, што дах над галавой таксама стрымлівае работнікаў. Жыллё ў гаспадарцы будуецца ў асноўным за кошт банкаўскіх крэдытаў, часткова яно ўзводзіцца і за асабістыя сродкі. Жыллё службовае, але прадугледжана права яго выкупу з умовай, калі чалавек прапрацаваў не менш за 10 гадоў у агракамбінаце ці яго структурных падраздзяленнях. Калі тут працуе два ці больш члены сям'і, то для іх пры выкупе даюцца зніжкі, ільготы. Важкім аргументам у справе замацавання кадраў з'яўляецца і сацыяльны пакет, які прадугледжвае шмат якую матэрыяльную дапамогу. Паводле калектыўнага дагавора, работнікам выдзяляюцца пуцёўкі на аздараўленне; аўтатранспарт пры пераездзе на льготных умовах; тыя, хто мае асабістую падсобную гаспадарку, забяспечваюцца кармамі для свойскай жывёлы з 50-працэнтнай зніжкай. Маладыя спецыялісты, якія прыбываюць у гаспадарку, атрымліваюць пад'ёмныя. Дзейнічае шырокая сістэма прэміравання.

#### Сувязь з навукай

У гаспадарцы цесна супрацоўнічаюць з навукай. Супрацоўнікаў Інстытута аховы раслін часта запрашаюць у гаспадарку. Калі нешта робіцца не так, вучоныя даюць свае парады. Але варта дадаць, што і агранамічная служба ў філіяле вельмі адукаваная, з навукай, можна сказаць, на «ты». І тым не менш па праблемных пытаннях спецыялісты звяртаюцца да прафесіяналаў. Але часам і тыя не могуць зразумець, што адбываецца з пасевамі, чаму хварэюць, не ідуць у рост. Тады разам з тутэйшымі аграномамі навукоўцы даходзяць да сутнасці.

Як лічыць дырэктар, узровень любога прадпрыемства залежыць ад узроўню інтэлекту яго работнікаў. Ці не таму ён стымулюе наведванне спецыялістамі розных сельскагаспадарчых выставак, у тым ліку і замежных, дзе дэманструюцца лепшыя сусветныя дасягненні. Спецыялісты пабывалі ў Гановеры, Польшчы, Чэхіі, ЗША, Ізраілі, дзе перанялі лепшы вопыт, шмат карыснага і перадавога. На базе менавіта атрыманых ведаў пачалі будаваць найноўшы сучасны комплекс па вытворчасці малака.

### ПА ЛЕПШЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ СТАНДАРТАХ

У гаспадарцы практычна заканчваецца будаўніцтва малочнатаварнага комплексу на 720 галоў буйной рагатай жывёлы.

— Першую чаргу мы ўжо запусцілі, у бліжэйшы час разлічваем увесці другую чаргу і выйсці на поўную магутнасць, — распавёў начальнік цэха жывёлагадоўлі Канстанцін Дуброўскі. — Гэта будзе сучасны комплекс з найноўшым абсталяваннем: даільнай залай, беспрывязным утрыманнем жывёлы.

— Вельмі добрыя ўмовы, жывёла не хварэе і не становіцца тлустай, паколькі можа свабодна рухацца па кароўніку. Тым больш у памяшканне паступае шмат свежага паветра, няма той скучанасці, што была ў старым кароўніку. Для работнікаў таксама значна палепшыліся ўмовы працы. Раней, напрыклад, 400 кароў даілі 8 аператараў машыннага даення і два падменныя. Цяпер жа 720 жывёлін будуць абслугоўваць 6 даярак. А самае галоўнае, што яны будуць працаваць, як у горадзе, штодзень па 8 гадзін у тры змены і мець два паўнацэнныя выхадныя. Значна павысіліся і заробкі, цяпер яны атрымліваюць ад 6 да 11 млн рублёў, — зазначае начальнік комплексу Наталля Сіпач.


Аператары даення Аксана ЖЫГУНОВА і Таццяна БАЙДАК.

У перспектыве будаўніцтва яшчэ аднаго аналагічнага комплексу, што дазволіць дасягнуць замкнутага цыкла ў жывёлагадоўлі і скараціць колькасць кадраў. Цяпер у гаспадарцы налічваецца 8 жывёлагадоўчых фермаў, якія знаходзяцца на значнай адлегласці адна ад другой. І на кожнай з іх, акрамя даярак, — начныя і дзённы вартаўнікі, якія сочаць за парадкам, кантралююць сітуацыю, прымаюць ацёлы. На новым комплексе будзе задзейнічана значна менш людзей, і гэта паўплывае на прадукцыйнасць працы і заробкі.

Дадам, што на новай ферме ўсталявана даільнае абсталяванне прадпрыемства «Гомелькамплект». Чаму менавіта гэтай фірмы? Яна выйграла тэндар па кошце. «Фалько-Агра», можна сказаць, першапраходзец у апрабаванні даільнага абсталявання гомельскай вытворчасці. Спецыялісты прадпрыемства сочаць за яго работай, аналізуюць інфармацыю і адначасова ўдасканальваюць яго. Зрэшты, ужо і самі жывёлаводы, загадчыца комплексу не горш за спецыялістаў навучыліся кіраваць складанымі апаратамі.

### ДОГЛЯД ПА РЭГЛАМЕНЦЕ

Усе цяляткі філіяла «Фалько-Агра» маюць добрыя ўмовы ў рэканструяваным цялятніку. Маладняк звозяць сюды са старых фермаў. А даглядаюць іх цудоўныя жанчыны — Алена Мандрык і Алена Качанава.

— Тут знаходзяцца цяляткі ва ўзросце ад аднаго да шасці месяцаў, — уводзяць у курс справы жанчыны. — Затым іх пераводзяць у іншыя памяшканні на дагадоўванне ў групы ад 6 да 12 месяцаў і звыш 12.

Догляд будучых карміцелек — справа клопатная. Два разы на дзень кожную трэба напаіць малаком з вядзерца, а выпіваюць яны па тры літры за адзін раз. І так да трох месяцаў. А гадаванцаў у Алены Міхайлаўны і Алены Аляксандраўны па 170 і 198 адпаведна. У маладняку разнастайны і паўнацэнны рацыён, у якім прадугледжаны камбікорм, пілуцэн, мел, кукуруза, вітаміны, мікраэлементы, якаснае вяленае сена з рознымі духмянымі зёлкамі і крапівой.

— Растуць цяляты як на дражджах, — не нарадуюцца даглядчыцы. — Малыя штодзень прыбываюць у вазе па 900 грамаў, а старэйшыя і больш за кілаграм набіраюць. А ад прываг, як вядома, і заробкі нашы залежаць.

Дадам, што ў гаспадарцы займаюцца развядзеннем галштынскай пароды кароў. На сённяшні дзень гэта самая перадавая і прадукцыйная жывёла малочнага напрамку. Асемяняюць рагуль спермай галштынскіх быкоў, якую купляюць у Канадзе, Злучаных Штатах Амерыкі. І патрабуе гэтая далікатная жывёла асаблівага догляду, кармлення. На гэты конт распрацаваны цэлы рэгламент. На стэндзе ў цялятніку, дарэчы, для напаміну змешчаны ўсе гэтыя правілы.




Алена МАНДРЫК і Алена КАЧАНАВА даглядаюць цялятак, узрост якіх не перавышае шасці месяцаў.


Гэтай восенню ў гаспадарцы вырасцілі выдатную кукурузу, амаль паўсюдна яе вышыня перавышала тры метры. На такой ураджайнай плантацыі фотааб'ектыў убачыў механізатара Мікалая ЛЕБЕДЗЕВА і начальніка цэха раслінагадоўлі Паўла НАВІЦКАГА.



### САПРАЎДНАЯ КАРАЛЕВА!

Парадавала сёлета хлебаробаў добрым ураджаем кукуруза.

— Яе пасевы займаюць 1500 гектараў: 800 — на сілас, астатняе — на зерне. Ураджайнасць таксама добрая — 500 і 100 цэнтнераў з гектара адпаведна, — адзначыў начальнік цэха па раслінаводстве Павел Навіцкі.

Плануюць убраць «каралеву» палёў у гаспадарцы за месяц-паўтара.

### МАЙСТРЫ НА ЎСЕ РУКІ

У філіяле шмат разнастайнай тэхнікі, толькі адных трактароў 45. Бясспрэчна, і захоўвацца яна павінна ў адпаведных умовах. А яны тут сапраўды створаны. Нядаўна адрамантаваны механічныя майстэрні машыннага двара ў аграгарадку Чарнікоўшчына. Тут захоўваецца палова тэхнікі, што маецца ў гаспадарцы, другая частка знаходзіцца на машынным двары ў аграгарадку Чаркасы. І тут, і там ёсць запраўчная станцыя, дыспетчарскі пункт, майстэрня, такарны цэх, зварачны, слясарны. Тут не карыстаюцца паслугамі аграсэрвісу, усё робяць сваімі сіламі. У крайнім выпадку, калі ёсць неабходнасць у рамонце імпартнай тэхнікі, выклікаюць спецыялізаваныя брыгады. Гэта сябе апраўдвае. Як правіла, фірмы хутка рэагуюць на заяўку, прыязджаюць у любы дзень, у любы час сутак. І рамантуюць тэхніку даволі хутка і якасна. А гэта вельмі важна, каб не было прастояў.

### ЗА СОРАК ГАДОЎ ПРАЦЫ — НІВОДНАГА БАЛЬНІЧНАГА

У філіяле «Фалько-Агра» працуе вельмі паважаная жанчына Ада Сянькевіч. Паважаюць яе за добразычлівасць, гатоўнасць прыйсці кожнаму на дапамогу.

— Ада Васільеўна — незаменны работнік, такога кладаўшчыка, як яна, вельмі цяжка, а можа, нават і немагчыма знайсці. На рабоце яна — як толькі развіднее, і нават у выходныя дні, — так ахарактарызаваў яе дзелавыя якасці дырэктар Вадзім Кунц. —Уявіце, за больш чым 40 гадоў, што працуе ў гаспадарцы, Ада Васільеўна ні разу не была на бальнічным. Ні тады, калі загадвала фермай, ні цяпер.

— Не перабольшвае ваш дырэктар, сапраўды так? — цікаўлюся ў жанчыны.

У адказ яна сціпла ўсміхаецца:

— Я з тых людзей, што не могуць сядзець дома. Калі крыху прыхварэю, то наглытаюся таблетак — на работу бягу. Дзеці сварацца, маўляў, мама, пара ўжо на адпачынак. Нават кватэру купілі ў Дзяржынску, прымусілі з'ехаць са свайго дома ў Чаркасах. Бо там жа і падсобную гаспадарку трымала, як жа без яе ў вёсцы.

Ада Васільеўна выхавала сем дзяцей: трох дачок і чатырох сыноў. Дзеці раней таксама працавалі ў калгасе: баяліся не паслухацца бацькі. Ён быў паважаны механізатар, узнагароджаны ордэнам Леніна. І вельмі ганарыўся, што ў гаспадарцы ёсць сямейная дынастыя Сянькевічаў. Пасля смерці бацькі дзеці пераехалі хто ў Фаніпаль, хто ў Дзяржынск. Але галоўнае, што ўсе жывуць непадалёку, дапамагаюць маці.

А ў яе сапраўды вельмі адказная работа, звязаная з матэрыяльнымі каштоўнасцямі. Ада Васільеўна адпускае кармы, камбікорм на ферму, узважвае збожжа, што прывозіцца ад камбайнаў на элеватар, кукурузу, сілас. Цяжка нават пералічыць усе аперацыі, што яна праводзіць. Тут нельга памыліцца. Памылка можа дорага каштаваць. Як удаецца трымаць усё пад увагай працаўніцы, якая не карыстаецца камп'ютарам?

— У мяне восем класаў адукацыі. Ды і позна вучыцца камп'ютарнай справе. Дапамагае багаты вопыт. Не было выпадку, каб у мяне нешта не сходзілася ў справаздачы, — гаворыць мая суразмоўца.

І яе словы пацвярджае сам дырэктар.


Ада СЯНЬКЕВІЧ бездакорна працуе ў гаспадарцы больш за сорак гадоў.


На новай вуліцы аграгарадка.

### СЛУЖБОВАЕ ЖЫЛЛЁ? У ПЕРСПЕКТЫВЕ — АСАБІСТАЕ

Добраўпарадкаванню, будаўніцтву жылля ў аграгарадках Чарнікоўшчына і Чаркасы, размешчаных на тэрыторыі гаспадаркі, надаюць, бадай, не менш увагі, чым вытворчым пытанням. Менавіта перспектыва атрымання службовага жылля дазваляе замацоўваць кадры, маладых спецыялістаў. Агульнавядома, што дах над галавой мае першачарговае значэнне для любога чалавека.

У філіяле ўзводзяцца як індывідуальныя, так і шматкватэрныя дамы, і нават цэлыя вуліцы. Параўнальна нядаўна з'явіліся два новыя добраўпарадкаваныя, з усімі выгодамі двухпавярховікі ў вёсцы Чаркасы, кожны па 12 кватэр. А ўзніклі яны на месцы забалочанай нізіны. Папярэдне давялося засыпаць яе пяском, выраўноўваць пляцоўку пад будаўніцтва. Чаму менавіта тут распачалі будоўлю? Проста тут былі пракладзены неабходныя камунікацыі: ачышчальныя збудаванні, каналізацыя, газ, тэлефонная і электрычная сувязь, што, бясспрэчна, паўплывала на зніжэнне кошту будаўніцтва. Налета ў гаспадарцы плануюць пабудаваць побач яшчэ адзін 24-кватэрны дом. Па словах дырэктара Вадзіма Кунца, ён абыдзецца танней, чым папярэднія, паколькі будзе трохпавярховым з трыма пад'ездамі.

УНП 601064189

Галоўны аграном Дзмітрый ДАБРЫЯН і трактарыст Аляксандр ШМАК на полі, дзе вядуць сяўбу азімых.



# Гаспадарка, аблюбаваная буслямі

**У ААТ «Вітка-Агра» не па чутках ведаюць, што не той хлеб, які на полі, а той, які ў гумне. Таму з ранняй вясны працуюць не пакладаючы рук. І вынікі навідавоку. Ураджайнасць зерневых перавысіла мінулагоднія паказчыкі і склала 60 цэнтнераў з гектара. Пакуль збожжа «грэецца» на новым сучасным зернесушыльным комплексе, механізатары паспелі пасеяць большую палову азімых і ваўсю шчыруюць на ўборцы кукурузы і цукровых буракоў... У добрым ураджаі гэтых культур дырэктар ААТ «Вітка-Агра» Дзмітрый Дзям'янавіч ЧЫРЭЦ нават не сумняваецца.**

Кіраўнік гаспадаркі Дзмітрый ЧЫРЭЦ.



## «ШМАТ БУСЛОЎ — ЧАКАЙ ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ»

— Я ўжо ў маі ведаў, што год будзе добрым, — усміхаецца кіраўнік і ўказвае ў бок буслянкі, што на мехдвары. — Трэці сезон запар па 3-4 буслы вылупліваецца. Як у народзе кажуць: «Калі шмат буслоў — значыць, будзе добры год».

Мясцовая метэастанцыя, як высветлілася, сапраўды не падводзіць. Так, летась прадпрыемства заняло трэцяе месца ў рэспубліцы сярод сельскагаспадарчых арганізацый па малацэ: надой на карову склаў ажно 8708 кілаграмаў. Гаспадарку ўзнагародзілі пераходным сцягам Слуцкага райвыканкама. А ў маі 2013 года кіраўніцтва раёна вынесла рашэнне — занесці працоўны калектыў прадпрыемства на Дошку гонару Слуцкага раёна.

Яшчэ адно дасягненне мінулага года — дыплом за перамогу ў спаборніцтве па вытворчасці ялавічыны. Кіраўнік гаспадаркі атрымаў асабістую падзяку ад міністра сельскай гаспадаркі і харчавання за ўклад у развіццё галіны.

Аб тым, што ААТ «Вітка-Агра» не стаіць на месцы, а эфектыўна развіваецца, сведчаць шматлікія дыпломы на сцяне ў кабінеце дырэктара. «Не адзін год мы да гэтага ішлі, — кажа Дзмітрый Чырэц. — За кожнай узнагародай — праца работнікаў таварыства. Маральны стымул, паверце, не менш важны, чым матэрыяльны».

Сапраўды, з матывацыяй, у тым ліку і з матэрыяльнай, у гаспадарцы ўсё ў парадку. Перад адміністрацыйным будынкам знаходзіцца Дошка гонару. Штодзень уздымаецца сцяг у гонар «ударнікаў працы». На фермах вісяць прозвішчы найлепшых даярак і жывёлаводаў з заклікам «Так трымаць». «Магчыма, нехта скажа, што гэта перажыткі савецкага мінулага, — усміхаецца дырэктар гаспадаркі. — Але ж, што б ні казалі, пагадзіцеся: галоўнае — ёсць эфект».

Што тычыцца стымулу, які можна пакласці ў кашалёк, то сярэдні заробак па гаспадарцы, паводле слоў **галоўнага эканаміста ААТ «Вітка-Агра» Вадзіма ДАВІДОВІЧА,** за 8 месяцаў гэтага года склаў 4 млн 864 тысячы рублёў. Сярод рэкардсменаў — Аляксандр Шмак. За жнівень руплівы механізатар атрымаў ажно 14 мільёнаў рублёў. Гэта цалкам заслужаны заробак, бо ён штодзень перавыконваў норму, адзін засеяў ледзь не 1200 гектараў. «Варта адзначыць, — падкрэсліў галоўны эканаміст, — што кіраўніцтва гаспадаркі стымулюе работнікаў выконваць сваю працу максімальна якасна, бо за гэта прадугледжаны спецыяльныя надбаўкі».



Механізатару Мікалаю КУЗЬМЕНКУ давераны магутны сучасны трактар айчыннай вытворчасці. Працы для яго хапае ў любы час года. Гэтымі днямі перадавы механізатар убіраў цукровыя буракі, якія, як відаць на здымку, урадзілі добра.

## «НАБЫЛІ БУРАКАЎБОРАЧНЫ КАМБАЙН — І ДАЛІ МАГЧЫМАСЦЬ ЗАРАБІЦЬ»

— З года ў год мы актыўна працуем над павышэннем ураджайнасці, — распавядае **галоўны аграном ААТ «Вітка-Агра» Дзмітрый ДАБРЫЯН.** — Так, сёлета завезлі 30 тон элітнага насення азімых, 10 тон насення перспектыўнага нямецкага гатунку пшаніцы. Сеем і айчынныя правераныя гатункі, якія даюць добры ўраджай.

Добрыя віды ў кіраўніцтва гаспадаркі сёлета і на ўраджай цукровых буракоў.

— Нягледзячы на адсутнасць дажджу апошнія паўтара месяца, ураджай буракоў будзе не меншым, чым летась, — кажа Дзмітрый Чырэц. — Летась з уборкай справіліся самастойна і нават адправілі некалькі сваіх работнікаў на падмогу суседняй гаспадарцы. Сёлета таксама нікога не будзем прыцягваць збоку. А ўсё дзякуючы сучаснаму высокапрадукцыйнаму буракаўборачнаму камбайну, які набылі ў лізінг. Ён абышоўся нам не танна — больш як 2 млрд рублёў. Але гэта таго варта. Бо раней нам нічога не заставалася, як арандаваць тэхніку. Сёння ж, каб наняць камбайн для ўборкі 300 гектараў буракоў, трэба аддаць больш за 1 млрд рублёў. Мы ж набылі ўласны камбайн і тым самым далі магчымасць сваім людзям зарабіць добрую капейку. Механізатары гэта цудоўна разумеюць і самі рвуцца ў «бой».

## «НЕ БЫЛО ТАКОГА ГОДА, КАБ НЕ ЎВЯЛІ НЕЙКІ БУДЫНАК»

Найбольш перспектыўны кірунак ААТ «Вітка-Агра» — малочны. Сёння гаспадарка мае 3322 галавы буйнарагатай жывёлы, з іх 980 — дойны статак. Валавы надой малака летась склаў 7371 тону. Больш як 80% малака ідзе на продаж гатункам «экстра».

— Каб правільна накарміць карову і атрымаць высокія надоі, шчыльна працуем са Слуцкім камбінатам хлебапрадуктаў, — кажа Дзмітрый Чырэц. — Супрацоўніцтва будуем на давальніцкіх умовах. Мы ім пастаўляем сваё зерне, а яны нас, у сваю чаргу, забяспечваюць высакаякасным збалансаваным камбікормам. Безумоўна, нерэальна было б дабіцца такіх высокіх паказчыкаў без мадэрнізацыі вытворчасці.

— «За апошнія гады ААТ «Вітка-Агра» змянілася да непазнавальнасці, — кажуць спецыялісты са шматгадовым стажам. — А самае галоўнае — у разы палепшыліся ўмовы працаўнікоў. Калі б прыехалі раней, не пазналі б гаспадарку. Тут на мехдвары не было нават асфальту, на ферму можна было зайсці толькі ў ботах. Усё перабудавалі, аднавілі.

— Вось бачыце, новы зернесушыльны комплекс красуецца, — кажа Дзмітрый Чырэц. — Там раней стаяў бур'ян... У мяне такі прынцып: там, дзе бардак, трэба абавязкова нешта пабудаваць.

У гаспадарцы пастаянна вядзецца рэканструкцыя старых жывёлагадоўчых памяшканняў пад беспрывязнае ўтрыманне жывёлы. Бо, сапраўды, калі не ствараць умоў для ўтрымання жывёлы — на якія высокія надоі можна разлічваць?

— За час маёй працы не было такога года, каб не ўвялі нейкі будынак, — працягвае Дзмітрый Дзям'янавіч. — Так, летась на ферме ў вёсцы Цалевічы адрамантавалі былую стайню і зрабілі там прафілакторый для цялят на 220 галоў. Сёлета перарабляем у вёсцы Еўлічы стары кароўнік — там плануем вырошчваць 300 быкоў. Адметна, што ўсе работы вядуцца ўласнымі сіламі.

— Сярэднясутачнае прыбаўленне ў вазе ў новым прафілакторыі складае больш як кілаграм, — распавядае **загадчык фермы «Цалевічы» Дзмітрый САПЕГА.** — Тут працуюць муж з жонкай: Дзмітрый Жаўтагірка і Ала Ефімовіч. Яны вельмі добрасумленна ставяцца да працы. Заўсёды ў нас тут акуратна, цяляты напоеныя і накормленыя. У жывёлаводаў ёсць стымул працаваць сумленна, бо, ведаючы, што за прыбаўленне ў вазе яны атрымаюць прэмію. Так, за жнівень на дваіх сям'я зарабіла 15,5 млн. Даяркі таксама стараюцца. Менш як 7 тысяч малака ніхто з іх не доіць. Хацелася б адзначыць нашых дзевяцітысячніц — Наталлю Іванову, Наталлю Шышко, Раісу Сукач, Таццяну Ігнатовіч, а таксама васьмітысячніц — Таццяну Трушко, Святлану Хадаровіч, Ірыну Краўчанку, Вольгу Раманеню, Ірыну Паганкіну, Галіну Пяцько, Галіну Долбік.

Дзмітрый Сапега распавёў, што ў ААТ «Вітка-Агра» ён працуе трэці год. Прыехаў на Случчыну з Капыльскага раёна, дзе таксама працаваў загадчыкам фермы.

— Я вельмі задаволены, што пераехаў сюды, — распавядае Дзмітрый Сапега. — Бо тут, а ў мяне ёсць з чым параўноўваць, для работнікаў сапраўды створаны ўсе ўмовы для працы. І зарплата годная. Асабіста мне дырэктар выдзеліў службовую кватэру побач з фермай. А гэта з маёй працай, паверце, вялікая справа. Калі што-небудзь, не дай Бог, здарыцца з якой-небудзь каровай, я нават ноччу праз пяць хвілін магу быць на месцы. Усё, што адбываецца на ферме, знаходзіцца ў мяне пад кантролем. Я сваю работу вельмі люблю. Перажываю, каб усё было ў парадку. Трэба, каб кожны спецыяліст любіў сваю працу, — тады будзе і вынік.

❑ ❑ ❑

На стадыі завяршэння знаходзіцца будаўніцтва сучаснага малочнатаварнага комплексу на 720 дойных кароў па прэзідэнцкай праграме ў вёсцы Цалевічы. Ужо ўзведзены даільна-малочны блок і памяшканне для ўтрымання кароў. Скончана работа па энергазабеспячэнні, устаноўлена падстанцыя і воданапорная вежа, падведзены камунікацыі. На свае вочы пераканаліся, што ў адным з памяшканняў комплексу на сучаснай даільнай установцы — «унібокс» — ужо ваўсю дояць кароў.

— Сёння тут знаходзіцца 200 кароў дойнага статка, — кажа **начальнік новага МТК Аляксандр БЕНЕДЗІКТОВІЧ.** — Надой на адну карову складае 25 літраў. Да канца года, плануецца, будаўніцтва ўсяго комплексу будзе завершана.

## МАЛАДЫМ — ДАРОГУ!

У ААТ «Вітка-Агра» сёння працуе 234 чалавекі. Добрая палова з іх — ва ўзросце да 40 гадоў. Паказальна, што дырэктар не сядзіць склаўшы рукі і не чакае, пакуль у гаспадарку дашлюць высокакваліфікаваных спецыялістаў, а сам адпраўляе старанных работнікаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй атрымліваць вышэйшую.

— Мы гатовы ўкладваць грошы ў адукацыю сваіх работнікаў, было б толькі іх жаданне, — кажа Дзмітрый Чырэц. — На шчасце, ахвотнікаў хапае. Так, дапамаглі атрымаць вышэйшую адукацыю Дзмітрыю Голубу, які працуе ў гаспадарцы энергетыкам. Вучым на заатэхніка-селекцыянера ў Віцебскай ветэрынарнай акадэміі Зою Іцяксаву, там жа вучыцца і ветурач Яўген Страйкоў. Налета плануем адправіць туды вучыцца другога ветурача Руслана Качанава.

Вялікія спадзяванні дырэктар гаспадаркі ўскладае на маладых спецыялістаў. Аднаго з іх, Дзмітрыя Жука, прызначыў галоўным інжынерам, другога — Калядку Андрэя — інжынерам па сельскагаспадарчых машынах.

— Абодва хлопцы граматныя, — кажа Дзмітрый Чырэц. — Адзін з іх скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках, другі — БАТУ. Яны вельмі цягнуцца да тэхнікі, разбіраюцца ў ёй. Галоўным эканамістам працуе малады хлопец, які прыйшоў да нас па размеркаванні з Горацкай акадэміі з кіпай дыпломаў. Хлопцы працуюць на адказных пасадах больш за год. І з кожным днём я пераконваюся, што зрабіў правільны выбар. Мы ж таксама некалі былі маладымі, і нам давяралі адказную работу. Неяк спраўляліся. І яны справяцца, проста нам трэба дапамагаць ім, падказваць.

Пасля размовы з дырэктарам я падышла да галоўнага эканаміста і пацікавілася, з якімі дыпломамі ён прыйшоў уладкоўвацца на працу.

— У акадэміі я займаўся навукай, — распавядае Вадзім Давідовіч. — З першага курса ўзначальваў студэнцкае навуковае таварыства. Па некалькі разоў на год ездзіў на розныя міжнародныя канферэнцыі. Ні з адной з іх не вярнуўся без дыпломаў. За гады вучобы ў мяне выйшла больш за 35 навуковых публікацый. У ААТ «Вітка-Агра» я трапіў па размеркаванні. І нікольку не шкадую. Калектыў тут добры, і праца падабаецца. Наша гаспадарка прагрэсіўная, таму сумаваць не даводзіцца. Так, сёлета паступіла новая тэхніка. Я з задавальненнем раблю яе «абкаты»: саджуся побач з механізатарам у трактар ці камбайн і езджу з ім па полі, устанаўліваю норму працы. І, несумненна, адчуваю тую адказнасць, якая на мяне ўскладзена, і стараюся апраўдаць давер.

## КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ

У ААТ «Вітка-Агра» ідзе пастаяннае абнаўленне машынна-трактарнага парка. Так, летась у гаспадарцы з'явілася некалькі новых трактароў МТЗ, буракаўборачны камбайн... Сёлета ж толькі за паўгода паспелі набыць тэхнікі на 6 млрд.

— Я вельмі рады, што нам удалося стварыць і захаваць моцны касцяк з 35 механізатараў, — кажа Дзмітрый Чырэц. — Бо, згадзіцеся, абы-каго на новую тэхніку не пасадзіш. Трэба, каб людзі беражліва да яе ставіліся. Інакш не набярэшся грошай на запчасткі, якія сёння — дарагое задавальненне.

*— Дзмітрый Дзям'янавіч, звярнула ўвагу, што ў вас усе механізатары, даяркі вельмі акуратна і чыста апрануты, нягледзячы на тое, што працуюць не ў офісе.*

— Механізатарам і работнікам фермы выдаём спецадзенне. Сёння на ферме пральная машына, у майстэрнях — таксама. На гэта я, як кіраўнік, звяртаю асаблівую ўвагу. Павінна быць культура працы. Практыка паказвае, што чым яна вышэй, тым лепшыя вынікі. Ды і, паўтаруся, тэхніка і фермы ўжо далёка не такія, як грошы добраўпарадкавалі ў ААТ «Вітка-Агра» мехдвор. На свае вочы пераканаліся, што ёсць там усё неабходнае не толькі для працы. У доміку механізатара створаны ўмовы для адпачынку і правядзення заняткаў па ахове працы і тэхніцы бяспекі. Там работнікі могуць прыняць душ, перакусіць, папіць гарачага чаю.

Словам, парадак у «Вітка-Агра пануе паўсюль. Дзмітрый Чырэц упэўнены: усё дасягнутае — гэта плод калектыўнай працы і кожнага работніка таварыства. Ён з цеплынёй адгукаецца аб працаўніках вёскі, кажа, што гэта каманда аднадумцаў, у якой стараюцца ўсе: і жывёлаводы, і механізатары, і кіроўцы. Стараецца для іх і кіраўнік. У вёсцы штогод будуюць новае жыллё для работнікаў ААТ.

— За 7 гадоў маёй работы кіраўніком мы пабудавалі больш за 40 дамкоў. Да канца года плануем здаць яшчэ пяць. Дапамагаем мы работнікам гаспадаркі, а таксама яе ветэранам апрацоўваць асабістыя ўчасткі. Трэба машына дровы ці брыкет прывезці, таксама ідзём насустрач. Бываюць такія сітуацыі, што трэба тэрмінова сеяць, тэрміны падціскаюць, а ў механізатара якраз у гэты момант дзіця захварэла. У такім выпадку я даручаю свайму кіроўцу адвезці жонку работніка з дзіцем у бальніцу. Два гады таму ў гаспадарцы наладзілі вытворчасць тратуарнай пліткі і бетонных агароджаў. Многім работнікам, якія праявілі жаданне, будаўнічая брыгада ўстанавіла тыя агароджы па зніжаных цэнах. Карыстаюцца попытам і талоны, якія мы выдаём сваім работнікам у кошт зарплаты. Максімальная іх вартасць — 2 мільёны. На іх можна набыць у краме ўсё, акрамя цыгарэт і алкаголю.

Як бачыце, кіраўнік клапоціцца пра сваіх работнікаў, цэніць іх і ўважліва ставіцца да кожнага. Людзі гэта адчуваюць. І, у сваю чаргу, стараюцца аддзячыць сумленнай працай. Вось у чым, як мне падалося, самы галоўны сакрэт поспеху прадпрыемства.

УНП 600043245

Марэрыялы ўкладкі падрыхтавалі Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Святлана БАРЫСЕНКА, Надзея ДРЫЛА, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і Надзеі БУЖАН.

**Даведка «Звязды»**

**ААТ «Вітка-Агра» названа ў гонар беларускага дзіцячага пісьменніка Васіля Віткі (сапраўднае імя — Цімох Крысько) невыпадкова. Цімох Васільевіч нарадзіўся ў вёсцы Еўлічы, што знаходзіцца на тэрыторыі гаспадаркі. А два гады таму Слуцкі райвыканкам прыняў рашэнне перайменаваць «Акцябрскую базавую агульнаадукацыйную школу» ў «Акцябрскую базавую школу імя Васіля Віткі». Сімвалічна, што імя славутага земляка ўстанова адукацыі атрымала ў год, калі адзначалі 100-годдзе з дня нараджэння пісьменніка. Тады побач са школай і была закладзена алея ў гонар Васіля Віткі.**

Адзін з прынятых ад будаўнікоў дамоў чакае навасёлаў.





Яны працуюць на новым малочнатаварным комплексе: слесар Віктар ЖЫВАГЛОД, ветурач Руслан КАЧАНАЎ, аператар машыннага даення Наталля ШМАК, начальнік комплексу Аляксандр БЕНЕДЗІКТОВІЧ, заатэхнік-селекцыянер Зоя ІЦЯКСАВА, ветурач Максім ЗУБІК, аператар машыннага даення Ала ПАШКЕВІЧ.




У новым малочнатаварным комплексе рыхтуюцца да чарговай дойкі кароў.

**Ведай нашых!**

**Па выніках мінулага года ААТ «Вітка-Агра» заняло трэцяе месца ў рэспубліцы сярод сельскагаспадарчых арганізацый па малацэ: надой на карову склаў ажно 8708 кілаграмаў.**



Інжынер па сельгасмашынах Андрэй КАЛЯДКА, механізатары Міхаіл ЧАРАВАКА і Віталь КУЗЬМЕНКА аглядаюць тэхніку, якая пасля летніх работ прыбыла ў майстэрню гаспадаркі.



Уборка цукровых буракоў.



Галоўны эканаміст Вадзім ДАВІДОВІЧ, намеснік галоўнага бухгалтара Наталля ЧЫРЭЦ, бухгалтар Наталля РОГАЧ абмяркоўваюць вынікі працоўнага дня.

■ Медыяперсона

Дырэктар тэлеканала «Беларусь-3» Віктар МАЮЧЫ:

# «НАШАЙ КРАІНЕ ТРЭБА ЗАХОЎВАЦЬ АЎТЭНТЫЧНАСЦЬ...»

**Кіраўнік сацыякультурнага тэлеканала жанглюе тэрмінамі, шмат іранізуе, лёгка раскладвае па палічках формы і змест культуралагічных тэлепраектаў, да дзясятых доляў працэнта ведае аб'ём беларускамоўнага вяшчання і крытычна ацэньвае кожную перадачу, якая выходзіць на «Беларусь-3». Мабыць, дзякуючы гэтай цвярозасці погляду размова пра фарміраванне нацыянальнай самаідэнтычнасці беларускай культуры і іншыя стратэгічныя мэты тэлеканала мела свой адметны тон, не збочыўшы ні ў эмацыянальны надрыў, ні ў сухую мову афіцыйнасці...**

**Усяго толькі ў лютым пачалося тэставае вяшчанне першага цалкам лічбавага тэлеканала Беларусі, а ў новым сезоне гледачы маюць паўнавартасную культуралагічную тэлепляцоўку, запоўненую лепшымі ўзорамі дакументальнага і мастацкага кіно, асветніцкімі праграмамі з залатога фонду айчыннага тэлебачання, а таксама ўласнымі новымі праектамі. Бінга! Ці ўсё ж ёсць куды расці?**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Паводле апытання «Грамадская думка аб рабоце нацыянальнага тэлебачання і радыёвяшчання», праведзенага ў 2011 годзе Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта, адной з найважнейшых задач сучаснага ТБ застаецца працэс фарміравання маральных нормаў, выхаванне падрастаючага пакалення, веданне грамадзянамі сваёй гісторыі і атрыманне імі новых ведаў (меркаванне 33% рэспандэнтаў).**

## СПРАВА ДЗЯРЖАЎНАГА ЗНАЧЭННЯ

**— Наколькі вы задаволены цяперашнім аблічам «Беларусь-3»?**

— Я сабой ніколі не задаволены. Калі з ранку пагляджу пэўную праграму на нашым канале — мае супрацоўнікі ведаюць, што гэта заўжды завяршаецца разборам памылак.

**— Тады што будзе мяняцца?**

— Па дробязях — шмат чаго, канцэптуальна нічога. Разумееце, тэлебачанне — гэта вельмі кансерватыўная штука. Асноўнае пытанне заключаецца ў тым, каб знайсці кропкі ўздзеяння на мэтавую аўдыторыю, і планамерна на іх націскаць.

**— Ад пачатку «Беларусь-3» узяў на сябе асветніцкую місію — мякка кажучы, няўдзячную...**

— З часоў першых асветнікаў іх альбо спальвалі альбо адсякалі ім галаву, таму нейкага прызнання, кветак і авацый тут складана чакаць.

**— Тым не менш важнасць і каштоўнасць культуралагічнай тэматыкі бясспрэчная. Але гэта падобна, даруйце за параўнанне, на сітуацыю са здаровым харчаваннем: усе разумеюць, што варта яго прытрымлівацца для даўжэйшага жыцця, але продаж шкоднай ежы — чыпсаў, сухарыкаў і г.д. — толькі расце... Прыкладна тое і з ежай духоўнай. Як зацікавіць гледача культурай?**

— Давайце ўзгадаем піраміду Маслоў, якая адлюстроўвае структуру патрэб чалавека. Сучаснаму чалавеку для таго, каб падтрымліваць жыццядзейнасць, неабходна выдаткаваць менш рэсурсаў на базавыя патрэбы — харчаванне, жытло, адзенне. І тады на першы план выходзіць духоўная ежа. Але «эфект перавернутай піраміды» заключаецца ў тым, што патрэбы з рэальнага жыцця пераходзяць і ў медыйнае асяроддзе, і людзей цікавяць тыя ж тэмы: перадачы пра кухню, адзенне, секс. Ад гэтага нікуды не падзецца. Сучаснае тэлебачанне выкарыстоўвае гэта, каб прыцягнуць гледача і даражэй прадаць час рэкламадаўцам.

**— Атрымліваецца, канал «Беларусь-3» зарыентаваны на дастаткова вузкае кола інтэлектуалаў?**

— Каналы кшталту «Культуры», незалежна ад таго, у Беларусі яны, у ЗША, у Польшчы ці ў Антарктыдзе, не маюць долі больш за 2% аўдыторыі. Параўнаем тэлеканалы з гандлёвымі сеткамі: ёсць гіпермаркеты, куды ходзяць усе, ёсць крамы крокавай даступнасці, у іх крыху іншая «аўдыторыя» наведнікаў, ёсць спецыялізаваныя крамы — гаспадарчых тавараў, бытавой хіміі, швейнай фурнітуры і г.д. А ёсць буцікі, куды можа зайсці кожны, але мала хто можа дазволіць сабе набыць іх тавары. Тое ж тычыцца і тэлеканалаў. Калі попыт ёсць, ён задавальняецца.

### З «Канцэпцыі вяшчання тэлеканала «Беларусь-3»

***Сацыяльна-культурнае вяшчанне складае каля 51% і ўключае праграмы ўласнай і пабочнай вытворчасці, фондавую і архіўную прадукцыю, якія прапагандуюць беларускую культуру, асвятляюць найбольш значныя гістарычныя падзеі, расказваюць пра знакамітыя мясціны Беларусі, выхоўваюць пачуццё патрыятызму і любові да Радзімы. Музычна-забаўляльнае вяшчанне складае 3%... магчымае выкарыстанне канцэртаў класічнай музыкі з фондаў. Кінапаказ складае да 42% (у тым ліку 8% — дакументальны). Улічваючы, што магчымасці нацыянальнага кінематографа абмежаваныя, мяркуецца ўключэнне ў структуру кінапаказу (у памеры 22% ад агульнага аб'ёму вяшчання) лепшых фільмаў савецкага кінематографа, серыяльнай прадукцыі РФ і краін СНД пры ўмове адпаведнасці гэтых фарматаў канцэпцыі вяшчання, стратэгічным мэтам тэлеканала і перавагам аўдыторыі.***

Ва ўмовах глабальнай медыяпрасторы перад малымі краінамі, як краіны Скандынавіі, або, скажам, Балгарыя, паўстае пытанне захавання сваёй этнакультуры, сваёй аўтэнтычнасці і самаідэнтыфікацыі. Важна гэта і для Беларусі. Пры вялізнай колькасці практычна аднолькавых інфармацыйна-забаўляльных каналаў, якія прыходзяць да нас з-за мяжы, неабходна мець свой тэлеканал са сваім нацыянальным кантэнтам.

Наогул, культура — справа дзяржаўная. І вельмі добра, што ў Белтэлерадыёкампаніі з'явіўся старшыня, які выйшаў з культуры, узначальваў творчыя саюзы і таму выдатна, літаральна ўсёй скурай адчувае неабходнасць падтрымкі гэтай справы. Стварэнне «Беларусь-3» — найперш яго заслуга, і калі б Генадзь Браніслававіч Давыдзька не быў заслужаным артыстам Беларусі, гэтае званне яму варта было б даць за адкрыццё нацыянальнага культурна-асветніцкага канала.

### З «Канцэпцыі вяшчання тэлеканала Беларусь-3»

***Місіяй тэлеканала з'яўляецца пазіцыянаванне беларускага грамадства ў галіне культуры ў самым шырокім сэнсе, г.зн. як сукупнасці матэрыяльных і інтэлектуальных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь у сучасным медыяасяродку.***

***Слоган тэлеканала «Беларусь-3» — «Каб любіць Беларусь!»***

## КАНТЭНТ І ПРЫХІЛЬНІКІ

— Сетка «Беларусь-3» пабудаваная па прынцыпе ратацыйнасці: у нас 14 рубрык, якія ахопліваюць пэўныя сегменты: жывапіс, архітэктура, тэатр і г.д. Кіно — гэта асобны вялікі жанр, без якога абысціся нельга. Хоць мы падстараліся б абысціся без кінафільмаў наогул, бо культуралагічны праект мусіць абапірацца на падзеі, якія ідуць ад жыцця, а не на мастацкую выдумку. Але паколькі канал разлічаны ўсё ж на масавага гледача, аўдыторыя проста не зразумее, калі ў нас не будзе мастацкага кіно. І другі момант — выкананне пэўнай сацыяльнай задачы, прадстаўленне нацыянальнага кінематографу,— мой суразмоўца на пэўны час губляе іранічны тон.— Наш канал павінен «медыятызаваць» беларускую культуру, зладзіць сувязь паміж напрацаванымі культурнымі традыцыямі і гледачамі. У прыватнасці, мы падпісалі з «Беларусьфільмам» сумесны пратакол, паводле якога захаваныя толькі ў іхніх, а таксама і ў расійскіх, запасніках беларускія кінафільмы будуць прыведзены ў такі стан, каб іх можна было паказваць у сучаснай тэлевізійнай якасці. Спадзяёмся атрымаць варты вынік. На пачатку лістапада зробім кінатыдзень Юрыя Тарыча, аднаго з пачынальнікаў беларускага кіно; цяпер ідзе тэматычны кінатыдзень Ул.Корш-Сабліна, далей — тыдзень В. Турава, В. Чацверыкова, І. Дабралюбава, Б. Сцяпанава і г.д.

**— Адна з новых праграм на «Беларусь-3» — на мой погляд, вельмі цікавы праект «Дыяблог», вядучыя якога разважаюць пра мову, літаратуру, творчасць і адпаведнасць рэлігійных запаведзяў жыццёвым рэаліям і запрашаюць гледачоў да інтэрактыву. Ці адчуваецца водгук з таго боку экрана? У інтэрнэт-блогах актыўнасці каментатараў пакуль што не назіраецца...**

— Гэта асаблівасць нашых інтэрнэт-карыстальнікаў, якіх, акрамя інтэрнэту, іншыя каналы сувязі быццам бы ўжо не цікавяць. У тым і задача «Дыяблогу», каб пастарацца прывабіць інтэрнэт-аўдыторыю да тэлевізара. Не тое каб прымусіць, не. Ёсць такое моднае слова «канвергенцыя» (працэс збліжэння. — **Аўт.**), і чамусьці лічыцца, што канвергенцыя медыйная ідзе толькі ў адзін бок: тэлебачанне прыходзіць да гледача. Чаму ж не можа быць наадварот? Вось мы і вырашылі зрабіць падобную спробу. Наколькі яна ўдалая, казаць рана, мы яшчэ на пачатку шляху.

**— Частка гледачоў скардзіцца, што цікавыя для іх перадачы ідуць у нязручны час, пасярэдзіне працоўнага дня.**

— Можна паглядзець у паўторы.

**— Некаторыя праграмы — можна, а некаторыя ідуць толькі позна ўвечары, і іх мала хто дачакаецца. Я і сама шмат што паглядзела б, але раблю выбар на карысць працы. Наколькі рухомая праграма «Беларусь-3»?**

— Гэта пытанне крытычнай масы. Калі мы атрымаем звесткі аб перавагах аўдыторыі і будзем бачыць сапраўды значную патрэбу ў «перасоўванні» пэўных праграм — усё вырашальна.

**— Ці з'явяцца ў эфіры тэлеканала, акрамя кіно, дакументальных і асветніцкіх праграм, навіны культуры?**

— Калі гаворка ідзе пра асвятленне падзей грамадскага жыцця, то з гэтым цудоўна спраўляюцца нашы калегі з «Беларусь-1» у інфармацыйных блоках і асобных праграмах, прысвечаных культуры. А калі мець на ўвазе канстатацыю падзей, што адбываюцца ў культурным асяродку, то гэтую функцыю ўзяла на сябе наша праграма «Калейдаскоп». Хоць гэта і не навіны ў чыстым выглядзе, хутчэй, хроніка падзей мінулага ці будучага часу.

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГУ

**— Калі не сакрэт, колькі чалавек робіць «Беларусь-3»?**

— Па штатным раскладзе — 32. Але мне хочацца адказаць на гэтае пытанне іншым чынам. Калі ў Чкалава, які здзейсніў першы беспасадачны пералёт з СССР у ЗША, запыталіся ў Ванкуверы, колькі чалавек рабілі самалёт «АН-25», ён сказаў: «150 мільёнаў. Бо гэта ўся вялікая краіна, якая стаіць за мной». Таму і нас — роўна столькі, колькі знаходзіцца ў Белтэлерадыёкампаніі, бо падтрымка калег заўжды адчуваецца, і гэта вельмі каштоўна.

**— Кажыце ўжо адразу: нас 9 з паловай мільёнаў...**

— У нейкай ступені і так. Бо ўсе гэтыя людзі ствараюць усе тыя інфармацыйныя нагоды, што даюць нам магчымасць выйсці ў эфір.

**Гутарыла**
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# Каб адчуць сябе часткай Еўропы

**Апошнім часам «падзейны турызм» набывае немалую папулярнасць, якая зусім не саступае экскурсійнаму. Беларусь актыўна падтрымлівае гэтую тэндэнцыю.**

**Сырны фестываль, кулінарны фэст «Мотальскія прысмакі», святы ў Мірскім і Нясвіжскім замках і іншыя прываблівацюць тысячы беларусаў і гасцей з замежжа. Першы сямейны інтэрактыўны фестываль на адкрытым паветры «Цэнтр Еўропы», які пройдзе 12 кастрычніка ў Ратамцы, абяцае дадаць разнастайнасці да падзейна-турыстычнай карты Беларусі.**

Назву запланаванага свята выбралі невыпадкова. Сёння адначасова лічаць сябе цэнтрамі Еўропы Польшча, Украіна, Літва, Венгрыя, Чэхія, Германія, Славакія і, вядома, Беларусь. Дакладнасць геаграфічных вымярэнняў пакінем спецыялістам, а вось пацвердзіць свой сучасны еўрапейскі стыль жыцця паспрабуем якраз на свяце «Цэнтр Еўропы».

Каб раскрыць шматбаковасць нашай краіны, арганізатары мерапрыемства прапануюць насычаную праграму забаў і спаборніцтваў. Галоўная іх адметнасць — інтэрактыўнасць, то бок кожны госць свята зможа не толькі назіраць і атрымліваць пазітыўную энергію, але і браць у іх удзел. Маеце жаданне пакатацца на коніку ці ў брычцы — калі ласка. Пасля тэатралізаванага шоу «Кавалькада», якое раскрые высакароднасць і сілу коней з Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па конным спорце, экскурсія па Ратамцы будзе зусім не лішняй. На прэзентацыі моладзевых культурных плыняў «Улётная стыхія» наведнікі свята змогуць убачыць і выступленні майстроў скейт-борда, ролікаў, і нараджэнне з нуля графіці ды арыгінальных дызайнерскіх рэчаў з... бульбы.

Цікавым і захапляльным абяцае стаць сямейна-кулінарнае свята беларускай кухні «Бульбяны рай». Натуральна, што, запрашаючы гасцей, беларусы стараюцца іх смачна і сытна накарміць. Як гатуюць стравы з бульбы ў беларускіх сем'ях, ацэняць вядомыя шэф-кухары краіны і, магчыма, пазычаць маленькія кулінарныя сакрэты ў беларускіх гаспадароў і гаспадынь — сапраўдных носьбітаў традыцыі. Дарэчы, спаборнічаць за права называцца лепшым «бульбяным» кухарам будуць пяць сем'яў. Каб стаць галоўным героем кулінарнага першынства, ужо сёння трэба падаць заяўку на сайце www.eventbelarus.by, дадаўшы падрабязнае апісанне рэцэпту і фота стравы. Параўнаць беларускі варыянт страў будзе з чым. Шэф-кухары рэстаранаў правядуць майстар-класы, дзе пакажуць, як гатаваць нямецкія, чэшскія, ірландскія, італьянскія стравы з бульбы. А пасля, магчыма, будзе прыгатавана самая вялікая клёцка ў свеце!

Пакуль большасць мерапрыемстваў такога кшталту афарбаваны лакальнасцю і прывязанасцю да пэўнай мясцовасці, кажуць у Міністэрстве спорту і турызму. Павысіць іх узровень і значнасць паспрабуе оўпэн-эйр «Цэнтр Еўропы». На ім будуць прысутнічаць прадстаўнікі дыпламатычных місій, іх партнёры і замежныя турысты, якія наведаюць Беларусь якраз 12 кастрычніка, калі і мы паспрабуем адчуць сябе сапраўднай часткай Еўропы.

**Любоў КАСПЯРОВІЧ.**

■ Медыяпрастора

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

# Мадам

Паразважаць на жаночыя тэмы, адпачыць, знайсці для сябе нешта новае, карыснае і цікавае — усё гэта можна зрабіць у суботу разам з вядучай радыё «Мір» Ірынай Пятровіч.

У сваёй праграме «Мадам» яна падымае пытанні ўзаемаадносін, псіхалогіі, выхавання дзяцей, прыгажосці і здароўя. Як можна зацікавіць мужчыну, не сказаўшы ні слова, якімі знакамі даць яму зразумець, што ім зацікавіліся? Псіхолагі называюць іх «невербальнымі знакамі ўвагі». Па-першае, гэта позірк. Ён можа сказаць пра многае, бо, як вядома, вочы — люстэрка душы. Па-другое, жэсты. Напрыклад, дэманстрацыя жаночага запясця тлумачыцца псіхолагамі як праява зацікаўленасці мужчынам. І, вядома ж, паходка — лёгкая і свабодная. Як казала гераіня фільма «Службовы раман», «мужчыны такую жанчыну не прапускаюць»!

Дзелімся жаночымі сакрэтамі кожную суботу ў 18.15 на хвалях радыё «Мір»!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 30 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**9.10, 17.40** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Меладрама «Шукайце маму».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.25** Клуб рэдактараў.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Меладрама «Час шчасця-2».**
**19.20** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Каўчэг». 1-я серыя.**
**0.00** Дзень спорту.
**0.15 Камедыя «Махляры».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Жураў-2».**
**10.50** Навіны надвор'я.
**10.50 Камедыя «Дзелавыя людзі».**
**12.30 Баявік «Забароненае царства».**
**14.35** Тэніс. Турнір ВТА. Жанчыны.
**16.45** Беларуская часінка.
**18.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Барыс».
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**23.05 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**0.05 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 18.40,00.05** «Калейдаскоп».
**8.05** «Одной звезды я повторяю имя...». Дак. фільм.
**8.40** «Лёгка сказаць». Жонка рэжысёра Міхаіла Пташука — Лілія Пташук.
**9.05** «Тэатр. Выбранае». Народны артыст Беларусі Аўгусцін Мілаванаў.
**9.35, 22.35 «Доктар Жывага». Маст. фільм.**
**10.20, 22.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.45** «Мілаш Форман: тое, што цябе не забівае...» Дак. фільм.
**12.25, 23.40** «Святло далёкай зоркі».
**12.55** «Кінарэжысёр Віктар Тураў». Дак. фільм.
**13.20** «Палескі пачастунак». Дранікі.
**13.40** «Каманда». Дак. фільм.
**14.10, 23.20** «Адступнік». Рэжысёр, заслужаны артыст Расіі Валерый Рубінчык.
**14.30** «Скарбніца Гарадзеншчыны». Гарадзенская жамчужына. Каложская царква ў Гродне.
**14.55** «Міфалагемы Родзіна». Дак. фільм.
**15.15 «Крушэнне імперыі». Маст. фільм.**
**16.50** «Наперад у мінулае».
**17.15** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Галубіцкая пушча».
**17.40** «Дзве цвярдыні». Цэрквы-крэпасці Белай Русі. Дак. фільм.
**17.55** «Малады дубок». Кароткаметражны фільм.
**18.25** «Музычны майстар». Дак. фільм.
**18.50 «Волга-Волга». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**20.45 «Цераз могілкі». Маст. фільм.**

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Ясмін».**
**16.15 Серыял «Хатняя работніца».**
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Водпуск па-савецку. Праца за траіх».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Серыял «Цюдоры».**
**0.20 Камедыя «Вялікі белы падман».**
**2.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20** «Жыць будзеце».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Слова жанчыне». Серыял.**
**12.30** «Джэймі: абед за 30 хвілін».
**13.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя». «Тамара Макарава. Благаславенне кахання».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Дайджэст. «Лепшыя каманды».
**15.30** «Чыстая праца».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Сакрэты старажытных прыгажунь».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Смаргонь.
**20.25 Трылер «Адзінокія сэрцы».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.50** «Прафесійны бокс».

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.40** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.15** Пяцьдзясят на пяцьдзясят.
**10.50** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25, 3.05 Серыял «Клон».**
**15.25, 22.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Чорны крумкач-2».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Закон і парадак».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**23.25 Серыял «Чыста англійскія забойствы».**
**1.05 Маст. фільм «Усмешка лёсу».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55, 17.10 Серыял «Пуцейцы-2».**
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Простае жыццё».**
**22.35 Серыял «Права на праўду».**
**23.45** «Наша войска. Раптоўная праверка».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.55** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Баявік «Антыснайпер. Двайная матывацыя».**
**21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Серыял «Карпаў».**
**0.30 Серыял «Здраднік».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.35, 19.15, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20** М/с.
**7.30, 14.15 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.20, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».**
**10.50 «Сінематограф». Маст. фільм «Вялікія манеўры».**
**12.40 Драма «Падстава».**
**16.10** Мультпарад «Легенда пра Тарзана».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**19.20 Серыял «Падзея».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Апошняя прапанова».**
**23.25** «Кінаблакнот».

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі сёлета юбіляр. Таму настрой на бягучы сезон у яго асаблівы. Гэта можна было адчуць і падчас канцэрта адкрыцця філарманічнага сезона. Што ўжо казаць пра ўласна святочны вечар! Свой 85-ты дзень нараджэння калектыў адзначыў асобным канцэртам-віншаваннем у Вялікай зале філармоніі. Для вечара былі выбраны творы Рыхарда Штрауса (сімфанічная паэма для аркестра «Дон Жуан» і «Чатыры апошнія песні» для сапрана з аркестрам) і сімфонія Пятра Чайкоўскага № 6 Сі мінор, якую яшчэ называюць «Патэтычнай». Патэтыка якраз дарэчы: дата для калектыву адметная. Але адно — казаць пра 85 гадоў, а іншае — паспрабаваць уявіць той час, калі калектыў утвараўся: ішоў няпросты 1927 год, калі ў рэспубліцы была прынята пастанова аб неабходнасці арганізацыі сімфанічнага аркестра. Адна справа пастанова, але сабраць музыкантаў, весці рэпетыцыі для таго, каб сыграць паўнавартасны канцэрт... Гэта даверылі скрыпачу і дырыжору Аркадзю Бяссмертнаму. Адно са сваіх першых выступленняў беларускі аркестр меў разам з вядомым савецкім кампазітарам і дырыжорам нямецкага паходжання Рэйнгольдам Гліэрам. І толькі ў 1937-м у Мінску адкрылася філармонія...**



Фота БЕЛТА.

Аднак з таго часу Дзяржаўны сімфанічны аркестр з'яўляецца галоўным калектывам, які працуе пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі. За такое доўгае жыццё ў аркестры змянілася некалькі пакаленняў музыкантаў. Але гэта калектыў, у гісторыю якога будуць назаўсёды ўпісаны выступленні з зоркамі сусветнай музыкі, такімі як Ван Кліберн, Давід Ойстрах, Святаслаў Рыхтэр, Мсціслаў Растраповіч, Леанід Коган, Наталля Гутман, Гедэон Крэмер, Ігудзі Менухін і іншымі.

Розныя былі часы і эпохі. Было прызнанне высокага ўзроўню (у 1980 годзе прысвоена званне «акадэмічны»). Былі няпростыя часы, калі музыканты ў пошуках лепшага жыцця былі вымушаны пакідаць аркестр (асабліва ў сярэдзіне 1980-х — пачатку 1990-х гадоў). Быў пошук кіраўнікоў і дырыжораў, каб выйсці з усіх выпрабаванняў, захаваўшы цікавасць з боку публікі — айчыннай і замежнай (што асабліва важна было для калектыву, які ўжо пачаў прадстаўляць незалежную краіну Беларусь). Можна было працягваць шукаць кіраўнікоў-дырыжораў за межамі Беларусі (у такой практыцы няма нічога заганнага). Але з 2001 года кіраваць калектывам запрасілі Аляксандра Анісімава, чалавека, які дагэтуль працаваў з аркестрам опернага тэатра, якога ведала і любіла айчынная публіка. Ведала публіка і замежная: выхаванец расійскай музычнай школы, які працаваў у Беларусі, стаў дырыжорам першага канцэрта сусветнай зоркі Мансерат Кабалье ў Крамлі, потым працаваў з Нацыянальным сімфанічным аркестрам Ірландыі, шмат выступаў як у Расіі, так і ў далёкім замежжы.

З прыходам Аляксандра Анісімава ў аркестры наступіла эпоха адкрытасці: не раз маэстра запрашаў на рэпетыцыі прадстаўнікоў прэсы. Назіраць за гэтым было цікава: рэпетыцыі часам ператвараліся ў лекцыі, калі твор не проста трэба было сыграць, найперш важна было зразумець настрой і матыў, з якім кампазітар яго пісаў...

— Я ганаруся, што мне выпала працаваць з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь, — прызнаўся на пачатку сезона **галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік калектыву народны артыст Беларусі Аляксандр АНІСІМАЎ.** — У аркестры працуюць музыканты высокага ўзроўню. Пра гэта сведчыць той факт, што некалькі нашых музыкантаў прайшлі сёлета адбор у аркестр Гергіева (адзін з самых выдатных расійскіх калектываў). Але гэтыя людзі пакідалі наш аркестр з сумам: усё ж Беларусь іх выхавала як музыкантаў, тут іх радзіма, карані, бацькі... Але разам з тым трэба парадавацца: у нас ёсць цудоўныя музыканты, майстэрства якіх ацэнена. І наш аркестр усё ж папаўняецца, ён жыве, выхоўвае. Гэта вялікі калектыў, у якім, акрамя вялікай колькасці музыкантаў, ёсць розныя службы. Важна, каб усё працавала зладжана, каб да гледача мы выходзілі з выдатнымі творамі.

Сімфонія, якая выконвалася ў юбілейным канцэрце, прадстаўляе адзін з запланаваных на новы сезон цыклаў: «Усе сімфоніі Чайкоўскага». Але самым галоўным прызначэннем калектыву, які стварыўся 85 гадоў таму ў Рэспубліцы Беларусь, было выкананне і прадстаўленне музыкі беларускіх кампазітараў. Так было ад самага пачатку ў 20-30-ыя гады. Хацелася б, каб так было і цяпер, у XXI стагоддзі. У бягучым сезоне нам абяцаюць сустрэчы з беларускімі сучаснымі кампазітарамі. Нават ужо ў кастрычніку, калі пачнецца фестываль «Беларуская музычная восень», акрамя Чайкоўскага (сімфоніі № 5) будзе магчымасць паслухаць і Пятую сімфонію Вячаслава Кузняцова, а таксама Канцэрт для клавіра з аркестрам Віктара Капыцько.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

### Віншаванне Прэзідэнта

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў і гасцей X Нацыянальнага фестывалю архітэктуры «Мінск-2013» з адкрыццём гэтага форуму.**

«За мінулыя гады гэты фестываль заваяваў папулярнасць і прызнанне як маштабны і аўтарытэтны творчы форум сучаснасці. Праводзімы пад эгідай Міжнароднага саюза архітэктараў, ён збірае вопытных мэтраў і яркіх маладых дойлідаў больш як з 20 краін розных кантынентаў, — гаворыцца ў віншаванні. — Прыемна, што гэты юбілейны форум прысвечаны беларускай архітэктуры, асноўнай тэндэнцыяй якой з'яўляецца накіраванасць у будучыню, дынамічнасць развіцця і захаванне яе лепшых традыцый».

«Упэўнены, што правядзенне такога значнага мерапрыемства на беларускай зямлі, несумненна, паслужыць плённаму абмену перадавым вопытам, надасць магутны імпульс развіццю перспектыўных напрамкаў архітэктуры і горадабудаўніцтва, адкрые новыя імёны таленавітай моладзі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

■ Фестывалі

# ЯК СОРАМ УПЛЫВАЕ НА КУЛЬТУРУ?

## Увесь тэатр — гэта жыццё, і ўсе мы ў ім акцёры

**Мінск гэтымі днямі проста перанасычаны тэатральнымі падзеямі. Так прыемна! Ёсць куды схадзіць, над чым паразважаць. Адчуваеш поўнае паглыбленне ў міжнародны тэатральны кантэкст. Прычым, заўважце, у сталіцы Беларусі.**

10-ы міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар» працягнецца да 28 верасня. Падчас гэтага фэсту мы яшчэ паглядзім, а потым і вам раскажам, эстонскі спектакль «Жывеш так і не заўважаеш, як сам на тым свеце апынаешся» паводле п'есы нашага драматурга Паўла Пражко «Майткі»; літоўскі спектакль «Цырк»; грузінскі спектакль «Ана і ананас» паводле Мікалая Рудкоўскага.

Міжнародны тэатральны форум «ТэАрт» будзе ісці амаль месяц — з 28 верасня па 21 кастрычніка. І вось днямі адбылася прэс-канферэнцыя з нагоды адкрыцця, якая ператварылася ў «круглы стол» па абмеркаванні мецэнацтва ў мастацтве на прыкладзе галоўных спонсараў і партнёраў «ТэАрта» — Белгазпрамбанка і «Газпрам трансгаз Беларусь». І вось яна адбылася ў той жа дзень, калі я паглядзела «Латэнтных мужчын» Карняга. І ўсё гэта ў мяне змяшалася ў нейкі адзін набор думак пад назвай «сучасная беларуская тэатральная сітуацыя». Імі і спяшаюся з вамі падзяліцца.

# КАЛІ ЛАСКА, КАРНЯГ-ТЭАТР

**Я імкнулася патлумачыць гэта сваёй маці, але не змагла. Я падбірала словы, спрабавала проста апісаць убачанае: потныя мужчыны ў адных майках, сцэны мастурбацыі, уладныя жанчыны, чырвоная памада, чорныя сукенкі, надзіманыя шарыкі ў выглядзе сардэчак, пісуары... Не сказаць, каб надта прыемнае відовішча. Хаця напаўаголеныя беларускія акцёры і глядзяцца вельмі эфектна. Не горш, чым на пазамінулым фестывалі «Тэатральны куфар» аголеныя італьянскія.**

Але гэта ўсё не тое. Гэта не той шлях. Так мама не зразумее, што такое новая пастаноўка рэжысёра Яўгена Карняга «Латэнтныя мужчыны». Яе паказалі днямі ў Мінску на малой сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі ў рамках «Тэатральнага куфра». Сёлета гэты фэст, як і «ТэАрт», даволі грунтоўна прэзентуе сучасны беларускі тэатр: драматургію, рэжысёрскія падыходы, нашых творцаў, якія ўжо зрабіліся трэндам у Маскве, напрыклад, але ў нас, як часта бывае, іх яшчэ толькі пачынаюць адкрываць.

Пра такія спектаклі пісаць трэба шмат, трэба абмяркоўваць. Гэта важна. Мая мама не мастацтвазнавец і наогул ніяк не звязана з мастацтвам. Яна выдатны спецыяліст у сваёй галіне. Але тое, што адбываецца сёння з мастацтвам наогул, мне складана ёй патлумачыць. Мы сёння ўсе жывём у такі час, калі трэба прывыкаць, што мастацтва — гэта не атракцыён для ўзняцця настрою, а тое, што нам вяртаецца з рэчаіснасці. Лаецеся на вуліцах, забіваеце дзяцей, гвалтуеце жанчын — схадзіце ў тэатр, паглядзіце на гэта збоку, падумайце... Славутае шэкспіраўскае «Жыццё — тэатр, а людзі ў ім — акцёры» ў дачыненні да сучаснага тэатра можна справядліва перайначыць у нешта падобнае на «Тэатр — гэта жыццё, і там усё па-сапраўднаму».

Яўген Карняг разам са студэнцкай трупай свайго ж тэатра закранае агульначалавечыя матэрыі. Прычым заўжды. Прыгадайма хаця б яго спектаклі «Не танцы» ды «Спектакль № 7». Але адначасова ён працуе вельмі чуйна, далікатна, на нейкім амаль сенсорным узроўні. Сюжэт яго спектакляў цяжка пераказаць так, каб цябе не палічылі вар'ятам альбо, як мінімум, дурнем, вартым відэа на youtube. Але калі глядзіш такі тэатр, то — адчуваеш. А пачуцці бывае так цяжка выказаць словамі...

«Латэнтныя мужчыны» — гэта спектакль пра мужчын і жанчын, пра засілле жанчын з аднаго боку і пасіўнасць мужчын — з другога. Пра тое, што жанчыны мусяць станавіцца ўладнымі, моцнымі, самастойнымі і злоснымі, таму што мужчыны страчваюць сваю мускуліннасць. І наадварот. Што тут прычына, а што вынік — разабрацца складана. Гэта спектакль пра каханне таксама, пра любоў. Пра тое, што ў кожнага пра яе сваё ўяўленне. У жанчын сваё, у мужчын — сваё. Асабліва калі яны яшчэ і латэнтныя.

Але вось Карняг ператварае сваіх гераінь у нейкіх юных «эсэсавак», якія падпарадкоўваюць сабе кволых, слабых і пасіўных мужчын. Гэта як крык мужчын, маўляў, жанчыны не даюць ім праявіцца. І ў гэтым жанчыны вінаватыя самі. Альбо вінаватыя мужчыны, што з-за сваёй пасіўнасці зноў-такі ненаўмысна прымушаюць жанчын браць на сябе функцыі і мадэлі паводзін мужчын. Карацей, вось такі рэбус. Але вынік усё роўна адзін — усе не задаволены. І ўсе прагнуць любові, кахання. Гэтым спектакль і заканчваецца. Тым, што нехта ад нешчаслівага кахання памірае. Тым, што каханне таксама мае ўласцівасць заканчвацца. Тым, што якімі б мужчыны і жанчыны ні былі рознымі, яны ўсё роўна цягнуцца адно да аднаго. Потым кахаюць, пакутуюць, церпяць і зноў кахаюць...

Чамусьці спектакль Карняга «Латэнтныя мужчыны» нагадаў мне творчасць расійскага музыканта Дэльфіна. Магчыма, таму, што ў Карняга таксама шмат музыкі і сацыялкі. І пластычныя выказванні рэжысёра пад музыку і без музыкі — гэта як рэчытатыў Дэльфіна. Толькі не са слоў, а з рухаў цела. Наогул, тое, як Яўген Карняг працуе з пластычнай мовай, прадметамі, захапляе. Як ён выбудоўвае мізансцэны — таксама. Дакладна. Лаканічна. Пераканаўча.

Дарэчы, у сувязі са згаданымі пісуарамі на сцэне мне прыгадалася яшчэ і кіно. Фільм «Магнолія» рэжысёра амерыканскага незалежнага кінематографа Пола Томаса Андэрсана. Адзін з самых выдатных фільмаў, якія мне наогул калі-небудзь даводзілася глядзець. Сюжэт гэтага фільма не такі заблытаны, як сюжэты фільмаў Дэвіда Лінча, напрыклад. Але сцісла пераказаць яго таксама будзе складана. Таму згадаю толькі адзін эпізод, калі хлопчык-вундэркінд удзельнічае ў тэлегульні, дзе трэба адказваць на розныя пытанні. Накшталт «Што? Дзе? Калі?». І вось ён хоча ў прыбіральню. А яго не пускаюць. Маўляў, эфір хутка пачнецца, пацярпі, чувак. І ён церпіць. Але цярпець цяжка. І жаданне гуляць як заўсёды добра, у хлопца знікае. Ён цалкам падпарадкоўваецца прыроднаму жаданню — схадзіць у прыбіральню, і больш ні пра што думаць не можа. Чалавекам, як вядома, у самыя адказныя моманты кіруюць прыродныя інстынкты.

Гэта я да таго, што спектакль Карняга таксама пачынаецца з гэтага самага жадання. Жанчыны дражняць мужчын, не даючы ім задаволіць натуральную патрэбу. Маніпуляцыя свядомасцю. Калі мужчыну ставяць у такія ўмовы, што ён перастае паводзіць сябе не тое што як мужчына, а як чалавек. Пра гэта яшчэ экзістэнцыялісты пісалі. І гледачоў Карняг хацеў уцягнуць у гэтае «рабства» — перад праглядам прапаноўвалі ўсім наведнікам папіць соку... Адзін з тых самых прыкладаў мастацтва эпохі «смерці аўтара», калі глядач становіцца непасрэдным (ха-ха!) удзельнікам і суаўтарам твора мастацтва.

Я паспрабавала рэабілітаваць перад мамай увесь сусветны постдраматычны, дакументальны тэатр, усю «новую драму» і ўсе астатнія сучасныя тэатральныя кірункі «пост», ахарактарызаваўшы гэта абстрактным словам «эксперыментальны тэатр». Хоць мая мама жыве ў Віцебску і слаба сабе ўяўляе, што такое постдраматычны тэатр. У беларускіх рэгіёнах пра гэта наогул вельмі мала ведаюць. І гэта яшчэ адна праблема.

# ЗРАБІЎ ПРАЦУ — АКАЗАЎСЯ НЕЗАПАТРАБАВАНЫМ?..

**Праблема, уласна кажучы, у тым, што мы самі не ведаем свой тэатр. Вось прозвішчы беларускіх драматургаў і рэжысёраў — Яўген Карняг, Мікалай Рудкоўскі, Дзмітрый Багаслаўскі, — якія зрабіліся сапраўднымі трэндамі ў блізкім замежжы.**

**Людміла САЯНКОВА, загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ,** захапляецца смеласцю і эфектыўнасцю працы дырэкцыі фестывалю «ТэАрт». Яны прывозяць у Мінск самыя цікавыя спектаклі з усяго свету. І галоўная задача дзяржавы тут — хаця б не перашкаджаць. А то ў нас часта як: зрабіў працу — аказаўся незапатрабаваным ды яшчэ і вінаватым у нечым...

Але шкада аднаго: «ТэАрт» хоць і абагнаў па якасці і маштабе два іншыя буйныя тэатральныя форумы краіны — «Белую вежу» (Брэст) і «М.@рт.кантакт» (Магілёў) — але так і не стаў у Беларусі набыткам. Зрэшты, як і іншыя высокакультурныя падзеі.

— Без культуры немагчыма нічога! Але нашае грамадства не культурааryентаванае. З гэтага вынікае шмат нашых праблем... — пераканана Людміла Саянкова.

У прыватнасці, наша тэатральная сітуацыя вельмі спецыфічная. Вось **Анжаліка КРАШЭЎСКАЯ, дырэктар Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпрэйшн»**, які займаецца арганізацыяй фестываляў «ТэАрт» і «Лістапад», кажа, што наш тэатр тэхнічна адстае ад еўрапейскага гадоў на 30. І што ў нас вечная праблема з альтэрнатыўнымі пляцоўкамі.

Вось сапраўды, калі прыязджаюць да нас паказваць нейкі эксперыментальны спектакль, то, часцей за ўсё, даводзіцца ладзіць яго недзе ў клубе, у канцэртнай зале, на стадыёне. Таму што тэхнічныя патрабаванні бываюць самыя розныя, а сцэны нашых галоўных тэатраў не заўжды пад гэта прыстасаваныя. Але сцэны — гэта яшчэ паўбяды. Прывезці спектакль у Беларусь недзяржаўнай арганізацыі, якой з'яўляецца «АРТ Карпарэйшн», бывае настолькі складана, што даводзіцца пераадольваць непераадольнае. Безліч паперак, у кожнай інстанцыі ад вас патрабуюць нешта новае і заўжды непрадказальнае. А ўсё таму, што не ўрэгулявана заканадаўства ў гэтай галіне.

— Ну, пацярпіце, пацярпіце, — спрабуе супакоіць расстроеных тэатралаў **першы намеснік міністра культуры Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ.** — Неўзабаве мы дапрацуем закон аб дзяржаўных закупах, і ўсё наладзіцца.

Адчайна верым. Бо хочацца, каб дзяржаве таксама было патрэбна мастацтва. І беларускае мастацтва ў тым ліку. І каб яна прыслухоўвалася да людзей, якія сапраўды ў нечым разбіраюцца, а не да тых, хто ладзіць інтрыгі і зайздросціць.

Вось **Віктар БАБАРЫКА, старшыня праўлення Белгазпрамбанка**, — сапраўдны тэатрал. Арганізацыя, якую ён узначальвае, з'яўляецца адным з арганізатараў тэатральнага форуму «ТэАрт». Сам Віктар Дзмітрыевіч наведвае бадай кожны спектакль. Гэта сапраўды варта таго, каб браць прыклад. Таму што часам мецэнаты ў Беларусі альбо даюць грошы на культуру чыста для «галачкі», альбо, што яшчэ горш, таму, што іх прымусілі. Выпадак з «ТэАртам» — прыклад сапраўднай шчырай зацікаўленасці. Такім было мецэнацтва ў нашай краіне спрадвеку. Радзівілаў прыгадайце хаця б.

— Усё з'явілася з-за пачуцця сораму! — гаворыць Віктар Бабарыка. — Аднойчы мне стала сорамна, што ў нас няма твораў прадстаўнікоў Парыжскай школы з Беларусі. І мы вырашылі набыць іх карціны для калекцыі Белгазпрамбанка. Потым мне стала сорамна, што ў Беларусі няма вартага буйнога тэатральнага форуму. І мы вырашылі стварыць «ТэАрт». Падтрымка культуры — гэта агульначалавечая практыка. Так і павінна быць. Дзяржава ў гэтым мусіць недзяржаўным ініцыятывам толькі спрыяць. Заканадаўства павінна ў гэтым дапамагаць. Яно павінна ствараюцца для сумленных людзей, а не па прынцыпе «абы жулікі сабе якой выгады не знайшлі». Таму што фарміраванне культурнага асяродку — задача дзяржавы. І я, па шчырасці, не ведаю яе пазіцыю на гэты конт. Калі ёй гэта трэба (а дэкларуецца, што нібыта трэба), то мне тады некаторыя рэчы не зразумелыя...

А што тэатр? Тэатр — гэта мы. Пасля тэатра наступае рэальнасць. І мы здольныя на яе ўплываць.



На рэпетыцыі дакументальнага спектакля «PATRIS», якім 28 верасня распачнецца тэатральны форум «ТэАрт».

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Дзеля памяці

# ЁН УСЁ СПАЗНАЎ...

## Пакуты і надзеі Сяргея Грахоўскага

*Стаяць дубровы ў жнівеньскай красе,*
*Ляцяць у вырай жураўлі і гусі,*
*Дубовы ліст, у жылках і ў расе,*
*Мне нагадаў абрысы Беларусі.*
*Яго мая кранаецца рука,*
*А ён нібыта выкаваны з броні,*
*І жылка кожная дубовага лістка*
*Злілася з жылкамі маёй далоні.*

1962 г.

Калі чытаеш вершы гэтага паэта, то здаецца, што выжыць яму дапамагала радзіма, родныя, роднае... Двойчы асуджаны (рэпрэсаваны), ён зведаў долю выгнанніка, чалавека, якога імкнуліся прынізіць, пазбавіць таго, што ён любіць, прымусіць быць іншым, займацца не тым, чым хацелася. А ён трымаўся за сваё (хаця б ва ўспамінах), і разумеў, што яно не дасць прапасці.

100-гадоваму юбілею аднаго з найвыдатных беларускіх паэтаў складанага савецкага перыяду і часу, што прыйшоў пасля яго, мы ўжо прысвячалі адзін з матэрыялаў «Жырандолі». Але ў гэтыя дні (калі адзначаецца дзень нараджэння Сяргея Грахоўскага) хочацца даць магчымасць звярнуцца да яго слоў, напоўненых мудрасцю і жыццёвымі сіламі чалавека, які, зведаўшы цяжкія выпрабаванні, аказаўся мацнейшым за іх. Усё жыццё гэта чалавека — сведчанне таго, што на змену няпраўдзе ўсё адно прыходзіць справядлівасць, рана ці позна. І прыклад таго, што ў любых умовах трэба не здраджваць сабе і таму дару, што дадзены Богам. І нават калі цябе не чуюць сёння (слова не ідзе да людзей, не выдаюцца кнігі), то пачуюць хоць бы праз 30 гадоў. І зразумеюць: тое, што баліць і прамаўляецца шчыра, не мае тэрміну даўнасці. Грахоўскі не пераставаў пісаць, нават калі быў зняволены (ГУЛАГ не можа адабраць талент!). І пісаў тады, калі не было ўпэўненасці, што кнігі выйдуць. Аднак яны выйшлі (першая толькі ў 1958 годзе). І яны паказалі, што значыць заставацца чалавекам у любых абставінах, што значыць любіць, верыць, кахаць і спадзявацца. Ён стаў аўтарам зборнікаў вершаў, паэм («Паэмы дарог» і «Ростань на світанні»), перакладаў кнігі замежных аўтараў на беларускую мову. І ў аўтабіяграфічнай трылогіі («Такія сінія снягі», «Зона маўчання», «З воўчым білетам») распавёў пра перыяд рэпрэсій.

Да 100-годдзя Сяргея Грахоўскага была прымеркавана вечарына ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа, арганізаваная сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Успаміны пра паэта блізкіх і сяброў (не стала Сяргея Іванавіча ў 2002 годзе) папаўнялі архіўныя матэрыялы з фондаў Літаратурнага музея і сям'і Грахоўскіх, прадстаўленыя на выставе «...Ад словаў свеціцца жыццё». І цяжка з гэтым спрачацца: даказана Грахоўскім. Доказы — творы, да якіх варта звяртацца, як да выпакутаванай мудрасці.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



### АДНО ЖАДАННЕ

*Вецер вые на жалобнай ноце,*
*Дожджык то сціхае, то імжыць.*
*Зноў гадаю я на адзіноце,*
*Колькі мне пакутаваць і жыць.*

*Быццам страшны сон,*
*дзесяцігоддзі*
*Прамільгнулі, хоць яшчэ не ўсе.*
*Хто ж мне скажа:*
*«Досыць! Годзе!»*
*І спакой адвечны прынясе?*

*Што здаўна усім наканаваны,*
*І ніхто яго не абміне.*
*Можа, на змярканні або рана*
*Мне павекі з вуснамі замкне?*

*Згасне лямпа, загарыцца свечка,*
*І усё замоўкне назаўжды,*
*Скончыцца з пакутным лёсам*
*спрэчка,*
*Знікнуць непрыкметныя сляды.*

*Неўзабаве дзень надыдзе ў скрусе,*
*Змоўкну і забуду аб бядзе,*
*І хачу памерці ў Беларусі,*
*Толькі ў Беларусі. Больш — нідзе.*

2002 г

■ Прэм'ера

# МОЦАРТ ЦІ САЛЬЕРЫ?

## Творчае спаборніцтва двух вялікіх кампазітараў у Вялікім тэатры

**«Спачатку Музыка, потым слова» — опера Сальеры. «Дырэктар тэатра» — опера Моцарта. Імёны абодвух кампазітараў, як і іх творы, сышліся ў адным вечары аднаактовых опер, якія прадстаўляюцца 28 верасня ў камернай зале імя Ларысы Александроўскай тэатра оперы і балета Беларусі.**

Два лепшыя кампазітары Вены па прапанове імператара Іосіфа напісалі оперы на камічныя сюжэты, звязаныя з тэатральным жыццём. Выключна дзеля творчага спаборніцтва, выключна на радасць публіцы, якая паважала іх абодвух. Прычым у свой час Антоніа Сальеры карыстаўся ўвагай і пашанай нават большымі, чым Вольфганг Амадэй Моцарт. Аднак твор Пушкіна (які меў права на творчы вымысел) утварыў у свядомасці аматараў рускай паэзіі праблему ўспрымання імені Сальеры. Але навошта таленавітаму кампазітару, якога любяць і паважаюць, зводзіць рахункі з тым, хто не замахваецца на яго славу, але варты сваёй?

Яны абодва ўступілі ў творчае спаборніцтва — праз напісанне гэтых опер, прэм'ера якіх адбылася ў 1786 годзе ў імператарскім палацы Шэнбрун. І Сальеры тады перамог: яго выбрала публіка.

Гісторыя дае шанц нешта паўтарыць. І, можа быць, нават змяніць, няхай і ў іншай краіне, праз стагоддзі. Цяпер беларуская публіка будзе вырашаць, чый твор ёй больш падабаецца. Гэта і ёсць асноўная інтрыга гэтых прэм'ер, закладзеная дырыжорам-пастаноўшчыкам Іванам Касцяхіным і рэжысёрам Наталляй Кузьмянковай. Дык Моцарт ці Сальеры?.. На гэты раз вырашаем мы.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Сугучча сэрцаў

# БЕЛАРУСКІ МАЛДАВАНІН ЗАПРАШАЕ!..

**Трэці год запар у залатую восеньскую пару багатае на ўраджай падвор'е Васіля Семенюка ў вёсцы Баравікі Дзяржынскага раёна расквечваецца ў нацыянальныя малдаўскія і беларускія колеры, гучаць мелодыі абедзвюх краін, у святочным карагодзе людзі гасцінна вітаюць адзін аднаго і зычаць доўгага сяброўства, якое цэняць, як найлепшае багацце.**

Васіль Семянюк нарадзіўся ў Малдове. Вучыўся ў Львове — там і сустрэўся з беларускай Нінай. Тая прыехала на экскурсію, каб палюбавацца архітэктурай старажытнага горада, а ад'язджала з сэрцам, кранутым каханнем. Потым яны сустракаліся ў Брэсце, дзе Ніна загадвала сталовай. Там і прынялі рашэнне пабрацца шлюбам.



Дзмітрый ЛІКУ: «Скажыце, хіба я не ў Малдове?!»

Месцам жыхарства выбралі Малдову — «пераважылі» родныя карані Васіля. Напэўна, добра і там склаўся б іх сямейны лёс, бо працавітыя людзі паўсюль могуць прыжыцца. Яны ж для большага дастатку і гаспадарку завялі. Ды толькі дзевяць гадоў праляцела, а кватэрнае пытанне вырашыць так і не ўдалося. Дзедава хата станавілася цеснай для ўнукаў — Дзяніса, Мішы і Сашы.

Звярнулі свой позірк на Беларусь, дзе жыла сястра Ніны. Якіх клопатаў каштаваў пераезд з адной краіны ў другую, цяпер лепш не ўспамінаць. Цешыла тое, што ў калгасе «Праўда» Дзяржынскага раёна і работа знайшлася, і грошы для будаўніцтва дома ў гаспадарцы выдзелілі пад прымальныя крэдытныя ўмовы. Каб хутчэй асвоіцца на новым месцы, муж і жонка вырашылі далучыцца да мясцовай мастацкай самадзейнасці. Як жартуе пра той перыяд жыцця Васіль — «пайшлі ў новае грамадства інтэгравацца».

Па цаглінцы рос будынак. Сыны стараліся бацьку дапамагаць. Вось чаму хата цяпер такая цёплая, утульная, хоць, як кажа сам Васіль, у будаўніцтве спярша быў няўмекам. На справе ж да чаго гэты чалавек ні прыкладзе рукі — добры толк выходзіць ва ўсім. Як тэлеграфіст-прафесіянал, ён штодзень забяспечвае бесперабойную сувязь у 21 вёсцы. Па дарозе крочыць неабыякавым падарожнікам: наваколле агледзіць — верш народзіцца, пад ногі погляд кіне — яго багатая калекцыя мінералаў папоўніцца яшчэ адным каменьчыкам.

«Жыць як набяжыць нецікава!» — перакананы аптыміст Семянюк. Ён паспяхова выступае ў складзе народнага калектыву — ансамбля «Баравічанка», дзе саліруе ў нацыянальным касцюме. Піша партрэты славутых гістарычных дзеячаў Малдовы і Беларусі. Вельмі хоча парадніць беларускі райцэнтр з малдаўскім, марыць выпусціць музычны дыск-сувенір…

На сваім падворку Васіль размясціў некалькі гістарычных экспазіцый, сярод якіх вылучае экспанаты часоў Вялікай Айчыннай вайны. Штык, каска, рэшткі снарада, салдацкая фляжка былі знойдзены на полі падчас выбірання бульбы.

«Няма, напэўна, іншага кутка ў свеце, дзе б кожная пядзя зямлі захоўвала сляды вайны. Нізка схіляю галаву перад беларускім народам»,— кажа малдаванін пра краіну, якая стала яго другой радзімай. Вось чаму такая прывабная гэта сядзіба для шматлікіх гасцей Васіля Семенюка і яго сям'і. Тут ёсць усё, што дазваляе далучыцца да багатай малдаўскай культуры і народных традыцый. І ў той жа час адчуваецца вялікая павага да ўсяго беларускага. Цяжка сказаць, куды гаспадаром больш укладзена душы: у малдаўскі ці беларускі падворак.

Здзіўляешся магчымасцям усяго толькі аднаго чалавека, калі ён апантаны добрымі памкненнямі, нацэлены на ствральнасць. На новым месцы, кажа Васіль Мікалаевіч, ён не адчуў ніякіх перашкод у здзяйсненні сваіх мараў. На Беларусі і ў яго, і ў яго дзяцей ёсць магчымасць самарэалізавацца ў поўнай меры. Засмучае няўрымслівага чалавека хіба толькі тое, што часу на ўсё малавата.

Святы на сядзібе Васіля Семенюка вылучаюцца нацыянальным характарам і прысвячаюцца звычайна Дню незалежнасці Малдовы, роднай мове і нават… маладому віну — таму, што блізка сэрцу кожнага малдаваніна. Нездарма сваім удзелам іх заўсёды падтрымліваюць Пасольства Рэспублікі Малдова ў Рэспубліцы Беларусь на чале з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Георге Хіаарэ, прадстаўнікі грамадскага аб'яднання малдаван



Васіль Міхайлавіч і Ніна Сцяпанаўна СЕМЕНЮКІ: саюз малдаваніна і беларускі, які ўмацоўвае дружбу нашых народаў.

у Рэспубліцы Беларусь разам са старшынёй Антанінай Валько.

Усе яны — Дзмітрый Ліку, Пётр Капмаале, Мікалай Фёдараў, Ганна Казлоўская, Георгій Пушкаш — людзі самадастатковыя. Жыццё рознымі шляхамі прывяло іх з Малдовы ў Беларусь. І яны шмат аддалі нашай краіне. Цяпер наша рэспубліка і для іх, і для іх дзяцей — сапраўдная Радзіма, якая прыняла іх, як родных. Але любую сэрцу Малдову ім ніколі не забыць. Як кранальна гучыць гісторыя пра каханне на нацыянальным святце «Мэрцішор»! Якая смаката гэта каша — мамалыга! І якая асалода ў глытку маладога віна, дзе з'ядналіся ў букет усе сокі зямлі! Вось такія падарункі ўзбагачаюць нашу беларускую культуру, жыццё, робяць яго больш каларытным і змястоўным.

За святочным сталом чаргуюцца малдаўскія і беларускія тосты. Гучаць жарты, зразумелыя ўсім. І славутую песню «Кодры» ўсе спяваюць разам. Якія ж мы аднолькавыя ў сугуччы сваіх сэрцаў…

**Алена СТЭЛЬМАХ**




## ВОСЕНЬСКІЯ ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І БЕЛАРУСАЎ

**Па гарызанталі:** **1.** Беларускі бог восені; спрыяе росту збажыны і гародніны, ходзіць па палях і агародах, аглядаючы навокал, ці добра ўбраны ўраджай на нівах. **4.** Назва апошніх каласоў, пакінутых на полі з тым, каб быў забяспечаны ўраджай на наступны год. **9.** Невялікі грызун, якога беларусы залічвалі да міфічных гаспадароў поля і прысвячалі яму апошнія каласы. **10.** Бабіна ... кароткае (прык.). **11.** Вялікае свята ўраджаю (21 верасня), якое было для хлебароба падвядзеннем вынікаў яго працы. **12.** Слабаалкагольны напітак; у Заходняй Беларусі ўвосень, пасля збору ўраджаю, ім рабілі ахвярнае паліванне зямлі. **14.** Від расліннасці, якая звычайна характарызуецца як прыстанішча нячысцікаў. **15.** ... блізка: гніся, баба, нізка, уставай раненька, ды жні дапазненька (прык.). **16.** «Ды восенню за дбайнасць і руплівасць\\Аддзячыць шчодра хлебароба ...». («Бульба». А. Міцкевіч). **17.** Адрэзак паласы ворнай зямлі. **18.** Марское аднамачтавае судна. **20.** Старажытныя пісьмёны, якімі карысталіся пераважна скандынавы. **21.** Замкнёная выпуклая крывая лінія. **22.** Палявая птушка; лічылася, што сваім крыкам яна склікае жней. **27.** «Я тут бачу свой ..., поле, рэчку і бор,\\Сваю матку-зямлю — Беларусь». («Гэта крык, што жыве Беларусь». Я.Купала). **28.** Плады аднагадовай агароднай культуры; іх дадавалі ў густую кашу, каб густымі ўзышлі пасевы. **29.** Птушка, якая ва ўяўленнях беларусаў надзялялася дэманічнымі рысамі; яе стракатанне абяцала прыбыцце гасцей, змену надвор'я на дажджлівае і інш. **30.** Самец свойскай птушкі; беларусы лічылі яго сімвалам урадлівасці, а на Палессі, на дажынках і дасеўках, ... адсякалі галаву — як знак завяршэння працы.

**Па вертыкалі:** **2.** Націск. **3.** Расліны, якія размнажаюцца спорамі; у беларускіх паданнях узнікненне ... выводзіцца з пляўка святога Пятра. **5.** Лісцевае дрэва, агонь з дроў якога — надзейны ачышчальны сродак ад усялякай нечысці. **6.** Назва зажынкавага снапа і пячнога слупа. **7.** Расліна, са сцёблаў якой выpабляюць пяньку; у вераваннях палешукоў менавіта ў ... бусел прыносіць дзіця. **8.** Спагадлівасць. Імкненне рабіць усё добрае. **13.** Дзень памінання продкаў, асенния Дзяды; святкаваліся праз тры тыдні пасля Пакравоў. **14.** Поле, з якога сабралі лён; на ім у час жніва раілі пакідаць дзяцей, каб да іх не меў доступу ні чорт, ні чалавек з сурочнымі вачыма. **17.** Моцны алкагольны напітак; паводле падання, за выдумку чорта гнаць ... з жыта Бог у 10 разоў скараціў ураджай. **19.** ... , або Палявы. Міфічны апякун палёў і лугоў, у народным уяўленні — працаўнік-хлебароб, які клапоціцца пра ўрадлівасць палёў і ўкос на сенажаці. **23.** ... , або Асетнік; сядзібны дух, які жыве ў асеці; восенню рупіцца, каб добра сушыліся снапы і збожжа, дапамагае апрацоўваць лён. **24.** Збожжавы злак з мяцёлкавым суквеццем. **25.** Служачы казіно. **26.** Жытняя ... . Персанаж беларускай міфалогіі: фантастычная жанчына з каласамі на галаве; так называлі і апошні сноп.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Жыцень. 4. Барада. 9. Мыш. 10. Лета. 11. Прачыстая. 12. Піва. 14. Лаза. 15. Ілля. 16. Ніва. 17. Гоні. 18. Шлюп. 20. Руны. 21. Авал. 22. Перапёлка. 27. Край. 28. Боб. 29. Сарока. 30. Певень.

**Па вертыкалі:** 2. Напор. 3. Грыбы. 5. Асіна. 6. Дзед. 7. Каноплі. 8. Дабрата. 13. Асяніны. 14. Льнішча. 17. Гарэлка. 19. Палявік. 23. Ёўнік. 24. Проса. 25. Круп'е. 26. Баба.

Даты | Падзеі | Людзі

**1533** год — 480 гадоў таму нарадзіўся Стэфан Баторый, дзяржаўны дзеяч, палкаводзец, вялікі князь літоўскі, кароль польскі. У 1576 годзе абвешчаны вялікім князем літоўскім.



У 1579—1582-м узначальваў войскі Рэчы Паспалітай у Лівонскай вайне 1558—1583 гадоў. Імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады, разам з тым падтрымліваў шляхту. Прывілеем ад 1 красавіка 1579 года пераўтварыў Віленскі езуіцкі калегіум у акадэмію (пазней — Віленскі ўніверсітэт), даў дазвол на заснаванне езуіцкага калегіума ў Полацку, ініцыяваў стварэнне езуіцкага калегіума ў Гродне, дзе знаходзілася адна з каралеўскіх рэзідэнцый. Памёр у Гродне ў 1586 годзе.

**1903** год — 110 гадоў таму нарадзілася (горад Бабруйск) Вера Захараўна Харужая, дзеячка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Герой Савецкага Саюза (1960). Была адным з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1920— х удзельнічала ў барацьбе з узброенымі антысавецкімі фарміраваннямі Булак-Булаховіча, працавала ў Мазырскім і Бабруйскім павятовых камітэтах камсамола. З 1924-га была на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Праводзіла работу па згуртаванні моладзі вакол КСМЗБ, выступала ў нелегальным друку, на мітынгах, арганізоўвала падпольныя сходы і нарады моладзі, стварала падпольныя камсамольскія арганізацыі. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштоўвалася ў 1925 і ў 1927 гадах, была асуджана спачатку да 6 гадоў, а ў 1928-м — да 8 гадоў зняволення. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе — на партыйнай рабоце ў Целяханах, Пінску. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны — партызанка атрада В. З. Каржа. У 1942-м накіравана ў варожы тыл. Стварыла і ўзначаліла групу Віцебскага патрыятычнага падполля. У лістападзе таго ж года арыштавана і закатавана фашыстамі.

**1965** год — у Крамлі пачаў работу пленум ЦК КПСС, на якім было прынята рашэнне аб правядзенні маштабнай рэформы прамысловасці. Ініцыятарам перамен быў старшыня Савета Міністраў СССР Аляксей Касыгін. Ён імкнуўся пазбавіцца ад эканамічных недарэчнасцяў часоў Хрушчова: саўнаргасы былі скасаваны і аднаўлена галіновая сістэма кіравання вытворчасцю. Па ініцыятыве Касыгіна ўпершыню ў гісторыі савецкай эканомікі ў аснову рэформы былі пакладзены метады эканамічнага стымулявання. Рэфарматары былі перакананы ў тым, што савецкая эканоміка можа і павінна быць эфектыўнай. Аднак тэарэтычныя выкладкі не ўлічвалі супраціўлення партыйнай і гаспадарчай бюракратыі, якая ў выпадку ўдалага правядзення пераўтварэнняў станавілася, па сутнасці, непатрэбнай. Ідэолагі на чале з Міхаілам Суславым пачалі нашэптваць Брэжневу, што ўвядзенне гасразліку і таму падобных навацый разбурыць стабільнасць грамадства. У выніку касыгінская рэформа не змагла разгарнуцца як след: ужо ў пачатку 1970-х эканамічная палітыка Крамля вярнулася на рэйкі, пракладзеныя яшчэ Сталіным: прыярытэтнае развіццё ВПК і цяжкай індустрыі. Касыгін заставаўся прэм'ерам яшчэ 15 гадоў, аж да восені 1980-га, але ў 70-я гады ён ужо не выстаўляў ніякіх рэфарматарскіх праектаў.

**Было сказана**

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, публіцыст:**

*«Жыццё — даброта. Найвялікшая даброта, якая дадзена кожнаму, нягледзячы на ўвесь боль».*

■ Святлафор

# «Засвяціся ў цемры!»

**Пад такой назвай сёння па ўсёй краіне будзе праходзіць Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху, заклікaны прыцягнуць увагу да праблемы гібелі пешаходаў і веласіпедыстаў у цёмны час сутак і прысвечаны прапагандзе выкарыстання ўдзельнікамі дарожнага руху святлоадбівальных элементаў.**

Ва УДАІ МУС нагадалі, што патрабаванні Правілаў дарожнага руху аб абавязковым выкарыстанні пешаходамі святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак пры руху па краі праезнай часткі дарогі ўступілі ў сілу ў 2006 годзе. Актыўная растлумачальная работа ДАІ прывяла да значнага зніжэння смяротнасці пешаходаў: калі ў вышэйназваным годзе на дарогах краіны загінуў 601 чалавек, дык у 2007-м — ужо 486, а ў 2012-м — 314 пешаходаў.

Пасля заходу сонца кіроўцы бачаць пешахода, які мае святлоадбівальныя элементы, са значна большай адлегласці ў параўнанні з пешаходамі без фліккераў. Калі машына рухаецца з блізкім святлом фар, адлегласць павялічваецца з 25-40 метраў да 130-140 метраў, а калі з далёкім, — да 400 метраў. Іншымі словамі, адлегласць, з якой «абазначаны» пешаход становіцца больш бачным для кіроўцы аўтамабіля, павялічваецца ў 1,5-3 разы. Гэта дае апошняму дадатковы час для прыняцця найбольш правільнага рашэння, каб пазбегнуць магчымага наезду на пешахода.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Здарэнні

## УСЕ ПАРУШЭННІ АДРАЗУ

**У Лельчыцкім раёне, ля вёскі Іванава Слабада, супрацоўнікі ДАІ затрымалі мясцовага жыхара, які асядлаў матацыкл у п'яным выглядзе. Кіроўца, да таго ж, рухаўся без моташлема.**

Калі ў яго папрасілі дакументы для праверкі, высветлілася, што іх няма і быць не можа. Два гады таму грамадзянін быў пазбаўлены пасведчання за кіраванне ў нецвярозым стане. Да таго ж на заднім сядзенні матацыкла інспектары выявілі скрутак. Калі яго разгарнулі, убачылі стрэльбу ў разабраным выглядзе, на якую ў 49-гадовага мужчыны адсутнічае адпаведны дазвол. Складзены адміністрацыйны пратакол па артыкуле аб незаконных дзеяннях з паляўнічай зброяй, за што прадугледжаны штраф у памеры ад 10 да 30 базавых велічынь. За кіраванне без дакументаў у нецвярозым стане таксама прадугледжаны немалы штраф, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ДАІ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НЕ СПАЦЬ ЗА РУЛЁМ

**24 верасня каля 7 гадзін раніцы ў Магілёўскім раёне, на аўтатрасе ў раёне аграгарадка Масток, сутыкнуліся два аўтамабілі, якія рухаліся ў адным напрамку.**

Калі ў Магілёўскім ДАІ высветлілі абставіны здарэння, то аказалася, што 33-гадовы вадзіцель з Гомеля, які кіраваў мікрааўтобусам «Фольксваген Каравэла», заснуў за рулём. У выніку мікрааўтобус ударыўся ў «Жыгулі», якія мірна рухаліся па дарозе ў тым жа напрамку.

— Сур'ёзна пацярпеў вадзіцель «Жыгулёў», другі вадзіцель абышоўся перапудам. Абодва аўтамабілі атрымалі механічныя пашкоджанні, — пракаментавала вынікі здарэння **інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Таццяна СТАРАСОТНІКАВА.** — Часам вадзіцелям даводзіцца доўгі час быць за рулём без сну і адпачынку. Аднак стан санлівасці і стомленасці вельмі небяспечны, як для саміх вадзіцеляў і іх пасажыраў, так і для іншых удзельнікаў руху, якія апынуліся на іх шляху. Не варта выпрабоўваць лёс, а трэба спыніцца і адпачыць, так будзе больш бяспечна.

**Ілона ІВАНОВА**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.04 | 18.56 | 11.52 |
| Віцебск | — 6.54 | 18.45 | 11.51 |
| Магілёў | — 6.54 | 18.46 | 11.52 |
| Гомель | — 6.50 | 18.43 | 11.53 |
| Гродна | — 7.19 | 19.11 | 11.52 |
| Брэст | — 7.20 | 19.12 | 11.52 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 6.56. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

*Пр. УЗВІЖЭННЕ (Узвышенне Крыжа Гасподняга), Івана.*
*К. Мірабэлы, Вінцэнта, Дамяна, Космы.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Парада хатнім гаспадыням. У вас з'явілася жаданне абнавіць свой гардэроб, але абсалютна адсутнічае такая магчымасць?

Памыйце каляровае з белым!

**— А ў вас ёсць што-небудзь вегетарыянскае?**

**— А як жа! Гарэлка з адборных гатункаў пшаніцы, піва з ячменю, віно і каньяк з вінаграду!**

Мяркуючы па паводзінах многіх кіроўцаў, калі яны трапляюць у заторы, у іх пачынаюць нараджаць жонкі.

**У гасцях:**
**— Боршч будзеш?**
**— Не адмоўлюся.**
**— Табе колькі лыжачак?**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвонка» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.898. Індэкс 63850. Зак. № 4146.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2013 года.